БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА. ЗАСНАВАНАЯ Ў 1906 Г. У ВІЛЬНІ. АДНОЎЛЕНАЯ ТАМСАМА Ў 1991 Г. З 1 САКАВІКА 1996 Г. ВЫХОДЗІЦЬ У МЕНСКУ. ВЫДАВЕЦ РЭДАКЦЫЯ ГАЗЭТЫ «НАША НІВА»

СЛАВАМІР АДАМОВІЧ

БУДЗЕМ...

Мудрымі будзем, як зьмеі,
хітрымі, нібы лісы,
чыстымі, як лілеі,
і першымі ў чорных сьпісах.

Будзем, як травы ў росах,
як белыя гіяцынты,
як чэрвеньскія пакосы,
як залежы антрацыту.

Добрымі будзем, як маткі,
як сьветлыя сны і мроі,
жанчыны — нібы аплаткі,
мужчыны — як сталь для зброі.

Ціхімі будзем, як гольлі
дрэваў хвойнай пароды,
як павуцінка са столі,
як першыя лёгкія роды.

Цёплымі будзем, як дрэва,
і шчодрымі, як на Каляды,
будзем ня справа, ня зьлева,
а там, дзе нам будуць рады.

Будзем, браты і сёстры,
супольна крочыць у наступ,
будзем, як меч гостры,
як цяжкі рабочы заступ...

12 сьнежня 1997 году



НАША НІВА

№ 36 (97) 29 сьнежня 1997 г.

БЕЛАЯ РАЗЬВЕДКА

Апошні нумар «НН» у 1997-м годзе па ліку 97-мы. Першы ў 1998-м будзе 98-мы. Натуральна, гэта яшчэ ні пра што ня сьведчыць, але адчуваньне зьліцьця з часам ёсьць.

Мінулы год пасьля крывавага 96-га выглядаў на шпіталь у прыфрантавой паласе, дзе мы залечвалі свае раны і ня больш. Мы яшчэ ня марылі пра тое, што будзем рабіць ПАСЬЛЯ ВАЙНЫ. Мы толькі ўнурліва прыводзілі ў парадак сябе. Мы толькі ўслухоўваліся ў блізкія выбухі. Нас не пакідала татальнае гіпнатычнае прадчуваньне канца. Але вось праграма году вычарпаная. Мы зрабілі ўсе заплянаваныя нумары газэты, мы выдалі некалькі кніг, правялі некалькі культурных акцыяў, больш-менш выбраліся з даўгавое ямы і досыць прагматычна ставімся да начнога стуку ў дзьверы і да роскатаў недалёкае кананады.

На наступны год рэжым абяцае нам усё, што ён можа абяцаць — рэпрэсіі, шмат рэпрэсіяў. Супраць незалежнасьці нашага прадпрыемства, супраць адноўленага намі несавецкага правапісу, супраць нашых дарагіх чытачоў. Але мы ўжо, на жаль, да гэтага ўсяго прызвычаіліся і пачуваемся абстралянымі ваякамі. А папраўленае за мінулы год здароўе схіляе да мараў пра будучыню. Альбо, больш дакладна, — пра інакшаўшчыну. Пра тое, што мы можам зрабіць па-за нашай, занятай імі, краінай і па-за створаным імі цэнзурным карцэрам — у вольнай інфармацыйнай прасторы.

У 1997 годзе Славамір Адамовіч ВЫЙШАЎ З ТУРМЫ. «Наша Ніва» пачала рэгулярна і даступна зьяўляцца ў Інтэрнэце. Нашыя кантакты і магчымасьці ўжо дазваляюць нам існаваць незалежна ад Лукашэнкі. Шкада толькі часу і сілаў, патрачаных на стварэньне гэтае інакшаўшчыны. Замест сапраўднае культурнае індустрыі, пра якую мы марылі, мы ствараем штосьці накшталт агентурнае сеткі. Але гэта БЕЛАЯ РАЗЬВЕДКА. І нашае галоўнае адрозьненьне ад улады ў тым, што ў нас ніколі і ні ад каго не было й няма сакрэтаў. Калі ўлады ўжываюць рэпрэсіі да такіх, гэта значыць, што ў краіне пануюць вычварныя законы. Але няхай гэта будзе іхная праблема — як даць сабе рады. Мы ж множым пляны і адкрытыя да кантакту з нашымі чытачамі.

Мы гатовыя да салідарнасьці і любых прапановаў, якія спрыяюць пашырэньню і прафэсіяналізацыі беларушчыны. Апошняя задача чырвонай ніткаю праходзіць праз усе 97 нумароў «НН» і будзе для нас найпершаю задачай заўсёды. Зашмат мы спазналі халтуры, усялякага псэўдаінтэлектуалізму і дэструктыўшчыны, каб спакушацца гэтым надалей.

Думаецца, што менавіта 1998 год стане ці пачне ставаць для Беларусі годам непазьбежнага грамадзкага падзелу на тых, хто за Беларусь і тых, для каго ёсьць больш важныя арыенціры. Мы ня будзем спрыяць гэтаму падзелу, але будзем сачыць за ім. Гісторыя суседніх з намі краінаў паказвае, што, не перайшоўшы гэты Рубікон, які падзяляе дабро і зло, нацыя ня можа вырвацца зь ліпучых абдымкаў саўдэпаўскае мінуўшчыны. Так было ў Балтыі, так было ў Польшчы і нават у Расеі. Не абміне гэтая чара і нашую старану. У такія часы нам усім трэба шчыльней быць разам.

Заставайцеся з намі, тады «НН», незалежна ні ад чаго, будзе прыходзіць у Ваш дом.

З пашанай,
Рэдактар

Патрэбнае адзінства

Я заўсёды быў за стварэньне, будаўніцтва і г.д. Разбурэньне мне ніколі не падабалася. Як і размежаваньне. Таму шчыры дзякуй Вам за артыкул пра Скарынавыя кнігі і Інтэрнэт (а таксама й за іншыя артыкулы, эсэ, думкі зь якіх мне прыдзецца ўжываць у гэтым лісьце. Такая ж падзяка сп. А.Дашкевічу). Але ж... Другі нумар «НН» запар сп. З.Бартосік прапануе ўзводзіць барыкады: «Толькі для БЕЛ»... Тут ужо я супраць, ня гледзячы на тое, што я падзяляю пачуцьцё крыўды за зьдзекваньне над мовамі.

І ня толькі таму, што жыхары Беларусі (у тым ліку і рускія па нацыянальнасьці) ніякага дачыненьня ні да расейскага, ні да беларускага ўраду (тэрміны выключна геаграфічныя) ня маюць. І ня толькі таму, што жывуць тут яшчэ татары, габраі, літоўцы, палякі, украінцы і г.д. (іх усіх — за што?..) І ня толькі таму, што калі Беларусь — былая калёнія Расеі (і СССР), то, як амаль ва ўсіх іншых былых калёніях, тут не абысьціся без афіцыйнага дзьвюхмоўя (у некаторых з гэтых краінаў дзьвюхмоўе — «часовае»). І нават ня толькі таму, што калісьці існаваў Кафка: праскі габрай, які пісаў на нямецкай мове — выдатны прыклад таго, што мова, краіна і нацыянальнасьць неабавязкова павінны супадаць.

А ў першую чаргу таму, што адзінае, што можа зрабіць адроджаная нацыянальная беларуская эліта — гэта «займацца справамі Таварыства Беларускай Мовы» (гэта ў дачыненьні да моўнага пытаньня). Толькі стварэньне Дабра — Дабра, маючага такі станоўчы (дадатны) зарад, што перад ім адступяць і рассыпяцца ў пыл незьлічоныя праявы зла, можа аб'яднаць ня толькі «вострабрамшчыкаў» і «курганаслаўшчыкаў», але і ўсіх жыхароў нашай шматпакутнай Краіны. Таму што дабрабыт усяго чалавецтва (у тым ліку і Беларусі), мір і бясьпека дасяжныя толькі тады, калі трывала ўсталюецца адзінства.

Заўважце: у прыватных абвестках — словы Ул.Караткевіча (даслаў іх, на жаль, ня я): «Але злосьць — кепскі дарадчык. Часам яна можа штурхнуць высакароднага ў такое балота, у якім сядзіць яго подлы вораг». Усё, што «толькі для БЕЛ» — гэта помста. Пры помсьце ж — абодва бакі «ў балоце», розьніца толькі ў тым, хто пачаў першы...

Напрыканцы ліста — падзяка за Каляды (і навагодні падарунак): «Жоўты пясочак» В.Быкава.

Рэзванаў Пётар, Менск

Як аб'яднаць Мітрапалітаў?

Мне вельмі прыемна, што ёсьць у нас шчырыя Беларусы, якім не абыякавы лёс нашай Бацькаўшчыны. Што ў нас ёсьць нашае беларускае радыё «Свабода», што ў нас ёсьць газэта «Наша Ніва», якая хоча вярнуць нашую сапраўдную мову. Мне было вельмі прыемна прачытаць у «НН» размову з айцом Пятром Гушчам, адным зь першых арганізатараў Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы ў Беларусі. Але ж аказваецца, што я моцна памыляюся, і, на жаль, гэтыя шчырыя беларусы купляюцца і прадаюцца. Расчараваньне прыйшло пасьля таго ліста, які надрукавала вашая газэта супраць Б.А.П.Ц.

Я вельмі добра ведаю айца Пятра, гэта шчыры Беларус, які хоча бачыць вольную і незалежную Бацькаўшчыну.

Айцец Пётар неаднаразова зьвяртаўся да нашых мітрапалітаў за мяжой — Ізяслава і Мікалая, каб яны аб'ядналіся ў адзін Экзархат і пачалі будаваць царкву ў Беларусі. Вы ж павінны ведаць, што ў Амэрыцы ёсьць тры першагархі і два мітрапаліты, якія ня могуць знайсьці паразуменьне між сабою.

Можна пісаць многа пра цяжкасьці нашае незалежнае царквы. Але ж Вам было б карысна гэта пачуць зь першых вуснаў айца Пятра, ён Вам многае можа расказаць пра неабходнасьць Беларускае царквы.

Мне было б прыемна, калі б Вы праз свой аўтарытэт заняліся аб'яднаньнем гэтых Мітрапалітаў, яны ж ужо ў гадах старых.

З павагай
сям'я Жукоўскіх, Слонім

Хартыя-97

Вельмі добра, што зьявіўся такі дакумэнт, як «Хартыя-97». Стаўлю і свой подпіс пад ім. Пэўна, сёньняшняя ўлада не чакала на фоне ўжо звыклых мітынгаў і пікетаў такога разумнага кроку. Думаю, гэты дакумэнт зьвяжацца сумленьнем беларуса, не паставіць подпіс пад ім — гэта здрадзіць сваёй Радзіме.

Уладзімер Жаўняк, Мар'іна Горка

Беларуская літаратура і замежжа

Беларуская літаратура і замежжа
Што ведаюць пра Беларусь эўрапейцы?

Я маю адну знаёмую за мяжою. Яна — бэльгійка, грамадзянка невялікай краіны, спакойнае насельніцтва якой падзяляецца на фляманцаў і валонцаў. Гэта край, што доўга быў у палоне суседніх дзяржаваў і толькі нядаўна здабыў незалежнасьць. Мая знаёмая — чалавек, у жыцьці якога літаратура, тэатар, мастацтва займаюць не апошняе месца. Пачуўшы ад мяне імёны трох клясыкаў: Якуба Коласа, Янкі Купалы і Максіма Багдановіча, яна з імпэтам пачала пошукі. Спачатку зазірнула ў звычайную кнігарню, дзе, як і разьлічвала, кніг беларускіх аўтараў у продажы не аказалася. Затым яна ўспомніла пра існаваньне беларускага пасольства і вырашыла атрымаць там падрабязную інфармацыю. Зьвязалася з прадстаўнікамі беларускай нацыі, аднак, жывучы ў Брусэлі, яны размаўляюць выключна па-ангельску, нават аташэ па культуры. Упартая бэльгійка паразмаўляла з галоўным (консулам). Ён валодаў францускай мовай і быў вельмі ветлівым, аднак ніякіх канкрэтных зьвестак ёй даць ня змог. Консул запэўніў, што гэта, несумненна, выбітныя пісьменьнікі, але ён засумняваўся ў наяўнасьці перакладаў іх цудоўных твораў на мэлядычную мову французаў. Зь ягонае парады яна зьвярнулася ў бібліятэку, але беспасьпяхова, потым — у «Сусьветную бібліятэку», якая мае спэцыялізаваны аддзел славянскіх аўтараў, але й гэта не прынесла ніякага плёну. Застаецца толькі адно месца, куды бэльгійка не зьвярталася — Каралеўская бібліятэка. Аднак часы яе працы сёлета ўжо недасягальныя. А ці застанецца ахвота?!

Вольга Колас, Менск

Вырачэньне чужога імя

Апошнім часам слова «адраджэньне» амаль перастала зьяўляцца на старонках друку, нават і незалежнага. У асяродку сьвядомых яно гэтаксама ўжо не прамаўляецца, а калі й гучыць, дык зь яскравым адценьнем чорнага гумару ды іроніі. «Адраджэнцы» стаміліся ад уласнае патэтыкі, і цяпер, моўчкі згуртаваўшыся над мёртвым счарнелым целам, яны яшчэ ня могуць наважыцца на канстатаваньня сьмерці і сваёй рэаніматарскай прафнепрыдатнасьці.

Наўрад ці нехта будзе аспрэчваць, што кожны этнас (народ) перадусім зьяўляецца арганізмам, г. зн. жывой істотай са сваім непаўторным абліччам (культурным, палітычным, эканамічным і г.д.). Істота гэтая валодае адмысловай сьвядомасьцю, якая пэўным чынам агучваецца (мова), і займае нейкі кавалак зямлі на сусьветных абшарах. Але бадай сымбалічнай праявай адметнасьці, своеасаблівым маркерам для ўсіх чужынцаў выступае асабовае імя. Больш за тое, у выпадку, калі мова супадае (напрыклад, ангельцы і амэрыканцы), менавіта этнонім акумулюе ў сабе сутнасьць: зьяўляецца кодам культурнае спэцыфікі таго ці іншага народа.

Імя — прыкмета Культуры. Безыменнасьць — праява прыроды. Імя — знак, бо нешта азначае, а гэта значыць, парадкуе хаос безыменнасьці. Чалавек, які прыходзіць у сьвет, быў «чужынцам, чужынчыкам» да тае пары, пакуль не зьдзейсьняўся абрад наданьня імя, абрад далучэньня да навечай супольнасьці, культуры. Бязглуздасьць і сваволя сучасных бацькоў, зь якой яны даюць імёны («бо прыгожае») сваім дзеткам, ня мае нічога агульнага з гэтым абрадам, бо імя праграмуе жыцьцё, бо слова мае рэальную сілу. Гляньце ў люстра і назавіце сябе іншым імем — вам зробіцца непамысна. Вашае імя ўжо даўна жыве ў крыві, яно — вашая неад'емная частка. І тыя, хто мяняў свае імёны на чужыя, рана ці позна ўсё адно рабіліся Абрамамі ці Ізямі, калі ж не, дык усё жыцьцё не маглі пазбавіцца ўнутраных разьдзёраў.

Абрад наданьня імя парадаксальны тым, што рэцыпіент (той, каму яно надаецца) не прымае ў гэтым ніякага ўдзелу. У чалавечым выпадку гэта робяць бацькі (раючыся з зоркамі, небам, Багамі), у выпадку з народамі — таксама, але імёны гэтых бацькоў, як правіла, губляюцца ў бездані мітаў.

Большасьць імёнаў сучасных эўрапейскіх народаў была агучаная ўжо ў часы позьняе Антычнасьці ці ранняга Сярэднявечча. Узрост народа, як найменей, супадае з узростам імя, і таму ўсе эўрапейскія народы, апроч беларусаў, маюць уласную Гісторыю, а ня вартыя жалю вышэмкі зь яе.

Нейкая драбяза са зьняважлівым суфіксам — «беларусцы» — зьявілася толькі ў XVII ст. А раней? Што было раней, калі ўжо стагодзьдзямі існавалі летувісы і палякі, французы ды ангельцы? Вяяры Канстанціна Астроскага ці Вітаўта, прынамсі, натаўклі б вам у бакі за бязглузьдзіцу кшталту «ВКЛ — беларуска-літоўская дзяржава», палічыўшы яе за абразу іхнае айчыны. Я ўжо не кажу пра «Полацкае княства як першую беларускую дзяржаву». За такія зьдзекі крывіцкія жрацы папросту прынесьлі б вас у ахвяру.

Але акрамя ўзросту, кожнае імя нясе ў сабе пэўны сэнс. Далёка ня ўсім народам пашчасьціла разгадаць яго. Ды так ці інакш сіла, закладзеная ў ім, спрацоўвае. Як не зайздросьціць французам, якія ўжо па свайму імю — «вольныя», ці германцы, якіх вядзе праз стагодзьдзі магутны бок вайны Ermin, ці сьвеям, што папросту «сваякі, свой народ». Мы ж — «Белыя Русы». І можна вылузвацца да бясконцасьці ў тлумачэньні колеру («вольныя», «ахрышчаны» ці які іншы), але «Русы» не пераменіцца на «прусы» ці «кельты». Гэта называецца — «патрапілі». Маларосы своечасова зразумелі небясьпеку падобнага кораня і прыклалі ўсе намаганьні, каб стацца папросту «украінцамі». Цяпер яны цалкам задаволеныя. Ну і што з таго, што жывуць на «Ўскраіне», калі гэта ўскраіна Эўропы?

Цікава і тое, што найменьне Белая Русь доўгі час мусолілася на абшарах недзе Паўночна-Усходняй Расеі, а потым пакрыху пачало насоўвацца на Падзьвіньне ды Падняпроўе. Знамянальна таксама, што з моманту, калі на нашай зямлі зьявіліся «беларусы», пачалася эпоха Маскоўскае беспакаранасьці на гэтых абшарах, якая ня скончылася і цяпер.

Імя — гэта характар, гэта адметнасьць і стыль. Пагледзіце навокал. Адзіная адметнасьць на сёньня — унікальны, нават па сусьветных памерах, фальклёр, што застаўся нам у спадчыну з Крывіцкае эпохі. Эпохі мужнасьці і сапраўднае незалежнасьці. Імя, падоранае вярхоўным жрацом Крыва-Крывайцісам, лучыла нашых продкаў зь небам, давала ім сілу (а не «талерантнасьць») ня здраджваць самім сабе, бараніць Радзіму. І Ўсяслаў Чарадзей ня мог быць «беларусцам», бо быў героем. Вацлаў Ластоўскі ня быў рамантыкам і летуценьнікам, калі ўсьвядоміў сябе крывічом. Зьвяньне праўдзівай сілы прыцягвае моцных, прыемкі немачы — слабых. І было б цікава паглядзець, як прагнуў бы «інтэграцыі» з рускім народам народ не бела-рускі, а крывіцкі. Нашыя адвечныя суседзі летувісы й латышы яшчэ ня кінулі сваёй надзеі ўбачыць ТОЙ народ, упарта называючы нас сёньняшніх ці to krievai, ці to krive, але «беларусам», «бульбашам», «бульбонам» гэтага ўжо, напэўна, ня трэба. Патрэбна мне. Я ня прагну новага імя, хачу вярнуць адвечнае і быць вартым яго. КРЫВІЧ.

Стоячы за сьпінамі нягеглых рэаніматараў, я праглядаю іхную прэсу. На апошняй старонцы маленькія палахлівыя зацемкі пра неверагодную кольказць ваўкоў на Бела-рускіх абшарах. Я ўсьміхаюся сам сабе. Гэта цень Усяслава. Мне ня шкода свойскага быдла — ваўчынымі ікламі паўстане КРЫЎЯ.

Уладзімер Лобач

Беларускі нацыянальны прадукт

Ня ведаю, як хто, але я ў гэтым годзе зразумеў, што ўсё нармальна. Усё ідзе так, як трэба і ад гэтага ўсьведамленьня стала значна больш утульна і спакойна. Гэты год стаў годам усталяваньня беларускага нацыянальнага прадукту. Падкрэсьліваю, не савецкага беларускага, а менавіта нацыянальнага. Пры сустрэчы зь якім савецкі не вытрымлівае канкурэнцыі і саступае месца. Пакуль, вядома, гэта не татальны наступ, але тэндэнцыя красамоўная, якая больш тычыцца культуры і эканомікі. Рызыкну дапусьціць, што гэтая тэндэнцыя будзе нарастаць і ў недалёкім часе сягне сфэры палітыкі. Але ўсяму свой час.

Напэўна, яшчэ не забыліся, як скончаўся год мінулы, і які настрой тады панаваў. Здавалася, што разам з разгонам парлямэнта сканчаецца Беларусь. Насамрэч усё адбылося аб'ектыўна, паводле законаў рынку. Вярхоўны Савет апынуўся менш канкурэнтаздольным, а значыць больш савецкім і менш нацыянальным, чым сёньняшні рэжым з усёй ягонай адыёзнасьцю да нацыянальнага. Таму і пацярпеў паразу. Такі вось парадокс. Хоць парадокс толькі на першы погляд.

Сёньняшні рэжым аказаўся, нягледзячы на ўсе спробы розных аб'яднаньняў, больш карысным для ўсьведамленьня Эўропай Беларусі як сваёй неад'емнай часткі, чым кволы Вярхоўны Савет. Зрэшты, наступныя падзеі гэта падкрэсьлілі. Прымацаваны да эўрапейскіх структураў, як да кісларoднай падушкі, парлямэнт, ня ў стане нічога зрабіць. Пакуль, відаць, не ягоны час, але тое, што некалі, пазбавіўшыся ўсяго недасканалага, зь яго вылупіцца нешта вартае, безумоўна. Тут, як кажуць, магчымыя варыянты. Магчыма, гэта справа наступнага году. Зьменам палітычным заўжды папярэднічаюць зьмены культурныя, а культурны канкурэнтаздольны прадукт мы маем ужо сёньня. Прычым народжаны ў самых неспрыяльных умовах і ад таго яшчэ больш каштоўны і моцны.

Неяк год таму давялося сустрэцца ў Варшаве з кіраўніком гурта «Палац» Юрам Выдронкам. На той час становішча каманды было ахавае. Калектыў так і недачакаўся абяцанай дзяржаўнай падтрымкі і апынуўся ў вельмі цяжкім стане. Як заўжды, паўстала спакуса..., але была абыдзеная. Сёньня, праз год «Палац» мае класны новы альбом, новы праект — «Крыві», незалежнае існаваньне, якое дазваляе выступаць, дзе пажадаеш і за грошы, а не па сьвістку, і самае галоўнае — канкурэнтаздольны беларускамоўны прадукт, пазбаўлены комплексаў саўковай правінцыйнасьці, які прымушае натоўпы фанаў бегчы за аўтобусам з музыкамі ня толькі ў Расеі і Казахстане, але і ў Эўропе. Гэта тое, што недаступна не пазбаўленым таленту нашым землякам, якія выбралі Маскву і далей Садовага кальца не прасунуліся, няхай выступаючы ва Ўладзівастоку, не гаворачы пра айчынных аматараў савецкага ці расейскага ўзораў.

Кніга Васіля Быкава «Сьцяна», рассыпаная ў дзяржаўным выдавецтве з-за адсутнасьці савецкасьці, выйдзе ў выдавецтве «Наша Ніва» і, відаць, яшчэ шмат дзе, таму што гэта нацыянальны прадукт найвышэйшае пробы. Тым творцам, што ня здольныя перакрочыць савецкую мяжу ўнутры краіны і стварыць прадукт, застаецца аб гэтым толькі марыць.

Тое ж з газэтай «Свабода», якая мае вядучае месца на рынку незалежнай прэсы нашай краіны. Зь вядомай пэрспэктывай.

Тое ж са спажывецкімі таварамі. Спытайце ў прадаўцоў у беларускіх крамах ці ў мужыкоў з Трактарнага альбо Серабранкі, якое піва ці гарэлку яны купляюць? Упэўнены, што навязлівыя «Жигулевское» і «Русская» бяруцца тады, калі няма «Буслоў», «Крышталя», «Траецкага», «Старажытнага», «Льва» і гэтак далей, калі няма нашага, а значыць, больш якаснага.

Паводле тых жа законаў разьвіваюцца і грамадзкія арганізацыі. Здаецца, першымі гэта зразумелі журналісты. Беларуская Асацыяцыя Журналістаў — структура, якая засьведчыла сваю прафэсійнасьць і арыентаванасьць на нацыянальнае, таму, у адрозьненьне, напрыклад, ад палітычных партыяў, якія, здаецца, пакуль ня вызначылі свае мэты і якім бракуе прафэсіяналаў, набрала вагу досыць хутка. Яе ведаюць і зь ёю мусяць лічыцца. Прынамсі, што такое прафэсійная салідарнасьць — БАЖ усьвядоміла.

У нас, як у лесе — выжывае больш здольны, больш разумны, больш дасьведчаны, зь цьвёрдай глебай пад нагамі. Глеба — гэта нацыянальнае. Няхай савецкае, але нацыянальнае. Толькі з кожным днём савецкага беларускага становіцца ўсё меней, а нацыянальнага беларускага ўсё болей, таму савецкі беларускі прадукт не вытрымлівае канкурэнцыі з нацыянальным беларускім прадуктам, і саступае. Пакуль у сфэры культуры і эканомікі. Канкурэнтаздольны нацыянальны прадукт пaступова ўплывае і на адчуваньне ўласнай годнасьці, а незакамплексаванае пачуцьцё ўласнай годнасьці вядзе да зьменаў у дачыненьнях паміж суб'ектамі грамадзтва. Інакш кажучы, таму, каму ня сорамна за свой прадукт значна цяжэй наступіць на хвост, хто б таго не захацеў.

Калі вы сьмелы, моцны, здольны — стварайце прадукт, канкурэнтаздольным яго «дапаможа» зрабіць рэжым, а што яшчэ трэба чалавеку, каб адчуць пачуцьцё ўласнай годнасьці і задавальненьня, бо гэта будзе наш прадукт.

З Новым Годам!

Алег Дашкевіч

Будзьма разам!

У 1995 годзе колам людзей, што працавалі ў газэце «Наша Ніва» й гуртаваліся вакол яе, была сфармуляваная ідэя новай незалежнай структуры, мэта якой — падтрымка газэтнага і пазагазэтных праектаў «Нашай Нівы». Ідэя актыўнасьці зрэалізавалася ў Беларускі Гумантарным Фондзе «Наша Ніва». Заснавальнікі ўкладаюць канкрэтны сэнс у кожнае слова назвы сваёй інстытуцыі:

— Беларускі разумеецца як прыхільнасьць традыцыяналізму й адначасова мадэрнасьці, новачаснасьці, адкрытасьці, бо беларуская традыцыя — старажытная й адначасова — новая.

— Гуманітарны — як усьведамленьне вартасьці творчай актыўнасьці чалавека.

— Фонд — генэраваньне й рэалізацыя розных праектаў, іх узаемасувязь; аб'яднаньне сваіх інтэлектуальных і матэрыяльных рэсурсаў дзеля рэалізацыі ўласных праектаў.

— «Наша Ніва» — як апэляцыя да несавецкай беларускай культурнай, інтэлектуальнай і палітычнай традыцыі; усьведамленьне ўласнае спадкаемнасьці гэтай традыцыі.

Дзеля рэалізацыі сваіх мэтаў Беларускі Гуманітарны Фонд «Наша Ніва» ажыцьцяўляе выдавецкія, навукова-дасьледчыя, літаратурныя, мастацкія праекты, а таксама стала займаецца стварэньнем інфраструктуры культурнай дзейнасьці. Нягледзячы на ня самыя спрыяльныя палітычныя ўмовы ў 1996-1997 гадах, наш Фонд разьвіваўся досыць дынамічна, генэруючы новыя праграмы й шукаючы магчымасьцяў іх рэалізацыі. Цяпер варта распавесьці зацікаўленым чытачам пра пляны Фонду на 1998 год. Падставы для такога маналёгу дзьве, і яны досыць сур'ёзныя:

— па-першае, мы сьвяткуем Каляды, і варта крыху адысьці ад штодзённых клопатаў і сапраўды падумаць пра пэрспэктывы;

— па-другое, прыходзіцца чакаць пэўных ускладненьняў нашай працы і, адпаведна, зьмяншэньня магчымасьцяў інфармаваньня пра нашую дзейнасьць. Таму сьпяшаемся падзяліцца інфармацыяй.

Тут мы спынімся на пазагазэтных праектах «Нашай Нівы».

АРХІЎ НАЙНОЎШАЕ ГІСТОРЫІ

Архіў Найноўшае Гісторыі створаны ў 1996 годзе. Нібы сама гарачая тэмпэратура сучаснай беларускай гісторыі падштурхнула нас тады да ўтварэньня гэтага праекту, які ставіць за мэту асэнсаваньне гісторыі Беларусі XX ст., пошук дэмакратычных каранёў незалежнага беларускага грамадзтва, актуалізацыю гэтай спадчыны. У рамках Архіву створаны фонд беларускага самвыдату, адбываецца запіс Вуснай гісторыі, фіксацыя Сучаснай гісторыі.

Чытачы «Нашай Нівы» ўжо мелі магчымасьць пазнаёміцца з матэрыяламі Архіву, якія друкуюцца на паласе «Шуфляда». У 1998 годзе «Шуфляда» мусіць паўстаць як навукова-архівістычны альманах, прысьвечаны праблеме «Беларусь і Мадэрнасьць». Але паласа «Шуфляда» ў газэце захаваецца. Пра сам альманах «Наша Ніва» больш падрабязна ўжо пісала.

Рэалізуючы праект фіксацыі Сучаснае гісторыі, Архіў выдаў кнігу «Менская вясна — 1996: Кроніка, дакумэнты, успаміны». Многія таксама памятаюць камплект паштовак пра актуальныя падзеі ў Беларусі, які выдаў Архіў. Дакумэнтаваньне Сучаснасьці мы зьбіраемся пераўтварыць у сталую традыцыю Архіву й выдаваць зборнікі дакумэнтаў па выніках году. Адзін з такіх зборнікаў пра справы мэдыяў ужо падрыхтаваны. А ў першым квартале 1998 году ў Менску Архіў арганізуе прэм'ерны паказ фільму сваёй відэагрупы — «Кароткі слоўнік Беларусі 1996-97» (рэжысэр — Віктар Корзун).

Архіў бярэ ўдзел у стварэньні міжнароднага «Слоўніка дысыдэнтаў 50-80-х гадоў», які будзе ахопліваць рэгіён Сярэдняй Эўропы, а таксама Ўсходнюю Нямеччыну ды Расею. Партнэрамі Архіву зьяўляюцца Цэнтар KARTA (Польшча), «Мемориал» (Масква, Пецярбург — Расея), Група па правах чалавека ў Харкаве (Украіна), «Libri Prohibiti» (Чэхія), таварыства «Alianta Civica» (Румынія).

Рада Архіву мяркуе, што найбольш адэкватным для Беларусі зьяўляецца тэрмін не дысыдэнт, але апазыцыянэр. Адпаведна пашыраная нацыянальная вэрсія будзе называцца «Слоўнік апазыцыі». Невядомыя старонкі гісторыі Беларусі й традыцыі Супраціву прачыняюцца перад намі ў выніку рэалізацыі гэтага праекту. Мэтадычна правільным зьяўляецца падрыхтоўка даведачных выданьняў ужо пасьля стварэньня сур'ёзнай гістарыяграфіі праблемы. Але мы мусім начынаць першымі дасьледаваньне беларускай апазыцыі савецкіх часоў і таму ідзем на мэтадалягічную рызыку. Для больш поўнага збору інфармацыі Архіў наладзіў анкетаваньне ўдзельнікаў беларускай апазыцыі. А першыя беларускія артыкулы міжнароднага слоўніка ўжо загружаныя ў Інтэрнэт.

Адначасова з камплектаваньнем збору беларускага самвыдату вялося складаньне каталёгу па-зацэнзурнага друку Беларусі. Працай над ім займаліся Юрась Лаўрык і Ларыса Андросік. Цяпер каталёг праходзіць стадыю рэцэнзаваньня. У першай палове 1998 году ён будзе надрукаваны, і ўжо дасягнутая дамоўленасьць пра выданьне гэтага каталёгу ў Нью-Ёрку па-ангельску.

Праект Архіву Найноўшае Гісторыі рэалізуецца ў цеснай сувязі зь іншымі праектамі нашага Фонду.

ЭЎРАПЕЙСКІ ІНФАРМАЦЫЙНЫ ЦЭНТАР

Паводле дамоўленасьці з Радаю Эўропы «Наша Ніва» наладзіла пашырэньне ў Беларусі эўрапейскай інфармацыі. Дзеля гэтага на першым этапе арганізаваны пераклад на беларускую мову й публікацыя эўрапейскіх Канвэнцыяў у галіне правоў чалавека. Бібліятэка Эўрапейскага Інфармацыйнага Цэнтру разьмешчаная на базе бібліятэкі Архіву Найноўшае Гісторыі.

ВЫДАВЕЦТВА «НАША НІВА»

Выдавецкі праект — адзін з самых маштабных нашых праектаў. У папярэднія гады выдавецтва «Наша Ніва» ў супрацоўніцтве зь іншымі ўжо выпусьціла такія кнігі:

Аўген Калубовіч. Крокі гісторыі: Дасьледаваньні, артыкулы, успаміны. — Беласток: ГаМакс; Вільня: "Наша Ніва"; Менск: Мастацкая літаратура, 1993.

Баляслаў Лесьмян. Пан Блішчынскі: Вершы / Пераклад з польскае Алега Мінкіна; Прадмова Сяргея Дубаўца. — Вільня: "Наша Ніва"; Менск: Мастацкая літаратура, 1994.

Юліяна Вітан-Дубейкаўская. Мае ўспаміны. — Вільня, 1994.

З 1997 году выдавецкая праграма актывізавалася. Была заснаваная новая Архіўная сэрыя, у рамках якой ужо выйшла легендарная кніга «Гарт. З успамінаў пра Саюз Беларускіх Патрыётаў». У рамках гэтай жа Архіўнай сэрыі выйшлі дзьве кнігі Аляксандра Лукашука «Філістовіч. Вяртаньне нацыяналіста» і «За кіпучай чэкісцкай работай. З жыцьця катаў».

Але выдавецкая праграма Фонду «Наша Ніва» мае, апроч архіўнай, і іншыя кніжныя сэрыі. Гэта сэрыя «Анталёгія» (сярод пазыцыяў такая кніга, як анталёгія «Вільня ў беларускай паэзіі»), сэрыя «Сучасная літаратура», а таксама асобныя несэрыйныя выданьні. Заплянаваная сэрыя гістарычная «Atheneum», у рамках якой выйдуць кнігі пра Кальварыйскія могілкі ў Менску, «Выбранае па-беларуску» Уршулі Францішкі Радзівілавай.

Фундамэнтальны праект «Народная кніга» — выданьне кнігі «Сьцяна» Васіля Быкава рэалізуецца цяпер, і пра яго нашыя чытачы ведаюць падрабязна, а некаторыя й непасрэдна бяруць удзел у гэтым праекце.

Вядома, такая нашая актыўнасьць не магла застацца незаўважанаю, у тым ліку й нашымі нядобразычліўцамі. Да таго ж, з 1 студзеня 1998 году ў Беларусі гвалтоўна спыняецца дзейнасьць усіх выдавецкіх ліцэнзіяў. Цяпер іх трэба перарэгістроўваць і ахвяры ўжо заплянаваныя.

Але мы будзем шукаць варыянты супрацоўніцтва дзеля выданьня кніг. У скрайнім выпадку будзем друкаваць іх за мяжою.

КНІГАРАСПАЎСЮДЖАНЬНЕ

Непасрэдна з кнігавыданьнем зьвязаная дзейнасьць Фонду па кнігараспаўсюджаньні. «Наша Ніва» стварыла сыстэму "Кніга-поштай", дзякуючы якой сучасную беларускую кнігу альбо аўдыёкасэту можна замовіць і атрымаць у самых аддаленых кутках Беларусі. Ужо цэлы год вядзецца праца дзеля стварэньня ў цэнтры Менску незалежнай беларускай кнігарні. Ёсьць шанцы, што ў 1998 годзе яна пачне сваю дзейнасьць.

КУЛЬТУРНЫЯ ПРАГРАМЫ

Фонд «Наша Ніва» пачаў праводзіць акцыі з жывымі формамі сучаснай культуры. Да гэтага мы абмяжоўваліся арганізацыяй сустрэчаў з чытачамі газэты. У 1997 г. у Менску мы наладзілі паказ фільму «Віленскі зборнік» — пра віленскі пэрыяд адноўленай газэты; арганізоўвалі канцэрты рок-музыкі. Літаральна ўчора — 28 сьнежня, адбылася неардынарная падзея — прэзэнтацыя «Народнага альбому», да чаго таксама мела дачыненьне «Наша Ніва».

Але самая грандыёзная імпрэза Фонду «Наша Ніва» — гэта мастацкая акцыя і выстава «Каралеўства Беларусь: Посткаляніяльная культура», якая адбылася ў кастрычніку ў Падкове Лесьнэй каля Варшавы. Праз розныя віды мастацтва — выяўленчае, музыку, літаратуру, тэатар, кіно, была рэпрэзэнтаваная сучасная посткаляніяльная беларуская культура. Выстава зрабіла такое моцнае ўражаньне на нашых польскіх партнэраў, што й сёньня яна яшчэ вандруе па Польшчы — спачатку Варшава, а цяпер Гданьск. Нашыя пляны — наладзіць падобную акцыю й выставу ў суседніх зь Беларусяй краінах, а мара — зрабіць падобнае ў самой Беларусі. Відэафільм «Каралеўства Беларусь: Посткаляніяльная культура» мы пакажам у студзені ў Менску.

Такім чынам, раім сачыць за нашымі абвесткамі й быць уважлівымі чытачамі «Нашай Нівы».

Алег Дзярновіч

Каралеўства Беларусь у Гданьску

«Каралеўства Беларусь» зрабіла наступны крок у пашырэньні сваіх межаў — 9 сьнежня ў памяшканьні Гісторыка-



Філялягічнага факультэту Гданьскага Унівэрсытэту адбылося ўрачыстае адкрыцьцё мастацкай выставы, якая ў лістападзе экспанавалася ў Варшаўскім Унівэрсытэце, а ў кастрычніку, калі тое памятаюць нашы чытачы, у Падкове Лесьнэй над Варшавай. Працы нашых мастакоў і фотаграфікаў будуць у Гданьску да калядных сьвятаў. Далей фонд «Наша Ніва» і фундацыя імя Стэфана Баторыя плянуюць далучыць да Каралеўства яшчэ некалькі унівэрсытэцкіх асяродкаў Польшчы. На думку спадарыні Ганны Ракоўскай, супрацоўніцы фонду Баторыя, працы беларускіх мастакоў вартыя таго, каб зь імі пазнаёміліся ня толькі спэцыялісты ды сталыя наведнікі галерэяў. Цікавасьць да Беларусі, да беларускай культуры таксама — можа часам і дзякуючы эпатажным паводзінам — не, не беларускіх авангардыстаў, а хутчэй беларускіх уладаў —узрастае. (Заўважная дэталь — «беларускі» нумар часопіса «Wik?», пра які я пісаў у пазамінулай «НН», за некалькі дзён выставы ў Варшаўскім Унівэрсытэце быў разабраны ў варшаўскіх кнігарнях дачыста). Таму ёсьць сэнс зрабіць крок насустрач унівэрсытэцкай, інтэлектуалісцкай моладзі, якая найбольш здольная да ўспрыманьня новага, неардынарнага, да актыўнага сумоўя.

У Гданьску ініцыятыву арганізацыі выставы ўзяло на сябе Таварыства беларусаў Гданьска «Хатка». Два дні яго старшыня Алена Глагоўская і актывісты таварыства працавалі разам з намі на мантажы экспазыцыі. Прысутнасьць «сваіх», беларусаў, стварыла надзвычай цёплую, амаль сямейную атмасфэру й на адкрыцьці. З прамовамі выступілі дэкан факультэту, аўтар гэтых радкоў, Ганна Ракоўская, Алена Глагоўская. Крыху нават нечакана для мяне, але прыбыў на запрашэньне консул Беларусі ў Гданьску экс-міністар спадар Бутэвіч, які ўвесну не знайшоў часу завітаць на прэзэнтацыю ў Гданьску «Менскай Вясны-96». У сваёй прамове ён падкрэсьліў важнасьць культурных кантактаў паміж Польшчай і «нашай рэспублікай», адзначыў колькасьць «калектываў», якія за апошні час наведалі Гданьск, сярод якіх, напрыклад, і такі вядомы тэатар, як «Вольная Сцэна» (напэўна, сп. Бутэвіч адстаў ад беларускіх актуаліяў, — як вядома, гэтая сцэна — ужо «ня-Вольная»). Ад удзячнай «Нашай Нівы» экс-міністар (а цяпер, як чуваць, ужо й экс-консул, але пасол РБ у Румыніі) атрымаў каталёг «Каралеўства Беларусь». Пасьля гасьцей чакала прыемная «лямпка віна» ва ўнівэрсытэцкай кавярні, размовы, інтэрвію, бясконцыя пытаньні. І — зноў у дарогу.

Вацлаў Арэшка

Мастак у касьцёле

Успамінаючы эпоху застоя й яе манумэнтальныя «справаздачныя» выставы, міжволі задаесься пытаньнем: дзе быў той прытулак, куды ратавалася душа ад навалы агрэсіўнага афіцыёзу? Зусім натуральна ўцёкі ад панаваньня прыдворнага мастацтва скіроўвалі не аднаго мяне на небясьпечны астравок, у зону экспазыцыі, аддадзеную майстрам-ужыткоўцам. Паводле прыроды сваёй гэтыя творы не прэтэндавалі на ролю носьбітаў ідэалёгіі. Прыгажосьць і натхненьне раскрываліся там вальней за ўсё.



Менавіта на тых астраўках адбыліся мае сустрэчы з творамі Рыгора Кійко. А цяпер новае спатканьне, і зьвязанае яно з пачаткам арыгінальнай традыцыі. Пэрсанальная выстава кераміста разгарнулася ў адной з заляў культурнага цэнтру, што месьціцца ў сутарэньнях Чырвонага касьцёла Сьв. Сымона і Алены ў Менску. Як падарунак да Калядаў, як праменьчык бэтлеемскай зоркі, што дае нам сьвятло надзеі.

Хто ня быў на Барысаўскім камбінаце дэкаратыўна-ужытковага мастацтва, не зазіраў у пякельныя печы, ня дыхаў сьвінцовымі парамі, падманецца красой керамічных опусаў. Мне ж заўсёды здавалася, што, як у старыя часы, мастак працуе тут, прыкуты ланцугом. Балазе цяпер такога няма, нават на вэнэцыянскім крыштальным востраве Мурана. Так і нясеш з сабой уражаньне аб лёгкасьці экспромту, гледзячы на творы Рыгора. Кожная сэнтымэнтальная натура закахаецца ў ягоную «Батлейку», вясёлую, яркую, з чарадой сымпатычных герояў і гоманам кірмашных ражкоў. Будзе шукаць сваю кветку на вазах і пано, якія поўняцца сонцам і галасамі птушак. Нават тэма сталічных новабудоўляў набывае нечаканую паэтычнасьць. Усё ўбачана вачыма паэта, вылеплена і размалявана рукамі шчырага мастака.

Выпускнік Беларускай Акадэміі Мастацтваў, Рыгор Кійко працягвае



традыцыі нашага ўжытковага мастацтва. Калярыстычнае суладзьдзе, неманерная плястыка — адным словам, прыкметы сапраўднага таленту.

Валеры Буйвал

Тры падарункі менскім тэатралам



На здымку: сцэна са спэктаклю "Шчасьлівыя жабракі"

Не аднойчы мне прыходзілася чуць думку аб родным тэатры, як аб найбольш слабым зьвяне ў беларускай культуры. Маўляў, і драматургія ў заняпадзе, і з уласнай школай праблемы, а галоўнае — як можна сур'ёзна размаўляць з публікай на мове, якая для публікі ня ёсьць моваю паўсядзённай дзеі. Апошнія працы трох менскіх тэатраў прымусілі мяне вельмі моцна як зьдзівіцца, так і засумнявацца ў слушнасьці тае думкі. Прычым, дзякуючы як аўтарам спэктакляў, так і самой публіцы. У лік якой, што цікава, мае знаёмыя аднамоўцы не ўваходзілі. Што яшчэ больш дадавала аптымізму маім развагам аб будучыні беларускага тэатру.

Першым разам я зьдзівіўся, калі прадаўшчыца тэатральных касаў не прадала мне квіток на «Ўзьлёт Артура Ўі». Ды яшчэ параіла ўзяць квіток на спэктакаль, што адбудзецца толькі праз месяц. Павеяла чымсьці далёкім і даўно забытым. Масква, 80-я, чэргі ля Таганскіх ды Ленкомаўскіх касаў, запыты пра лішні білецік яшчэ на выхадзе з мэтро, а ў цябе запаветнае права ўваходу, дзякуючы тэатральнаму студбілету. Тыя часіны тэатральная Масква даўно ўзгадвае з настальгіяй, і раптам — Менск. Ну як я мог упусьціць нагоду, каб не «прарвацца»!

Скажу адразу, чагосьці неверагодна новага на сцэне я для сябе ў той вечар не адкрыў. Мэню тэатральных прыёмаў «даеш Брэхта» не адрозьнівалася вытанчанасьцю пошуку. Адмыслова заяркія фарбы пры стварэньні вобразаў, амаль карыкатурная плястыка для «благіх» пэрсанажаў, шалёны тэмп зьмены карцінаў і абавязковыя зонгі. Але новае я адкрываю для сябе ў залі, за якою мне назіраць іншы раз ня менш цікава, чым за сцэнічнаю дзеяю. Тое беспрасьвецьце, што з імпэтам разгортвалі на сцэне Сігоў-Уі & кампанія зь ня меншым імпэтам лавілася заляю. З радасьцю ад пазнавальнасьці сюжэту, а асабліва пэрсанажа Ігара Сігова, актора, чыя схільнасьць да гратэску знайшла неабсяжную прастору ў брэхтавым тэатры. Толькі ад чаго столькі глядацкіх усьмешак? Ці публіка ўспрымае змрочныя карцінкі, намаляваныя драматургам-антыфашыстам, як цалкам немагчымае ва ўласным жыцьці? Але пра публіку — асобна. У асноўным публіку «Вольнай сцэны» складае моладзь ад 17-ці і вышэй. Якая ўжо ня памятае менскіх ажыятажаў з нагоды гастроляў Таганкі, Сацiры ды іншых зорных тэатраў з Масквы, якая яшчэ не пасьпела «выкшталтаваць» свой тэатральны густ, і якая ўспрымае беларускую мову як цалкам натуральную зьяву ня толькі з падмосткаў. Калі ж дадаць рэклямную кампанію, наладжаную ўладамі спэктаклю Мазынскага, дык тэатар сьмела можна павіншаваць са знойдзеным сваім гледачом. Гледачом, які наўрад-ці забудзецца на прыбраную з праграмак вольную назву свайго тэатра.

Напэўна, яшчэ доўга буду ўзгадваць (ды раіць усім паглядзець) «Шчасьлівых жабракоў» ў Тэатры юнага гледача. Тым самым, што знаходзіцца амаль праз вуліцу ад галоўнага дому краіны. І дзе рэжысэр з Масквы Мікалай Шыйко ў тандэме з Рыгорам Барадуліным, які й пераклаў Карла Гоці на мову супраціву, вырашылі пакуражыцца ды яшчэ й пасьмяяцца над гаспадаром таго вялікага дому. І пахуліганілі ад душы, не хаваючы фігі ў кішэнях, а дзёрзка круцячы усімі магчымымі фігамі, жанглюючы пэрламі ненармаванай, як кажуць, расейскай лексыкі, буфанадна абагульваючы ўсе нашы нізкія жарсьці, спакушаючы гледача непрыкрытымі часткамі лепшай ды маладзейшай паловы сваёй трупы, ды яшчэ пад жывыя сьпевы з жывым акампанэмэнтам. Усё зроблена для таго, каб у залі й сумневаў не ўзьнікала — у якім такім Самаркандзе адбываецца дзея і хто такі Мудзафер. Для самых дурных павешаны бел-чырвона-белы сьцяг. Вось толькі што рабіць зь юнымі гледачамі? Што ўтвараюць вакзальны гул у залі на працягу спэктакля і шум стадыённых трыбун, калі іграюць «пра эта»? Я б проста дадаў у афішу адзін радок, наконт таго, што «дзеці да 16» і г.д. Мму-мму-мму, — зайкаецца купец Тарталья, ніяк ня вымавіць імя правіцеля. «Мудак», — прыходзіць яму на дапамогу хлопчык гадоў сямі зь першага раду. Настаўніца ў трансе, аднаклясьніцы ў захапленьні. А можа я й дарэмна на нашых дзетак. Маленькія, а здагадлівыя!

Але найбольшым тэатральным узрушэньнем году, які прамінае, стала «Раскіданае гняздо» у пастаноўцы Барыса Луцэнкі. Праўда, тут для паўнаты карціны трэба дадаць пару дэталяў майго наведваньня расейскага тэатру. У той дзень праходзіў зьезд журналісцкай асацыяцыі. І як у мяне зь сябрам нарадзілася шляхетная ідэя культпаходу — сам зьдзіўляюся. Памятаю, як сябра, вядомы нашаніўскі прагназіст, перапытваў: «Раскіданае гняздо», штосьці знаёмае, гэта ж, здаецца, Пташнікаў?» «Амаль угадаў», — адказаў я, трымаючы калегу ў інтрызе, пакуль не набыў праграмку з гучным імем драматурга. Мне здаецца, чытач «НН» павінен памятаць аўтара п'есы, нават дапускаю, што ён яшчэ не пасьпеў забыцца пра яе зьмест. Тым большым ударам было для мяне, як гэта паставіў Луцэнка. Ад нашага гульлівага настрою не засталося й сьледу з самых першых хвілінаў. Узяць глядацкую ўвагу адразу й трымаць яе за рампаю — справа няпростая. Уся тканіна спэктакля прапітаная нейкай змрочнай сымболікай. Аднак, не безнадзейнай. Вялізная, ва ўсю прастору сцэнічнае «скрыні», быццам недабудаваная, недасканалая, як увесь сьвет, хата. Дзе сярод іконаў ды ідалаў разгортваецца адвечны Купалаў сюжэт. Па-майстэрску выкарыстаная атрыбутыка сучаснага тэатру —амаль не дапасаваныя да канкрэтнага часу строі герояў, незвычайна прыцішанае асьвятленьне, мінімум «канкрэтнага» рэквізыту, — усё гэта прымушае забыцца на першы досьвед прачытаньня гэтай п'есы і вельмі ўважліва сачыць і слухаць. Усё больш пранікаючыся Бядой. І вырваная зь цемры пражэктарам напрыканцы першай дзеі пятля па-над сцэнаю не ўспрымаецца як удалы рэжысэрскі трук. Успрымаецца тым, чым ёсьць — Пятлёй. Асобна хачу спыніцца на музычным афармленьні. Праз усю дзею, прычым, што рэдкасьць, не перарываючы, а значна узмацняючы яе эмацыйна, праходзяць зонгі, зробленыя зь вершаў паэта. І тут я зноў дзівіўся самому сабе, абсалютна па-новаму адчуўшы смак і сэнс чытаных, але ня чутых у рокавым узмацненьні Купалавых рыфмаў. Ня я адзін, уся заля нанова адкрывала для сябе калісьці адзубранага й забытага клясыка. А ён, як аказалася, мог адным словам расьсьмяшыць, адною рэплікай пра нас сёньняшніх сарваць аплядысмэнты. І прымусіць усю залю ў фінале сьціхнуць, а затым устаць, калі шчыльны, ад кулісы да кулісы, падсьветлены адною рампаю шэраг з суворых твараў сьпявае «Людзьмі звацца». У наступным годзе ад беларускага тэатра, я ўпэўнены, трэба чакаць яшчэ не адну цікавую прэм'еру, але гэтым спэктаклям не пагражае застацца ў цені новых пастановак.

Зьміцер Бартосік

БЕЛАРУСКІ ПРАЕКТ

Учора, 28 сьнежня ў Тэатры Юнага Гледача «Наша Ніва» прэзэнтавала «Народны Альбом»

«Народны Альбом» — адмысловы музычны праект, створаны Лявонам Вольскім, Касяй Камоцкай, а таксама вялікім колам іншых вядомых менскіх выканаўцаў: музыкаў, сьпевакоў, гукарэжысэраў і радыё-ды-джэяў...

Праект нарадзіўся з цыклю вершаў Міхала Анемпадыстава, у якіх паўстаюць вобразы й пэрсанажы Заходняй Беларусі міжваеннага часу з 20-га па 40-ы год: ад песьні байцоў Слуцкага паўстаньня да песенькі «беларускай дзевачкі Надзенькі», падманутай савецкім афіцэрам. Але большасьць герояў «Народнага Альбому» жыве цалкам мірным жыцьцём, ня маючы дачыненьняў зь якімі-кольвек вайскоўцамі. Фанабэрысты віленскі прадпрымальнік Казік; «просты хлопец» зь вясковай пілорамы Юзік; местачковая аўдавелая красуня Адэлька; ракаўскі настаўнік Рагойша, які «калісьці вучыўся ў Ратэрдаме»; «выкшталцоная й далікатная» панна Аліцыя; славутыя ўжо праз выступы «Новага Неба» «два польскіх шпіёны» Лёлек і Болек... Гэтыя людзі «пад прыгнётам панскім» танчаць, забаўляюцца, часам сварацца між сабою, але найперш гадуюць дзяцей, «будуюць дамы й саджаюць дрэвы», і, нягледзячы на рознага кшталту праблемы, імкнуцца да Жыцьця.

«Альбом» аб'ектыўна стварыўся як кабарэтны праект, у якім пэрсанажы сьпяваюць на разнастайныя матывы — ад вальсу й танга да рэпу й харду. Гэта свайго кшталту м'юзыкл, які можна ўвасобіць і на сцэне, і ў кіно; паводле якога можна намаляваць дзіцячы комікс, альбо нават напісаць вялікі раман... Пакуль першы крок да пазамузычнага жыцьця «Альбому» аўтары плянуюць зрабіць у выглядзе кніжачкі з выявамі герояў, а таксама з тэкстамі песень.

... Заходняя Беларусь «міжваеннага пэрыяду» — краіна, якой няма, але якая містычным чынам жыве, і ўплывае на нашае жыцьцё. Краіна-міт, а для вялікай часткі беларусаў-усходнікаў амаль невядомая краіна-прывід. Аўтары «Народнага Альбому» зьнішчылі прывіды, і ажывілі міты.

Стаўленьне да таго, што было «за польскім часам» дагэтуль падзяляе беларусаў, акрэсьліваючы вэктары нашай культурнай скіраванасьці. Іх тры — на Захад, на Усход, альбо...

28 сьнежня ў Тэатры Юнага Гледача рэпрэзэнтаваўся праект, народжаны ня зь мітаў, не з прывідаў, і, тым больш, не са штампаў.

Севярын Квяткоўскі

ХІТ-ПАРАД — 97

Месца	*Выканаўца*	*Назва альбому*	*Выдавец*
1	Данчык	Мы яшчэ сустрэнемся	Літ.-маст. суполка
2	N.R.M.	Одзірыдзідзіна	Ковчег
3	Новае Неба	Выбранае	Уши, Сатис
4	Krywi	Krywi	Ковчег
5	Крама	Камэндант	Vigma
6	Жыгімонт Ваза	Стан галюцынацыі	Skat
7	А.Мельнікаў	Гэта Мы!	Анархія Рэкардз
8	Мроя	28-ая зорка	БМА
9	Кардон	Радыяцыя	БАС
10	Віктар Шалкевіч	Смутны беларускі блюз	Ton Records

У 1997 годзе ў «НН» зьявілася рубрыка, у якой мы паспрабавалі пачуць нячутнае — vox populi — адлюстраваць і прааналізаваць тое, што прынята называць «музычным густам народу».

У слоўніках, як адзін зь перакладаў ангельскага слова hit, падаецца «шлягер, модная песенька». У беларускай сытуацыі такі пераклад можна было б разглядаць проста недарэчным, бо ўласна шлягер, г. зн. песьня, якая штодзённа гучыць у розных эфірах, як зьява шоў-культуры нам малавядомая. Але не занатоўваць праз гэта набыткі сучаснай беларускай музыкі, і ў прыватнасьці, не фіксаваць прыярытэты, якія выяўляюцца пры набыцьці аўдыёальбомаў беларускіх выканаўцаў, — было б недаравальна. Таму на старонках «НН» і зьявіўся «Беларускі хіт-парад». Сёньняшняя публікацыя падводзіць вынікі году. Рэйтынг, як заўжды, быў складзены па выніках продажу касэт праз нашую «касэту — поштай», а таксама ў краме D-Shop і ў офісе БНФ на Варвашэні, 8 у Менску.

Беларускай музыцы добра знаёмыя ідэі супраціву: абставінам, рэжыму, жыцьцю. Але менавіта 1997 год стаўся ў гэтым сэнсе этапным. Супраціў набывае гарт і моц. І не апошнюю ролю ў гэтым адыгрывае адзін з сталых лідэраў нашага хіт-параду — гурт N.R.M., які па выніках папулярнасьці ў 1997-м пераўзышоў залаты пэрыяд «Мроі». «Партызанская» — гэта той самы хіт, але ня шоў-, а бунт-культуры, які зьявіўся ў патрэбны час у патрэбным месцы. А радок зь песьні «мы — партызаны, лясныя браты...» стаўся для моладзі мэтафарай сучаснасьці, гэтаксама як некалі — «я — рок-музыкант старых традыцый...» зь перавыдадзенага БМА альбому «Мроі» «28-ая зорка». Альбом гэты, дарэчы, у свой час быў гэтаксама, як і «Одзірыдзідзіна», этапным для «Мроі», якая адчула моц узьдзеяньня свае музыкі і здолела прыцягнуць новых фанаў. Здаецца, «28-ая зорка» можа зацікавіць і новых прыхільнікаў цяперашняга N.R.M. сваім незвычайным для канца дзевяностых хард-рокам.

Нечаканасьцю і адкрыцьцём можна лічыць беластоцкі гурт «Кардон». Выглядае, што пэўная адарванасьць ад Беларусі ідзе толькі на карысьць: нячаста ад беларускіх выканаўцаў можна пачуць стылістычна вытрыманую, нават аўтэнтычную музыку, што характэрная для беластоцкіх музыкаў, якія спрабуюць трымацца за, так бы мовіць, чысты жанр. «Кардон» з посьпехам грае хард-пост-панк, што таксама мала ўласьціва для Беларусі.

Альбом Андрэя Мельнікава «Гэта — Мы!», «дзякуючы рэжыму», атрымаў новае прачытаньне: хочаш ці не, але ў кожнай песьні зараз шукаеш інструкцыяў да пасіўнай ці актыўнай барцьбы за сваё. У сытуацыі з самім бардам можна ўбачыць задоўжанае шоў, калі рэжым з асалодай, але нязграбна выконвае ролю ката, які ня ведае, што рабіць з чалавекам, папулярнасьць якому робяць ня толькі ягоныя песьні, але й становішча вязьня.

Апошнім часам думаецца: ці варта сёньня беларускай музыцы выходзіць з андэграўнду, ці ёсьць у гэтым патрэба, ці стварыла яна ўмовы для свайго існаваньня «наверсе»? Магчыма, прамежак між дзевяноста сёмым і дзевяноста восьмым гадамі дасьць нам адказ. А пакуль — слухайце беларускую музыку.

Сяргей Сахараў

«ПРОСТЫ» ФЭНОМЭН

21 сьнежня ў канцэртнай залі «Менск» рок-фольк-(...)-поп гурт «Палац» сьвяткаваў сваё пяцігодзьдзе.

Здымак Данілы Жылінскага

Наўрад ці гледачы, якія сем'ямі і нават цэлымі працоўнымі калектывамі запоўнілі залю, разважалі аб коштах квітка, якія сягалі да трох сотняў тысячаў беларускіх рублёў; тым больш яны не задумваліся аб тым, што «Палац», нягледзячы на неспрыяльнае для айчыннага шоў-бізнэсу надвор'е, яшчэ на каліва наблізіў нас да разуменьня простага, але не для ўсіх звыклага эўрапейскага прынцыпу — узровень мастацтва мусіць мець адпаведны кошт; і, вядома, у той дзень гледачоў ня мусілі хваляваць важкія стратэгічныя пытаньні «ўсталяваньня беларускай маскультуры дзеля вырашэньня праблемаў нацыянальнага Адраджэньня». Бо...

...«Экшн», «пэрфоманс», «хэпэнінг», «сьвята»: «палацаўцаў» справядліва ўважаюць за найлепшых шоў-мэнаў беларускай рок-сцэны. Кожны выступ гурта — свайго кшталту пераход у віртуальную рэальнасьць: праз сучасныя рознастылёвыя музычныя сродкі («рэп», «тэхна», «рэгі» etc.) глядач спрычыняецца да касмагранічных перажываньняў старажытных беларусаў. Сьледам за «Песьнярамі», якія запачаткавалі беларускую традыцыю эстраднага фольку, «Палац» выконвае аўтэнтычныя песьні, якія ўласнаруч здабывае ў фальклёрных экспэдыцыях. Цікава, што, са словаў аўтараў, аранжыроўкі, праз якія ўзьнікае атмасфэра сучаснага эўрапейскага шоў, звычайна не перавышаюць дваццаці адсоткаў ад усяго твору. Тым ня менш, яны больш чым адпавядаюць сучасным стандартам «цывілізаванае» поп-культуры...

... Імёны ўплываюць на лёсы. Калі «Новае неба» Касі Камоцкай за апошнія гады некалькі разоў «мяняла колер» праз зьмену выканаўцаў, калі «Уліс» увесь час знаходзіцца ў творчым «блуканьні», калі NRM трывала мроіць аб пашырэньні «тэрыторыі» сваёй «рэспублікі», а «Крама» аддае перавагу «продажу» старых хітоў, а не стварэньню новых, дык «Палац» будуе сабе новыя «харомы». У хуткім часе гурт плянуе ператварыцца ў студыю, якая ўбярэ ў сябе разнастайныя пад- (ці над-?) структуры кшталту прад'юсарскай, запісавай і інш., але найперш —некалькі «спадарожных» праектаў. Адзін зь іх ужо сёньня «набірае вышыню»: «Крыві». Ягоныя аўтары — «палацаўцы» Юры Выдронак, Зьміцер Вайцюшкевіч, ягоны «голас» — Вераніка Круглова.

Аўтэнтыка й старажытнасьць песьняў, іхны эксклюзіў у сучаснай фальклярыстыцы, мультыінструмэнтальнасьць і музычная шматпластавасьць аранжыровак — гэта тое, што яднае «Крыві» з «бацькам» «Палацам». Складана меркаваць, хто на юбілейнай імпрэзе атрымаў наймацнейшыя воплескі, «бацька» ці «дачка», але выглядае на тое, што «Крыві» маюць усе шанцы з «спадарожніка» ператварыцца ў самастойную «плянэту». З майго гледзішча, адмысловасьць праекту «Крыві» — у скіраванасьці да псыхадэлікі. Калі «Палац» арганічна ЎВІВАЕ сучасныя рытмы ў старажытныя беларускія карункі, стварае іхнае новае гучаньне, дык «Крыві» імкнуцца РАСКРЫЦЬ таямнічыя знакі беларускага арнамэнту праз перакрочваньне мяжы сучаснага сьветаадчуваньня ў бок Першапачатковага. Мяркую, няма аніякае супярэчнасьці ў тым, што Юрыю Выдронку і Зьміцеру Вайцюшкевічу ўдаецца працаваць з блізкім матэрыялам у розных накірунках. Рэч у тым, што да Першапачатковага можна наблізіцца толькі дзякуючы жанчыне: сакрэт (ці душа) «Крыві» — у Вераніцы Кругловай.

... Адзін журналіст, спрабуючы зразумець фэномэн працы музыкаў, паспрабаваў даведацца аб суадносінах «тутэйшага» і «нетутэйшага» ў іхных песьнях. Адказ, вядома, быў просты — беларускім ёсьць усё, што створанае беларусамі.

Севярын Квяткоўскі

ПРАГА САЛІДАРНАСЬЦІ

у Менску адбылася беларуска-ўкраінская канфэрэнцыя

Новыя беларуска-ўкраінскія дачыненьні толькі паўстаюць. Застаюцца яшчэ ўспаміны пра пісьменьніцкія дэлегацыі савецкіх часоў і гасьціннасьць прыёмаў. Сёньня ж з заўважных пазадзяржаўных кантактаў можна было ўзгадаць толькі апокрыф пра тое, як Зянон Пазьняк праклаў сьцежку на ўкраінскай мяжы.

Але цяпер праграму ўзаемадзеяньня са сваімі ўкраінскімі партнэрамі фармулююць незалежныя культурніцкія й адукацыйныя асяродкі Беларусі. 12-14 сьнежня ў Менску адбылася міжнародная канфэрэнцыя «Беларусь і Ўкраіна: Вынікі стагодзьдзя». Галоўным яе арганізатарам быў «ЭўроФорум», ягоныя партнэры — Беларускі Гуманітарны Адукацыйна-Культурны Цэнтар ды Центар Гуманітарних Досліджень Львівського Університета. Канфэрэнцыя сапраўды сталася заўважанай падзеяй.

Абсурд беларускай сытуацыі толькі падкрэсьліваў унікальнасьць акцыі. Ужо першая імпрэза канфэрэнцыі — літаратурная вечарына «Новая невядомая Ўкраіна: учарашнія скандалісты або дысыдэнты — сёньняшнія культурныя героі», адбывалася ў незвычайных умовах. У гэты самы час у Доме літаратара балявалі ўдзельнікі дэлегацыі расейскіх шавіністычных пісьменьнікаў. Шум іхнага сьвята прарываўся ў залю, часам перашкаджаючы слухаць. На беларуска-ўкраінскі дыялёг накладаліся іншыя агрэсіўныя гукі.

Да запрошаных і дакладаў арганізатары, наколькі я ведаю, падышлі вельмі прагматычна. У праграме былі зазначаныя тыя людзі, які здольныя ня проста на цікавую імправізацыю, але якія могуць напісаць уласна даклад — структуяваны, закончаны, цікавы. Варта назваць імёны некалькіх выступоўцаў, да чыіх тэзаў так ці йнакш вярталіся ў сваіх прамовах іншыя ўдзельнікі канфэрэнцыі. Сваю сацыялягічную адзінку вымярэньня сёньняшняй сытуацыі — «маргінал» — прапанаваў Алесь Анціпенка ў дакладзе «Маргіналы й маргінальнасьць у беларускім постсавецкім грамадзтве». На жаль, ня змог прыехаць з Кіева Мікола Рабчук, але ягоны даклад «Крэольскі нацыяналізм ва Ўкраіне й Беларусі: 90-я гады» быў зачытаны на канфэрэнцыі. Праз тое, што тэма прысьвечаная «крэольскаму нацыяналізму», тэкст быў напісаны па-расейску. Сваю энэргетычнаю тапальнасьць залі надаў львавянін Раман Кісь выступам «Нэаэўразійства: мэнталітэт, ідэалёгія, геастратэгія». Славамір Адамовіч потым зьдзіўляўся, што, слухаючы ўкраінцаў, ён атрымоўвае ад іх, у адрозьненьне ад выступаў беларусаў, ня толькі інфармацыю, але й энэргію.

Выступ Кшыштафа Чыжэўскага з Сэйнаў быў варты ўвагі хаця б толькі з-за адной тэзы — ідэі скіту для інтэлектуалаў сучаснасьці. Тут ужо не стрымаўся Валянцін Акудовіч, які, усхапіўшыся са свайго крэсла, заявіў, што ён сам бы марыў жыць у скіце, але вось заўтра (14 сьнежня) мітынг у абарону газэты «Свабода» — і ён пойдзе на гэты мітынг, прапусьціўшы паседжаньне канфэрэнцыі. Але прапускаць паседжаньне не прыйшлося, бо ўсе ўкраінскія ўдзельнікі захацелі папрысутнічаць на мітынгу. Былы дысыдэнт Раман Кісь нават выступіў з трыбуны й выклікаў сымпатыі прысутных.

Нібы пацьвярджаючы тэзы пра эўразійства, на Беларусь і на ўсю Сярэднюю Эўропу ў тыя дні насунуўся арктычны антыцыклён са страшэннымі маразамі. Усё гэтае палітычнае тло, а таксама актыўнасьць і выступы беларусаў, як мне здаецца, пераканалі ўкраінцаў, што нам патрэбныя ня іхныя спагада й спачуваньні, але іхная зацікаўленасьць і іхная салідарнасьць.

Алег Дзярновіч

Наркотыкі ў дулах савецкіх танкаў

Гутарка пра сытуацыю ў Таджыкістане

Алег Панфілаў у лістападзе 92-га вымушаны быў пакінуць свой родны Таджыкістан. У Расеі ён піша кнігі пра старажытную й сучасную таджыцкую гісторыю ды культуру. У новых незалежных дзяржавах Алега Панфілава ведаюць як кіраўніка службы маніторынгу парушэньня правоў журналістаў з Фонду абароны галоснасьці, на Захадзе — як заснавальніка часопіса «Центральная Азия», што выдаецца ў Швэцыі, у самой Цэнтральнай Азіі — як экспэрта апазыцыі на міжтаджыцкіх перамовах.

"НН": Алег, параўноваць сытуацыю ў Беларусі і Таджыкістане складана. Тым ня менш, падзеі, што адбываліся і адбываюцца у былых савецкіх рэспубліках, маюць і агульныя карані...

"А.П.": Расея, якая арганізавала у 1992-м пераварот, была й застаецца саўдзельнікам грамадзянскае вайны ў Таджыкістане — краіне, якая не атрымала ў спадчыну пасьля развалу Союзу ніводнага аўтамата і ніводнага танка. Агромністая колькасьць зброі, што цяпер ёсьць у Таджыкістане, наступае сюды з Расеі. І рэжым Рахмонава, па сутнасьці, жыве на крэдыты, атрыманыя, галоўным чынам, з Масквы, альбо — у меншай ступені — тыя, што часам падкідваюць з Захаду. Таджыкістан застаецца адзінай краінай на тэрыторыі былога СССР, якая не падпісала пратакол з НАТО аб партнэрстве дзеля міру. І ў штаб-кватэры НАТО разумеюць, чаму так адбылося — бо Таджыкістан ня здольны падпісваць ніякія дакумэнты, не таджыцкія ўлады вырашаюць лёс сваёй краіны.

"НН": Але ўсё ж, падпісаная ў Маскве дамова, наколькі я ведаю, азначае замірэньне апазыцыі з афіцыйным Душанбэ. Ці дае яна нейкія спадзяваньні на зьмены?

"А.П.": Справа у тым, што ніхто ня ў стане растлумачыць пазыцыю Масквы адносна Таджыкістану. Заявы Масквы, быццам Таджыкістан зьяўляецца зонай расейскіх геапалітычных зацікаўленьняў, на справе нічым не пацьвярджаюцца. Зьнешнюю мяжу з Афганістанам ахоўваюць расейскія памежнікі і, здавалася б, Расея зацікаўленая ў тым, каб хоць нейкім чынам разьвіваць таджыцкую эканоміку. Але ж у Таджыкістане няма ніводнага таджыцка-расейска СП. На мой погляд, гэта парадаксальная сытуацыя. Казаць аб пранікненьні ісламскага фундамэнталізму цераз Таджыкістан — глупства. Гэтае паняцьце сёньня чыста палітычнае, але не рэлігійнае.

"НН": Дык у чым тут, на Ваш погляд, прычына?

"А.П.": Прычына ў тым, што палітыкаю ў Расеі ды Таджыкістане займаюцца сёньня выключна людзі ў пагонах, а не дыпляматы ці палітыкі. У выніку — бескантрольны расход зброі, дакладаней — магчымасьць яе прадаваць гэтаксама, як і наркотыкі. Нікому яшчэ не ўдалося пацьвердзіць заявы памежнікаў, якія ўвесь час абвінавачваюць нейкіх людзей у тым, што яны пераносяць цераз мяжу вялікую колькасьць наркотыкаў у Таджыкістан. Вайскоўцы не пускаюць на мяжу незалежных журналістаў, тое самае адбываецца з вайсковымі назіральнікамі ААН. Між тым, многія вайскоўцы ў прыватных гутарках прызнаюць, што яшчэ цягам вайны ў Аўганістане наркотыкі перавозілі ў дулах савецкіх танкаў. Старыя каналы, хутчэй за ўсе, працуюць і цяпер. Так што сытуацыя ў Таджыкістане залежыць ад таго, наколькі Расея зможа кантраляваць сваіх ваенначальнікаў. З другога боку, расейская дыпляматычная школа — гэта школа савецкай дыпляматыі. Былы пасол Расеі ў Таджыкістане, дарэчы, — ваш зямляк, Вячаслаў Сянкевіч, так бы мовіць, савецкая намэнклятура. Ідэалёгія ў яго засталася старая. Ён, на мой погляд, вінаваты шмат у чым з таго, што здарылася за гэтыя гады ў Таджыкістане.

"НН": Часта даводзіцца чуць аб тым, што згоды ў Таджыкістане не ўдаецца дасягнуць яшчэ і з-за расколу ў стане апазыцыі...

"А.П.": Ёсьць лідэр аб'яднанай таджыцкай апазыцыі Саід Абдуло Нуры. Ягоны першы намесьнік Хаджы Акбар Тураджон-Зада, былы кіраўнік духоўнае ўправы таджыцкіх мусульманаў, усе тры гады ўзначальваў дэлегацыю таджыцкай апазыцыі ў Тэгеране на перамовах. Калі ў расейскай прэсе пішуць, што лідэры апазыцыі, маўляў, паміж сабой ня ладзяць, гэта робіцца наўмысна, дзеля таго, каб раскалоць апазыцыю, альбо хоць бы стварыць уражаньне, што адзінай апазыцыі няма. Так робяць паўсюль, і ня мае значэньня — Чачэнія гэта, Беларусь ці Таджыкістан. Тым ня менш, у Таджыкістане ёсьць згуртаваная апазыцыя, і даволі моцная.

Так што ў блізкім часе Расея, якая прызвычаілася трымаць «свае» тэрыторыі пад кантролем, нават пасьля падпісаньня агульнага пагадненьня будзе дыктаваць свае ўмовы Таджыкістану.

"НН": Але ж падобныя адносіны складаліся не адно дзесяцігодзьдзе. Наколькі можа зацягнуцца працэс дэсаветызацыі Таджыкістану?

— Я думаю, павінны вырасьці некалькі пакаленьняў. У Таджыкістане, як і ў Беларусі, цяперашнія ўлады перашкаджаюць адраджэньню нацыянальнай мовы й культуры. Таджыкі прыкладна з восьмага стагодзьдзя да 1929 году карысталіся арабскай графікай, уся клясычная літаратура напісаная на мове фарсі. Бальшавікі, апрача ідэалёгіі, вырашылі зьмяніць і пісьменства. Увялі спачатку лацінку, а праз дзесяць гадоў — кірыліцу. Гэта тое самае, калі б Пушкіна прымусілі пісаць па-расейску, але кітайскімі герогліфамі. Людзей, якія ведаюць арабскую графіку, засталося зусім мала. А што зрабілі з мэнтальнасьцю таджыкаў, я ўсьведаміў, калі ўпершыню ўбачыў фатаздымак 30-х гадоў. Таджыцкія дзяўчыны шпацыруюць па Краснай плошчы ў трусах і майках у дзень нейкага савецкага сьвята. Цнатлівых людзей, якія належаць да ісламскае культуры, прымусілі распрануцца і ісьці голымі на вачах натоўпу. Бальшавікі ні з чым не лічыліся, праводзілі масавыя акцыі зьняцьця паранджы. Ніхто не гаворыць праўду — аб тым, што гэта суправаджалася масавымі забойствамі і гвалтам. Таму я ніколі не пагаджуся з прыгожымі словамі пра тое, што таджыкі — частка нашай агульнай сям'і.

Гутарыла Алена Лукашэвіч

Паштоўка да Фідэля Кастра



1 студзеня. Забаўны дзень у календары. У гэты дзень у 1919 годзе беларускія камуністы ў расейскім горадзе Смаленску з блаславеньня тав. Сталіна абвесьцілі пра стварэньне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, і роўна праз сорак гадоў на далёкай і сонечнай высьпе Куба, дзе на плянтацыях высьпяваюць чорны тытунь, цукровы трысьнёг ды розныя цытрусавыя, здарылася сацыялістычная рэвалюцыя. Ці злучае што-небудзь для мяне гэтыя падзеі? Бадай, нічога. Ну, хіба што ў Бэсэсэр у васьмідзясятыя гады ўсе крамы былі заваленыя моцнымі й духмянымі цыгарэтамі «Партагас», «Легерос» ды «Монтэ-Крыста», якія вырабляліся на тытунёвых фабрыках высьпы Свабоды? А таксама ў дзіцячую памяць урэзаўся назаўсёды слоган з рэклямнага плякату «Кубинские грейпфруты — в нас больше сока!» Кубінскія цыгарэты беларускія курцы, ня гледзячы на даступнасьць (20 капеек за пачак, таньней за «Астру»), ня надта каб шанавалі, былі яны замоцныя для беларускіх горлаў ды плюцаў. А грэйпфруты, у якіх было болей соку, жыхары Магілёва ўпарта называлі «гібрыдамі», і таксама ня вельмі ахвотна куплялі.

Ня памятаю, як у тыя гады я ставіўся да сакоўнасьці кубінскіх гібрыдаў, а вось кубінскія цыгарэты паліў ахвотна. Пры наяўнасьці процьмы станоўчых якасьцяў, якія зразумець здолее толькі аматар моцнага тытуню, яны яшчэ мелі адну чароўную ўласьцівасьць. Іх не адбіраў пасьля выкручваньня кішэняў наш дырэктар школы. Ён паліў цыгарэты ўсіх гатункаў, якія вадзіліся ў вучняў нашае школы. А мой «партагас» не адбіраў. Толькі моршчыўся ды чытаў кароткую натацыю пра шкоду паленьня.

Быў у мяне яшчэ сябра Воўка, у якога было досыць дзіўнае хобі. Ён віншаваў з усякімі сьвятамі ўсіх прэзыдэнтаў, старшыняў парлямэнту, кіраўнікоў камуністычных партыяў ды манархаў. Хобі гэтае вымагала дастакова вялікіх фінансавых укладаньняў, але гэтая ніва й прыносіла талковы плён. Узрушаныя вялікія людзі гэтага сьвету слалі Воўку свае лісты й часам сувэнірчыкі. Памятаю, што Эрых Хонэкер слаў мадэлькі аўтамабіляў, Кім Ір Сэн — карэйскую парцаляну, Фідэль Кастра — кубінскія цыгары. Відаць і іншыя алімпійцы, напэўна, неяк дзячылі майму сябручку за пісаніну. Сувэніры вельмі добра распрадаваліся сярод знаёмых і праз камісійную краму, што на Першамайскай. Кубінскія цыгары, укладзеныя па 25 штук у драўляныя скрынкі, паліліся намі пры нагодзе на працягу ўсяго году.

На мой вялікі жаль, кубінскія цыгарэты зьніклі з паліцаў яшчэ за колькі гадоў да заўчаснай сьмерці БэСэСэРу. Пасьля некалькі гадоў я ў якасьці замены ім паліў любімыя цыгарэты францускіх пралетараў ды кляшараў — «Голуаз Капораль». Апошнія гады чатыры іх нельга знайсьці ў Вільні. Усе чатыры гады са мною здараецца прыкладна раз на месяц прыступ хваробы «Хачу ня ведаю чаго». Ходзіш па вуліцы й думаеш, чым бы такім паласавацца: лёдамі, півам, салёнымі гуркамі, карэйскай морквай, ірляндзкім віскі, літоўскім карбанадам, шклянкаю кабэрнэ? Ходзіш, і пасьля лёдаў з карамэляй п'еш горкае піва, ясі ў кавярні карбанад, заліваеш наверх усё віном, а жаданае задавальненьне не прыходзіць. А праз дзень супакойваесься й жывеш сабе далей спакойна.

Днямі са мною здарыўся прыступ гэтае хваробы. Мая сяброўка вытлумачыла гэта, як звычайны зімовы авітаміноз, сунула ў руку пяць літаў і выслала ў краму па грэйпфруты. Па дарозе ж я зразумеў, што хочацца мне нерэальнага. Проста выпаліць тоўстую, сакоўную кубінскую цыгару «Рамэа й Джульета». Вось тады я й прыгадаў майго сябручка зь ягонымі паштовачкамі да кубінскага дзядзі Федзі Кастрова. І думаў пра тое, чаму б не павіншаваць гэтага барадатага аматара бэйсболу зь днём кубінскай рэвалюцыі? Адрас просты — Куба, Гавана, Фідэлю Кастра. Дый тэкст нескладана скляпаць. «Дарагі таварыш Фідэль. Віншую Цябе зь вялікім сьвятам — Днём Кубінскай Рэвалюцыі. Зычу маленькай высьпе Свабоды якой-небудзь там індустрыялізацыі, ці яшчэ якой трасцы, зьвязанай з барацьбою супраць мірыканскага амперыялізму». Толькі сёлета я так і не надпісаў паштоўкі да добрага дзядзі Федзі. Забегаўся-закруціўся-забыўся. Шкада. Давядзецца чакаць скрынку з цыгарамі ў бляшаных футуральчыках яшчэ адзін год.

Андранік Антанян

Брытанскія закладнікі ў Чачэніі

Усе ўжо сталі прызвычайвацца да таго, што ў пасьляваеннай Ічкерыі зьнікаюць людзі. У ноч на 3-га ліпеня з раёну Ташкала ў Грозным былі выкрадзеныя двое ангельцаў — Джонатан Джэймс і Каміла Кар. Я сустрэў іх за два тыдні да гэтага ў Маскве, куды яны прыяжджалі, каб падоўжыць расейскую візу. Таму, калі міністар унутраных справаў Чачэніі Казьбек Махашаў назваў іх ангельскімі шпіёнамі, я шмат што зразумеў у паведамленьнях пра іншых закладнікаў: спачатку людзі зьнікалі, затым яны аказваліся таемнымі агентамі ФСБ альбо нейкай іншай разьведкі.

Хто ж такія Джонатан Джэймс і Каміла Кар? Гэтая пара — валанцёры з Англіі, якія працавалі бясплатна, што вынікае зь іхнага добраахвотнага статусу, у дзіцячым псыхалягічным рэабілітацыйным цэнтры «Зорачка» ў Грозным. Яны апекаваліся прыкладна 250 чачэнскімі дзецьмі, якія атрымалі стрэс у часе беспрэцэдэнтна жорсткай расейска-чачэнскай вайны. У сваёй працы па псыхалягічнай рэабілітацыі яны зьвярталіся да выяўленчых мастацтваў, драматычнай творчасьці й гульнёвай тэрапіі. Яны працавалі ў Грозным з пачатку чэрвеня і зьбіраліся заставацца там да канца жніўня. Затым, як расказваў мне Джонатан, яны хацелі вярнуцца ў Англію і шукаць там спонсарскую падтрымку для падаўжэньня сваёй дзейнасьці ў Чачэніі. Джонатан і Каміла — незаможныя людзі, і ў Англіі ў іх не было сталай працы. Пасьля зьверскага забойства супрацоўнікаў Чырвонага Крыжа яны сталі першымі ахвярамі разбойнага нападу на асобаў зь ліку замежных сяброў гуманітарных і міратворчых арганізацыяў у Ічкерыі. Амаль аднachасова зь імі ў Назрані (Інгушэція) быў скрадзены францускі лекар з арганізацыі «Лекары бязь межаў», а ў жніўні былі скрадзеныя ў Махачкале і перавезеныя ў Чачэнію 4 супрацоўнікі францускай гуманітарнай арганізацыі «Экілібр».

Пазьней, напрыканцы кастрычніка, францускаму лекару пашчасьціла вызваліцца, скарыстаўшы хібу ягонай варты, але практычна адразу ж у Грозным былі скрадзеныя два супрацоўнікі Вугорскай Міжнароднай Арганізацыі. Пра замежнікаў яшчэ паведамляюць, але пра тое, што больш за 40 дагестанцаў сталіся закладнікамі ў Чачэніі, мала хто ведае. «Пасьля расейска-чачэнскай вайны, — піша карэспандэнт «Таймс» Нікалас Вуд, — Грозны, які яшчэ ўчора апісваўся як другая Хірасіма, стаў сусьветнай сталіцай закладніцтва».

Варта аднак адзначыць, што скрадаюць ня толькі ў Чачэніі альбо паблізу ейных межаў. Апошнім часам у закладнікі бралі людзей у Емэне, Самалі і Басконскай правінцыі ў Гішпаніі. Калі я абмяркоўваў праблему закладніцтва з адным маім сябрам з Калумбіі, ён мне распавёў, што калумбійцы, у большасьці, маюць імунітэт супраць страху стаць закладнікам. Зусім нядаўна закладніцтва ў Калумбіі мела масавы характар, бралі ж закладнікаў, як і ў Чачэніі, дзеля таго, каб атрымаць добры выкуп. Таму меркаваць, што закладніцтва — унікальная чачэнская ці паўночнакаўкаская зьява, няслушна.

Думаецца, што асноўныя прычыны ўзрастаньня колькасьці закладнікаў у Чачэніі палягаюць у сфэры эканомікі. За 21-га месяц найцяжэйшай вайны з Расеяй квітнеючая дагэтуль эканоміка краіны была зруйнаваная. Беспрацоўе дасягнула жахлівага ўзроўню — 70%. Вялікая колькасьць узброеных людзей і скрайняя мізэрнасьць вытворчасьці тавараў і паслугаў — гэта ёсьць, на мой погляд, пажыўнае асяродзьдзе крымінальнага бізнэсу праз захоп закладнікаў, пры гэтым спрацоўваюць старыя савецкія ўяўленьні пра тое, што кожны замежнік — бясспрэчна багаты чалавек.

Чачэнская дзяржаўнасьць вытрымала выпрабаваньне вайной, але затым яна сутыкнулася, як бачна, зь ня менш складанымі праблемамі. Ужо сёньня многія ўрады настойліва раяць сваім грамадзянам ня езьдзіць у Чачэнію. Відавочна: захоп закладнікаў вядзе да ўсё большай ізаляцыі рэспублікі. Здагадваюся, што часткова крымінальны хаос падаграецца звонку, але ўсё ж пасьля таго, як фэдэральныя расейскія войскі пакінулі Чачэнію, чачэнская дзяржава мусіла выказаць больш мужнасьці і рашучасьці ва ўсталяваньні такога парадку, калі і чачэнцы (а іх таксама бяруць закладнікамі), і замежнікі ня будуць увесь час думаць пра тое, што іх могуць скрасьці.

Які ж лёс зьніклых брытанцаў? Ужо мінула 5 месяцаў з часу іхнага скраданьня, але па-ранейшаму амаль нічога не вядома. Ёсьць даволі пэўныя зьвесткі, што яны жывыя, і што за іх патрабуюць выкуп — 2 млн. даляраў. Былы скарбнік Кансэрватыўнай партыі лорд Макэлпайн у сярэдзіне лістапада зрабіў заяву, што група былых афіцэраў брытанскага антытэрарыстычнага падразьдзяленьня рыхтуецца да паездкі ў Чачэнію, каб дапамагчы чачэнскаму спэцатраду па барацьбе з тэрарызмам вызваліць брытанскіх закладнікаў, і ён спадзяецца, што гэта спраўдзіцца дастаткова хутка.

Міхаіл Рошчын, Бірмінгэм



Бясплатныя прыватныя абвесткі

Запрашаем ліцьвінаў манархічнага кірунку. 246012, Гомель, а/с 124

Віншаваньні чароўнай пані, добразычліваму чалавеку, прафэсіяналу Галіне Пільчук з нагоды дня нараджэньня дасылаюць Лаўрэшы

Гісторыка-культурны клюб «Княжыч»: Бацькаўшчына, Крывітэсьлівасьць, Воля. Чакаем годных. Тэл.: (8-02144) 4-61-98, 5-21-23

Спадарыню Клаўдзію з днём народзінаў віншуе Аршанская суполка. Здароўя і цікавых сустрэч

Галіну Аляксееўну з Воршы віншуе Аршанска-Бараньская суполка з днём народзінаў. Як у Бартосіка: «Хай зьдзейсьняцца ўсе мары і мэты»

Усіх шчырых беларусаў віншуем з надыходзячымі сьвятамі. Хай здохне той, хто нас ня любіць. Аршанска-Бараньская суполка

Беларуская, расейская мовы: пераклады, урокі. Тэл.: 221-23-68

Віншуем Ляшэвіч Ірыну і Сержука з нараджэньнем дачушкі Яначкі. Зычым здароўя і шчасьця. Казьленка

Віншую Пятровіч Наташу з Калядамі і Новым годам. Няхай зьдзейсьняцца самыя сьмелыя мары. Казьленка Марына

Шаноўнага Паўла Армоніка віншую з Калядамі. Н.Гурына

Хто мову і веру мяняў, той ня толькі сябе — і суседа прадаваў. Беларускі народ

Запрашаем прыхільнікаў Манархіі. 246012, Гомель, а/с 124. Алесь Чорны

Віншую ўсіх сяброў МФ «Калюмны» з Новым годам ды Калядамі. Перамогі нам! Ільля

Cłopča miły, maju tryvožyš dušu ty jašče. Dziaŭčo, jakoje šukaje paparać-kvietku

Matula Hanula, vinšuju z Kaladami. Raščaravańnie, sum, adčaj haj zastanucca ŭ 1997 hodzie. Tvaja vadalivačka

Aleś, vinšuju z narodzinami. Zastavajsia synam Volnaj Bielarusi

Сябры гуртку беларусазнаўства віншуюць усіх, хто любіць родную мову, з Новым годам і чакаюць ліставаньняў ад іх. 231300, Ліда, Баграцыёна, 6. Кіраўнік гуртка Лявон Анацка

КУПОН

Бясплатнай прыватнай абвесткі

Тэкст:

Імя і прозьвішча

Адрас, тэлефон

Запоўніце гэты купон і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. 220123, Менск, а/с 71

КОНКУРС

БЕЛАРУСЬ МАІМІ ВАЧЫМА СЯБРЫ!

Таварыства Беларускай Мовы імя Францішка Скарыны сумесна з Фондам садзеяньня асьветніцкай дзейнасьці праводзіць конкурс на лепшы верш альбо сачыненьне.

Сачыненьне (верш) павінны быць прысьвечаныя нашай Бацькаўшчыне, яе мінуўшчыне, сучаснасьці, будучыні, яе славутым сынам, а таксама маляўнічым і адметным мясьцінам Беларусі альбо нават проста людзям, якія сваім паўсядзённым жыцьцём нябачна служаць беларускай нацыі.

Ваш удзел у конкурсе — гэта яшчэ адна кропля да вялікай плыні адраджэньня нашай Бацькаўшчыны.

Пераможцы конкурсу атрымаюць прызы — касэты з запісамі беларускіх гуртоў, кніжкі за подпісамі аўтараў. Прадугледжаны Галоўны Прыз, але што гэта такое, Вы даведаецеся напрыканцы конкурсу.

Усе ўдзельнікі запрашаюцца на сьвяточную імпрэзу, дзе пераможцы атрымаюць прызы з рук нашых славутых пісьменьнікаў, пасьля чаго адбудзецца канцэрт беларускіх бардаў і беларуская дыскатэка.

Лепшыя творы будуць надрукаваныя!

Але ж галоўнае — наш конкурс дае магчымасьць знайсьці новых сяброў, пазнаёміцца зь людзьмі, што любяць Беларусь, неабыякавыя да яе лёсу.

Вы вырашылі ўзяць удзел у нашым конкурсе? Цудоўна!

Для гэтага Вы павінны абраць любую з наступных тэмаў:

1. Цікавая падзея ў гісторыі Беларусі.
2. Ён ствараў гісторыю. Велічныя постаці Беларусі.
3. Якой я бачу сваю будучыню і будучыню Беларусі.
4. Лёс мовы, які ён?
5. Вольная тэма.

Вы можаце закрануць якую заўгодна тэму беларускасьці, трэба толькі, каб яна сапраўды хвалявала цябе, выклікала іншых на шчырую размову.

Свае творы пакідайце Вашаму мясцоваму арганізатару альбо дасылайце на адрас: 220005, Менск, а/с 64. Даведкі праз тэл.: 223-25-11 (тэлефануйце ў аўторак і чацьвер з 11.00 да 14.00). Абавязкова паведамляйце свой адрас і тэлефон для сувязі.

Творы прымаюцца да 25 лютага. Аб'ём адвольны.

Жадаем посьпехаў!

Беларускі патрыятычны сьпеўнік

ПАЎСТАНЬ НАРОД

Вакальны маналёг для баса-барытона (ці мецца-сапрана). Словы ўзятыя зь вядомага вершу Я. Купалы «Свайму народу». У акампанымэнце выкарастаныя звароткі песьні «Ой, арол, ты, арол».

сл. Я.Купалы
муз. народная

Паўстань, народ! Прачніся, Беларусе!
Зірні на Бацькаўшчыну, на сябе!
Зірні, як вораг хату і зямлю раструсіў,
Як твой навала злыдняў скарб грабе!

Паўстань, народ! Для будучыні шчасьце
Ты строй, каб пут ня строіў больш сусед;
Ня дай ты ў гэты грозны час прапасьці —
Прапашчых не пацешыць шчасьцем сьвет.


Сваю магутнасьць пакажы ты сьвету,
Свой край, сябе ў пашане мець прымусь.
Паўстань, народ!.. З крыві і сьлёз кліч гэты...
Цябе чакае Маці-Беларусь!

Energico

allargando

Marcato

ПАДПІСКА



Дарагія чытачы. Кніга Васіля Быкава «Сьцяна» выйдзе ў сьвет не ў канцы гэтага, як плянавалася, а ў самым пачатку 1998-га году. Прычына затрымкі тэхнічная: выдавецтва не абвясьціла пра заканчэньне падпіскі. Выбачаемся і выпраўляем сваю памылку: апошні тэрмін, калі Вы можаце адправіць заяўку — да 3 студзеня 1998 году. Калі Вы гэтага яшчэ не зрабілі — маеце апошні шанец.

Каб замовіць новую кнігу прозы Васіля Быкава «Сьцяна», трэба 68.000 (кошт выданьня) + 20.000 (паштовыя выдаткі) пералічыць на рахунак: БГФ «Наша Ніва» р/р 3015201930039 «Гарант» філія АКБ «Поіск» г. Менску, Код 987.

Не забудзьцеся на паштовай квітанцыі ў сэктары «Для пісьмовага паведамленьня» указаць назву кнігі й Ваш дакладны паштовы адрас і, калі ёсьць, тэлефон.

КНІГІ – ПОШТАЙ

Каб замовіць патрэбную Вам кнігу, неабходна пазначаную суму плюс суму за перасылку праз пошту пералічыць на наступны рахунак: БГФ «Наша Ніва» р/р 3015201930039 «Гарант» філія АКБ «Поіск» г. Менску, Код 987.

Не забудзьцеся на паштовай квітанцыі ў сэктары «Для пісьмовага паведамленьня» указаць назву кнігі й Ваш дакладны паштовы адрас і, калі ёсьць, тэлефон.

Зьвяртацца можна праз пошту: 220085 Менск, а/с 5, Віталь Супрановіч.

№	Аўтар і назва	кошт	кошт перасылкі
1	Гарт. З успамінаў пра Саюз Беларускіх Патрыётаў.	60.000	16.000
2	А.Лукашук. Філістовіч. Вяртаньне нацыяналіста.	28.000	12.000
3	А.Цьвікевіч. «Западноруссизм». Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў 19 і пачатку 20 в.	40.000	16.000
4	І.Абдзіраловіч. Адвечным шляхам. Дасьледзіны беларускага сьветапогляду.	10.000	10.000
5	Е.Ширяев. Русь Белая, Русь Чёрная и Литва в картах.	40.000	12.000
6	М.Говард. Сучасная культурная антрапалёгія.	25.000	16.000
7	У.Ла Бар. Асабістасьць з псыхалягічнага пункту гледжаньня.	12.000	10.000
8	Дж.Эйчысан. Гаваркія істоты. Уводзіны ў псыхалінгвістыку.	10.000	12.000
9	Што такое параўнальнае літаратуразнаўства.	25.000	12.000
10	Б.Фэйган. Уводзіны ў археалёгію.	10.000	12.000
11	Дж.Лоўзі. Гістарычныя ўводзіны ў філязофію навукі.	20.000	12.000
12	Ж.Дзюрасэль. Эўропа з 1815 году да нашых дзён.	15.000	16.000
13	Ф.Брэтон. Выбух камунікацыі.	20.000	12.000
14	Ж.Эрш. Філязофскае здумленьне.	30.000	12.000
15	Ш.Дэбаш. Уводзіны ў палітыку.	30000	16.000
16	К.Рын. Дэмакратыя і этычнае жыцьцё.	25.000	10.000
17	Дж.Бэрдшоў. Эканоміка. Ч1: Мікраэканоміка. Дапаможнік для студэнтаў.	45.000	20.000
19	Фрагмэнты (філязофіі, культуралёгіі, літаратуры) №2(97)	40.000	20.000
20	Крыўя. №1, 1994	45.000	12.000
21	Крыўя. №1, 1996	55.000	12.000
22	В.Кіпель. Беларусы ў ЗША.	15.000	16.000
23	М.Грыгор'еў. Войска ВКЛ ад Сасаў да Касьцюшкі.	20.000	10.000
24	Т.Сапач. Восень.	10.000	6.000
25	А.Глёбус. Толькі не гавары маёй маме.	30.000	16.000
26	А.Глёбус. Скрыжаваньне.	10.000	6.000
27	Э.Сміт. Нацыяналізм у дваццатым стагодзьдзі.	15.000	12.000
28	Беларускі вайсковы строй і зброя.	20.000	6.000
29	Беларускі рок-н-рол.	10.000	6.000
30	П.Бэрк. Рэнэсанс.	25.000	12.000
31	Ю.Штайнэр. Эўрапейскія дэмакратыі.	25.000	20.000
32	Е.Тэрборн. Эўропа сёньня і заўтра(1945-2000).	32.000	16.000
33	А.Дэні. Гісторыя эканамічнай думкі.	70.000	24.000
34	Я.Найдзюк. Беларусь учора і сёньня.	30.000	12.000
35	В.Гапоненка. Іван Яркоўскі. У пошуках гармоніі сусьвету.	10.000	6.000
36	А.Ятусевіч. Слоўнік зоапаразіталагічных тэрмінаў.	20.000	10.000
37	Ніл Гілевіч. Любоў прасьветлая.	35.000	12.000
38	С.Станкевіч. Русіфікацыя беларускае мовы ў БССР і супраціў русіфікацыйнаму працэсу.	10.000	6.000
39	Г.Сяржаніна. Беларуская навуковая тэрміналёгія. Біялёгія.	10.000	10.000
40	Ніл Гілевіч. Талісман.	15.000	10.000
41	Я.Станкевіч. Маленькі МАСКОЎСКА-БЕЛАРУСКІ слоўнік ак.	10.000	6.000
42	Л.Мірачыцкі. Сьветлым ценем Адама Міцкевіча.	10.000	6.000
43	Рэформа беларускага правапісу 1933 года.	6.000	6.000
44	Тэрміналягічны СЛОЎНІК па вышэйшай матэматыцы для ВНУ.	20.000	10.000
45	Ул.Арлоў. Адкуль наш род.	85.000	15.000
46	Я.Запруднік. Беларусь на гістарычных скрыжаваньнях.	55.000	16.000
47	Новы Запавет.	65.000	16.000
48	Каралеўства Беларусь: Посткаляніяльная культура.	105.000	15.000
49	А Лукашук.«За кіпучай чэкісцкай работай»	50.000	12.000

ДЗІЦЯЧАЯ КНІГА

№	Аўтар і назва	кошт	кошт перасылкі
1	Кася ў школцы.	9.000	14.000
2	Шарль Пэро. Чарадзейныя казкі.	20.000	26.000
3	Лагодны Цмок.	15.000	21.000
4	Гарасьо Кірога. Казкі трапічнага лесу.	15.000	21.000
5	Графіня дэ Сэгюр. Зачараваная хатка.	20.000	26.000
6	Марві Яла. Дзівосная Ноч.	15.000	21.000

КАСЭТЫ – ПОШТАЙ

На складзе БГФ "Наша Ніва" ёсьць касэты (кошт 40.000 + 7.000 БРБ)

Ален. Нармалёк (1995)
Ален. Нармалёк 2 альбо Мафія (1996)
Вольга Акуліч.Трохкутнік
Вальжына Цярэшчанка (1991-1995)
Беларускія народныя казкі
Музычныя казкі (1996)
Бонда. Найлепшыя песьні
Данчык. Я ад вас далёка. Мы адной табе належым
Данчык. Мы яшчэ сустрэнемся.
Новае неба. Дзеці чорнага гораду (1991)
Новае неба. Сон у трамваі (1994)
Новае неба. Go home (1995)
Новае неба. Мая краіна (1996)
Крама. Хворы на рок-н-рол (1993)
Крама. Гэй, там, налівай! (1994)
Крама. Камэндант (1995)
Крама. Лепшыя песьні (1993-1995)
Мроя. Найлепшыя песьні з праграмаў 1988-1990
NRM. LaLaLaLa (1995.)
NRM. Одзірыдзідзіна (1996)
Беларуская музычная літаратура (т.1-4)
Залаты фонд Беларускага рок-н-ролу (т.1-5) т.1. Бонда. Уліс. Рэй. Мясцовы час. Блізьняты (1986-1990) т.2. Бонда. Уліс. Мроя. Крама. Новае неба. Мясцовы час. Тутэйшыя хлопцы (1990-1993) т.3. Золотая середина. Отражение. Алексей Шедько & Доктор Моро. Гранит. Метро. Сузор'е. Зартипо (1986-1991) т.4. Палац. Уліс. Крама. Новае неба. Мроя (1992-1994) т.5. Зиндан. Why Not. Отражение. Инспектор. Торнадо. Флэт (1992-1994)
Рок па вакацыях-96 (НРМ. Уліс. Флэт. Торнадо. Крама. Рублёвая зона. Новае неба. А.Шадзько і А.Юшын)
Будзьце аптымістамі, рабіце дзетак (Новае неба. Ляпис Трубецкой. НРМ. Палац, 1996)
Беларускі джаз т.1. Рэнэсанс т.2. Ігар Сафонаў т.3. Яблычная гарбата. Пчаліны танец.
Беларуская гітарная музыка (1996)
Беларуская сымфанічная музыка (1996)
Яўген Паплаўскі. Творы (1996)
Лепшыя музычна-драматычныя творы радыёстанцыі «Беларуская маладзёжная» т.1. Чалавек, якому хацелася ўсяго (памяці Ф.Мэркуры) т.2. Лесьвіца ў нябёсы (фантазія па матывах Лед Зэпэлін, Робэрта Планта і Рычарда Баха) т.3. Танец поўні (прагулка са Стынгам)
Андрэй Мельнікаў. Успамін (1994-1995)
Андрэй Мельнікаў. Салам Саўкам (1993)
Андрэй Мельнікаў. Песьні выгнаньня (1991-1993)
Андрэй Мельнікаў. Камяні майго вогнішча (1994-1995)
Андрэй Мельнікаў. Да апошняга камісара (1995-1996)
Андрэй Мельнікаў. Гэта мы (1996)
Андрэй Мельнікаў. Шлях. 2 часткі (1996)
Уліс. Краіна доўгай белай хмары (1990)
Уліс. Чужаніца (1991)
Уліс. Танцы на даху (1993)
Уліс. Life-96
Уліс. Блуканьне (1996)
Мясцовы час. Наша ўскраіна (1991)
Віктар Шалкевіч. Смутны беларускі блюз (1996)
Палац (1995)
Песьні беларускіх бардаў (1992)
Рок супраць рэвалюцыяў (Новае неба. Зіндан. Уліс. Мроя. Крама, 1994)
Маладзёжныя хрысьціянскія сьпевы. Прыйдзі і праслаўляй (1996)
Ліцьвіны. Неба і зямля (1994)
Ліцьвіны. Пятае сакавіка (1996)
Зьміцер Бартосік. Да пабачэньня... (1996)
Уладзімер Клімовіч. Дзеці вятроў (1997)
Камэлот. У краіне талераў. (1995)
Эдуард Акулін. Мая Крывія. (1996)
Неруш (1997)
Ігар Палівода. «Максім» (1997
Новае неба. Выбранае. Песьні з альбомаў 1990-1996 г.
Уліс. Ратуйце вашыя душы. Песьні з альбомаў 1996 г.
NRM. Made in NRM. Песьні з альбомаў 1995-1996
KRIWI - праект фольк-мадэрн студыі «Палац»
Купалінка - Kupalinka. Folk-group.
Ліцьвіны. Галуб на чарэшні.
Песьнярок. Песьні «Песьняроў» у выкананьні «Крамы», NRM, «Троіцы», «Тарнада», «Пані Хіды», «Ляпис Трубецкого», «Нейродюбеля», Валіка Грышко.
Белы сон (Беласток, 1997)
Харошкі. Полацкі сшытак, традыцыйная музыка (1997)
Жыгімонт Ваза. Стан Галюцынацыі
Марыя Скуратовіч. Табе, Хрысьце!
Песьнярок. CD (170.000)
Кардон. Радыяцыя
Мроя. Дваццаць восьмая зорка
Небясьпечная Зона (Exhumator, Sarcastic Green, Barfly's Dreams, Gernunnos, God's Tower ды інш.)

КОШТ КАСЭТАЎ 43.000 + 7.000 ПОШТА

Gods Tower. The Eerie.
Gods Tower. Canticles.
Plastic Hardcore. Ultra.
Chemical Warfare. Demolition Tape.
Headcleaner. Hash. Hash. Resistance.
Insania Trivium. Candle of Fire.

Касэты можна замовіць праз пошту: 220085 Менск, а/с 5, Віталь Супрановіч

НАВІНКА!

Самсон Пярловіч. Чарадзейны агонь. — Навагрadак, 1997. — 309 с. — 500 ас.

Інфармацыю пра выхад гэтае кнігі даслаў нам аўтар «Шуфляды» сп. Кастусь Рамановіч. Вось як ён пракамэнтаваў кнігу:

«Шмат зь вершаў, надрукаваных у гэтай кнізе, дапамагаў Пярловічу ў лягерох ГУЛАГу захоўваць і я, запісваючы іх агрызкам алоўка на дошчачцы драўлянай. Вывучваў іх на памяць, а потым з дошчачцы саскрэбваў шкельцам, каб запісаць на ёй наступны верш. Дошчачку, агрызак алоўка й шкельца старанна хавалі ад «шмону». У гэтай кнізе мастацкай прозай напісаны Пярловічам успамін пра вываз у Сібір кулакоў — апавяданьне «Да белых медзьвядзёў». У паэме «Адам Чабоцька — слаўны Друг» — успамін пра вываз Самсона й Адама ў нямецкі лягер, а пазьней — у савецкі, дзе і я разам зь імі быў».

Умовы атрыманьня кнігі:

Трэба даслаць на адрас сп. Пярловіча 70.000 руб. (50.000 — кошт выданьня, 20.000 — кошт перасылкі), а на квітанцыі напісаць свой дакладны адрас.

Пярловіч Самсон Георгіевіч
Навагрadак 231400, вул. Менская, дом 29.

БЕЛАРУСКІЯ МУЗЫЧНЫЯ НАВІНКІ:

Narodny albom. Супольны музычны праект. — Каўчэг, 1997.

НАВІНКА !



Вінцэнт Якуб Дунін-Марцінкевіч: Жыццё і творчасьць / Аўтар-склад. У.Содаль; Мастак В.Сташчанюк. — Менск: Народная асьвета, 1997. — 104 с.: іл. — Наклад 3.000 ас. ISBN 985-03-0066-3

Гэтая кніга вяртае нас у Вільню, у шляхецкія засьценкі. Вяртае да генэалёгіі сучаснай беларускай літаратуры.

Каралеўства Беларусь

У сыстэму кнігараспаўсюджаньня паступае каталёг мастацкае акцыі «Каралеўства Беларусь: Посткаляніяльная культура». У рэпрадукцыях і тэкстах праз кансэрватыўнае мысьленьне, але авангардныя формы рэпрэзэнтаваная сучасная беларуская культура. Цікавая ўжо не залежна ад рэжыму.

Умовы падпіскі — у блёку «Кніга — поштай» (пазыцыя № 48).

Новыя кнігі, дасланыя у рэдакцыю

Беларуская мова ў табліцах і схемах: Вуч. дапаможнік для вучняў ст.клясаў сярэд. школы / Т.Валочка, Я.Лаўрэль, В.Красьней і інш. — Менск: «Паліграфмаркет», 1997. — 188 с. — Наклад 10.000 ас. ISBN 985-6359-05-8

Вінцэнт Якуб Дунін-Марцінкевіч: Жыцьцё і творчасьць / Аўтар-склад. У.Содаль; Мастак В.Сташчанюк. — Менск: Народная асьвета, 1997. —104 с.: іл. — Наклад 3.000 ас. ISBN 985-03-0066-3

Вішнеўскі А., Саракавік І. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: Некаторыя пытаньні і адказы. — Менск: ЗАТ «Веды», 1997. —108 с. — Наклад 2.000 ас. ISBN 985-6390-22-2

Іванова С., Іваноў Я. Слоўнік беларускіх прыказак, прымавак і крылатых выразаў: Лінгвакраіназнаўчы дапаможнік. — Менск: Бел. Фонд Сораса, 1997. — 262 с.— (Праграма «Абнаўленьне гуманітарнай адукацыі ў Беларусі»). ISBN 985-440-003-4

Панізьнік Сяргей (Папар). Сустрэча родпасных сусьветаў. — Менск: ННАЦ імя Ф.Скарыны, 1997. — 164 с. — (Сэрыя «Ад сэрца да сэрца»). — Наклад 500 ас. ISBN 985-6419-03-4

Фальклёр у запісах Яна Чачота і братоў Тышкевічаў / Уклад., сыстэм.тэкстаў і камэнтары В.Скідана і А.Хрушчовай, уступ. артыкул Т.Валодзінай; Рэдкал.: А.Фядосік (гал. рэд.) і інш. —Менск: Беларуская навука, 1997. — 342 с. — (БНТ: Беларуская нар. творчасьць / НАН Беларусі. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклёру). — Наклад 1.000 ас. ISBN 985-08-0050-X

История Беларуси: Учебн. пособие / Е.Абэцэдарская, П.Брыгадзін, Л.Жылуновіч і інш.; пад рэд. А.Кахаиоўскага і інш. — Менск: «Экоперспектива», 1997. — 319 с. — Наклад 7.000 ас. ISBN 985-6102-06-5

Наумова С. Что надо знать о политике: Дапаможнік для вучняў сярэдніх школ. — Менск. Беларускі фонд Сораса: «Армита-Маркетинг, Менеджмент», 1997. — 350 с. — Наклад 5.000 ас. ISBN 985-6320-13-5

Сакович В. Белорусское село в 70-90-е годы: миграция населения, трудовые ресурсы. — Менск: выд. В.Саковіч, 1997. — 170 с. — Наклад 1.000 ас. ISBN 985-6283-02-7

Тур А. Основы западной теории рыночной экономики. — Менск: Мисанта, 1997. — 75 с. — Наклад 3.000 ас. ISBN 5-7830-0323-9

Шутова О. Психоистория: школа и методы: Учеб. пособие / Под ред. В.Сидорцова. — Менск: ЗАТ «Веды», 1997. — 176 с. — Наклад 1.000 ас. ISBN 985-6390-20-6

грамафон.

Андрэй Аляксандраў

...

... Хацеў я спапяліць сваю нянавісьць
у полымі ўзыходзячага сонца,
але ж па новаму вышэйшаму загаду
ўсіх сонцаў узыходы адмянілі.

Хачу любіць...
Ды ці ж магчыма гэта
у цемры ды зь нянавісьцю у сэрцы?

Аляксандар Антончык

ШАКАЛ

Ледзь дайшла да закінутай хаты,
Згаладалася тошчая сука,
Усёй здабычай якой былі стома
І ад болю ў нагах зьбітых мука.

З закутка шчанючок сьлепаваты
Да яе зь віскам лез зноў і зноў,
Каб смактаць з малаком чуць ідучым
І пунсовую цёплую кроў.

Калі ж вострыя зубы малечы
Як нажы упіваліся ў цела,
Ад адчаю і моцнага болю
Выцьце ў неба глухое ляцела.

Прайшла восень, зіма прамільгнула,
Стаў шчанюк гадавалым сабакам,
Навучыўшыся зайцаў высочваць
Лавіць птушак за згнілым баракам.

Раз у восеньску ночку глухую,
Калі спаў ён у каноплях кудлатых,
Зграя шэрых ваўкоў згаладнелых
Падкралася ціхенька да хаты.

Аднагодак пачуў зьвера першым,
Але з страху ня ўзьняў нават лаю,
І павёў да заснулай матулі
Праз разьбітыя дзьверы ўсю зграю.

Не пасьпела старая прачнуцца,
І ускочыць на хворыя ногі,
Як важак яе, сьцяўшы за горла,
Прытуліў да збуцьвелай падлогі.

Пакуль з жаху спацелы сын сучы
У падпечку скуголіў, хаваўся,
Воўчы вывадак, зручна расьсеўшыся,
Сьвежым мясам, крывёй харчаваўся.

Ваўкі, згрызшы апошнія косткі
Аднагодка з падпечка дасталі,
Але ўнюхаўшы псіну сьмярдзючу,
Адышлі ў бок, зьбянтэжана сталі.

Важак глянуў з халоднай пагардай
На сабакі халуйскі выскал
І чыркнуў грозна, іклы паказаўшы:
Пайшоў прэч адсюль, гнюсны шакал.

Кастусь Атрашэўскі

Соні Астр.

Не сумуй, калі я не вярнуся
(закалыша ў сумётах зіма...),
толькі знай — без Цябе й Беларусі
мне жыцьця не было і няма.

Ні дакараў, ні крыўдаў ня маю,
суцяшэньня сабе не прашу.
Як калісь, як ніхто абдымаю,
золь астылую не варушу.

Праз палі-перакаты завея
за лясок паклубіла нямы —
скуль хусьцінкі ражок ружавее
той далёкай, гарачай зімы...

....

Калі роспач увечары-раньні
раптам спазмы сьлязой апячэ, —
прыгадай заклінаньне-пытаньне:
Хто яшчэ? Хто яшчэ? Хто яшчэ?..

Тацяна Будовіч

...

Ноч. Каляды. Неўгамонна
Кліча поўня варажыць.
Не сьпяшайся, падарожны,
Як завуць цябе, скажы.

Параўняйся ты са мною.
У вачах — халодны сьмех.
Што за дзіва? За табою —
Некрануты роўны сьнег.

Сяргей Герасімаў

. . .

Сьцюдзёныя вочы навокал, навокал.
Згубўся той хлопча, што быў камэлотам,
Што марыў аб нейкім, аб нечым, аб любай.
Не дачакаўся яе, той галубы...
Альбо загубіў у ранейшым
Жыцьці ідэал свой вышэйшы.
Яна зараз з тоўстым,
З тлушчом дзеліць ложак,
З каханым прахвостам,
З каханым заможным.
А дзе быў той хлопча?
Ён вершы пісаў, лётаў у сьне,
Ён марыў, а яна была побач...
І вынік — жыцьцё безь яе.

Сьцюдзёныя вочы навокал, навокал.
Жыцьцё ў хлапца аднавілася потым...

Аўдзей Дабрадзей

ХТО ШТО ПІША І КУДЫ НЯСЕ...

У першацьветаўцаў закон:
замудры твор — у «Грамафон»;
узьнёсла-звонкі — для «Чырвонкі»;
слабы — на чытку ў «Літаратар»,
бо не паэт пісаў — аматар...
Калі ж да верша чарка ёсьць —
наведаць можна «Маладосьць»:
там хлопцы цёртыя сядзяць,
адно сівухаю сьмярдзяць...
Зрэдзьчасу балуе нас ЛіМ —
гады па два ў чарзе стаім.
Абы хоць неяк адчапіцца —
«Я маю твор...» дае «Крыніца».
Ёсьць «Беларусь» — гігант рэкламы,
выданьне татава — для мамы...
А дзетак іх — пасе «Вясёлка»:
малым ні мулка там, ні колка.
«Бярозка» на вачах буцьвее —
без ганарараў мудрасьць сее.
У «Нёман» кінецца не ўсякі,
бо там друкуюцца пісакі,
якіх Расея не прызнала,
а Беларусь даўно сьпісала...
На «Полымя» глядзець сумотна —
часопіс пахудзеў сухотна:
быў флагманам літаратуры,
а стаў абрыўкам нацкультуры.
Далі часопісу пад дых —
яму ўжо не да маладых...

Шануйма ж «Першацьвет», сябры,
Айчыны вольнай ваяры!

Зьмітрук Зданьнё

Я ГЛЯДЖУ Ў НЕБА

У мяккую траву кладуся
Ды гляджу, гляджу я ў Неба.
Больш нічога мне ня трэба;
Я гляджу ды бачу Неба.
(Безь людзей я абыдуся)
Мне патрэбна адно Неба.

Я — часьцінка тога мроства?,
Што самотнае, ляное,
Нібы лёдзіва вясною,
Зь ціхай рэчкаю лясною
У нябыт сьцякае ройна...
Ды нясе мяне з сабою.

Я — Вар'ят, я крылы маю,
Я — Ліцьвін, я — сын Сварога;
Ды нябачная дарога
Занясе да Першабога
Праз вароты Пекла й Раю,
да Сусьветнага Парога.

Я ляжу, на час забыўшы,
Ды гляджу сабе ў аблокі.
Усё плывуць яны далёка...
Я ляжу, пакуль у змроку,
Неба коўдраю засьціўшы,
Княжыч пусьціцца ў скокі...

Яўхім Корчак

ВЕРШНІК

Вершнік меч апусьціў,
Запаволіў каня,
Выцер кропелькі поту на твары.
Досі ўжо ваявацъ...
Колькі ўсюль груганьня!
Хай пакуль што
Груган паўладарыць.

І пусьціў ён каня
на мурог ля ракі,
Лом расклаў на высокім абрыве.
І ўглядаўся у плынь,
дзе сталодзьдзі плылі,
Дзе мільгалі надзеі былыя.

І спускалася ноч
над радзімай зямлёй,
Станавілася ўсё, як чужое.
Балявала ўначы
груганьне над крывёй,
Што струменіла з ранаў герояў.

А назаўтра, калі
першы сонца прамень
зазірнуў на раку — ля абрыву
конь у збруі стаяў,
вершнік меч падымаў,
Вусны ціха шапталі малітву...

Ігар Максімаў

Я ЖЫВУ...

Я жыву на гэтай зямлі,
Дзе балоты, лясы і палі.
Дзе блакітныя рэкі, азёры,
Дзе аблогі, ставы і разоры.

Дзе дзяржаўнасьці траха няма,
І пануе спрадвеку мана.
Дзе ў турмы садзяць паэтаў,
Дзе ўсё меней праўдзівых газэтаў.

Я жыву на гэтай зямлі,
Дзе існуюць яшчэ змагары.
Гэта значыць, шчэ будзе змаганьне,
Ды і скончыцца ўрэшце блуканьне.

Выйду я на шырокі абсяг,
Замацую на коміне сьцяг.
Агарну паглядам краіну,
За якую, магчыма, загіну.

У барацьбе з той нячыстаю сілай,
Што навісла над нашай Радзімай.
Я жыву на гэтай зямлі,
Дзе балоты, лясы і палі.

Ю.Максіменка

...

Храмаў
пальцы
вузлаватыя
паказваюць
на Нябёсы —
Айчына
наша
спрадвечная
знаходзіцца
там
менавіта!

...

Схілілася
дрэва
па-над безданьню...
Зямное —
вось яно.
А дзе ж
нябеснае?

Алесь Менскі

ЭКСПЭРЫМЭНДУМ

Тое, што рэчы
Вусьцішныя надта
Часам здараюцца
Ў нашым калгасе,

Ведама ўсім.
Але тое, што неяк
Тут адбылося —
І ўспамятаць страшна.

Вёсачка наша
Чырвоныя Зоры
(Вострыя Косы,
Чытай па-старому)

Назву сваю
Колісь, бач, атрымала
Ў гонар камуны,
Што гэтуль паўстала.

Маем цяпер мы
Сваю птушкафэрму —
Ґусак разводзім,
Індык часам родзіць.

Справы, бадай што,
Ішлі і няблага,
Покуль ня зьдзейсьнілі
Экспэрымэндум.

Нейкія яйкі
З самое сталіцы
Ў чорнае «Волзе»
Прывезьлі ў калгас наш.

Птушачкі бедныя
Гэтую трасцу
Месяц выседжвалі,
Грэлі, бы дзетак.

Першы праклюнуўся.
Шэры якісьці,
Крыльцамі ледзьве,
Бы ў сьне, целяпае.

Гэта б нічога,
Ды ён — двухгаловы!
Дзюбы разявіў,
Пішчыць, есьці хоча.

Думалі, можа
Мутант нарадзіўся —
Тут жа Чарнобыль,
Бы яблык пад плотам.

Бачыш, аж іншыя
Лупяцца зь яек.
Усе, як адзін
З галавой дадатковай.

Лётае зараз
Над нашаю вёскай
Зграя тых птахаў,
Бы здані ці цмокі.

Птушак калгасных
Даўно пахапалі,
Зжэрлі худобу,
Ды вокам драпежным

Ўжо на людзей
Паглядаюць нахабна.
І не пазбавіцца іх,
Не пазбыцца —

Вось напаткала
Навала якая!
З доўгіх часоў
Я хаваў на гарышчы

Дзеда свайго
Васіля дубальтоўку.
Думаў, вазьму яе,
Змажу алеем

І паляцяць
Пёркі з гэтае хеўры.
Сьвежаю газай
Я лямпу запраўлю

І на гарышча
З надзеямі ўзьняўся.
Ды адшукаў я
Замест сваёй зброі

Грудку іржы
ды прыклад спарахнелы.

Янка Нарачанскі

ПАЛЕСКІЯ КЛЁНЫ

Лістапад позьняй восені:
Дрэвы вакол у задуменьні,
Раскідзістыя верхавіны,
Нерухомая, бы ў памкненьні.

Строй нацягнуць галіны,
Бы тонкія пальцы ля неба,
І так пазіраюць гадзіны
У вышыню — зь вязкае глебы.

Чаму ж яны ў смутку?
Журботныя, як сіроты.
Ня могуць знайсьці паратунку,
І не пазбыцца ім ад маркоты.

Калі ж уважліва гляну,
На іх ствалы да кронаў —
Там нібы нейкія гнёзды
Павесілі на гэтыя клёны.

Не, гэта ня птушак хаты,
А радыяцыі раны жахлівы.
Язвамі дрэвы спавіты —
Для ўсіх істот палахлівы.

А можа, яны закляцьці
Шлюць гаротныя клёны.
За ўсё зь людзей спагнаць,
Усяму чалавецтву — праклёны.

Божа! Прабач нас
За гэта жахлівае гора,
Абарані, Ісус Спасе,
Ад радыяцыі страшных мораў.

Цягнуць клёны галінкі,
І трымцяць на лёгкім ветры,
Чалавечых душаў былінкі,
Што лятаюць вакол у паветры.

Я ціха стаў на калені,
І зьвярнуўся прад імі да Бога:
«Прабачце мне, дарагія,
Не магу зрабіць я нічога».

Буду толькі малітвы
Стварацъ у свім сэрцы,
Каб яны да Бога пранікалі,
Каб нам усім не памерці.

На прыроды палескім улоньні,
З узьнятымі так рукамі,
Я стаяў, пакуль на далоні,
Адчуў клёнаў адказ — лістамі.

Яны леглі пяшчотна, лагодна,
Акурат на мае далоні,
І мне болей стала спакойна
На маім зацятым сумленьні.

Дзякуй вам, родныя клёны,
За гэтыя залатыя лісьцінкі,
Каб цешылі вока гоні,
Каб менш тут былі памінкі.

Прытуліўшы лісьцінкі да сэрца,
Моцна сьціснуўшы далонь,
Я б хацеў бы зь імі зжыцца,
Каб сьпыніць у душы Чарнобыльскі звон.

Ігар Пракаповіч

...

Сьлі, прырода... Яшчэ рана
Адмыкаць лядовы панцыр.
Сонца моцы не набрала,
Каб узьняць пратубэранцы.

Яшчэ дрэвы сьпяць салодка,
Мрояць летнія ўбраньні.
Рыбакова дрэмле лодка,
Вёслы сушацца ля лазьні.

Дый і сам рыбак ля печы
Нерат новы абшывае.
Жмурыць вочы раньні вечар,
Рыбаку дабра жадае.

А на небе — месяц, зоры.
А ля хаты — холад, вея.
У жыцьці, дзе многа гора,
Есьць маленькая надзея.

Што над панцырам лядовым
Веснавое сэрца б'ецца...
... Можа ў некім гэта слова
Сьветлым рэхам адаб'ецца...

Браніслаў Пяткевіч

ПАМЯЦЬ

Добрым словам памянём
Тых, хто жыў для нас,
Абрабляў зямлю канём
І стварaў свой час.
І каго разбурыў штык,
Выпіў кроў вампір,
Хто спаткаў са сьмерцю стык,
Каб жыла Сібір.
Хто з жыцьця навечна зьнік
Невядома дзе,
На касьцях чыіх пікнік
Сатана вядзе.
Тлум спраўляе вараньнё,
Выюць воўк, шакал,
Нескончаны ноччу, днём
Ветра дзікі шал.
А ля печкі ў цяпле
Засядзеўся той,
Хто ў сталінскім катле
Тоўк сваёй пятой.

Руслан Равяка

...

Па вуліцах несьліся вершнікі,
на шаблях сваіх яны несьлі сьмерць,
Сьмерць упіралася, але была слабейшаю,
Шаблі былі гострыя і яе цела балела.
Яна зараўла немым голасам,
Але людзі, акрамя некалькіх нямых, ня чулі яе,
бо не разумелі.
Разумных у гэтым мястэчку было малавата.

Заўважыў яе толькі гаспадар крамы,
Яго шалі паказалі 33 кілі.
Але доктара, каб выразаць,
нават адну кілю, у горадзе не знайшлося.

Раптоўна сьмерць вырвалася і кінулася на волю.
Жонка гаспадара крамы, Вольга, пасьпела адскочыць,
І заскакала ад сьцэнкі да сьцэнкі
Сьмерць шмыгнула да дзьвярэй
і засмаркала іх гэдак, што выклікала ва ўсіх агіду.
Але Агіда, зьявіўшаяся на выклік, засумавала і сышла.
Сьмерць учапілася ззаду яе. Яна была лезьбіянкаю.

Лакчыся так, што мясцовыя сабакі прынялі іх за сваіх,
вершнікі справілі пагоню за ўцякачкаю,
справіўшы спачатку патрэбу.

Ня трацце надзею, што некалі яе знойдуць.
Але памяць мая ўжо патрацілася — з чаго гэта я пачынаў?..
Зь вершнікаў? А, вершнік — гэта чалавек,
які піша вершы...

Станчык

САЮЗНЫЯ КАЛЯДЫ

Ня сьпіць масклаь. За вокнамі — марозы.
Жахлівы купал, мацяршчына, брэх.
Здаецца, сьнежань вычарпаў пагрозы,
Чакай New Year, суцісься, чалавек...

Якія заўтра ранкам будуць сьнегі,
Як сонца будзе грацъ на люстрах стрэх!
Мажліва адпачыць. Да ВОЛЬНАЙ НЕГИ
Накіраваць ЗАДОР МЛАДЫХ УТЕХ...

Ня сьпіць масклаь. Ўжо пачынаюць лыпаць вачыма
Апошнія аўто, і за мастом
Чуваць як банды лупяць ИЗ «МАКСИМА»
І напаўняюць вуліцы сьвінцом.

Ня сьпіць і БЕЛАРУС. Жуе паперу.
Плюецца. Вочы збочыў НАБЕКРЕНЬ.
Ён заўтра прачытае пра халеру
У Краснадары. І наступіць дзень.

Ён не стаміўся дыхаць валаннамі,
Чуць пра УСПЕХИ ў вырабе тканін.
А што ж ты скажаш? Працы нам хапае,
І ўсё-ж працуем на агульны млын!

Падымем хутка файну гаспадарку,
Уробім фонды, трактары, газпро...
Якой там хрэн — пад тым ці іншым сьцягам?
Якога хрэна — ў вочы ці дупло?

І ўвечары, калі ў Маскве страляюць,
Калі масклаь, спалоханы, ня сьпіць,
Пан БЕЛАРУС ЗВЁЗД С НЕБА НЕ ХВАТАЕТ —
Ён СВЯТО ВЕРИТ і зязюлю сьніць.

А тая ўва сьне ня рве спакусы,
Гады ня лічыць. Стаўка — на нулі.
Праз 50 тут будуць — маскалі.
Праз сто гадоў усе стануць — БЕЛАРУСЫ.

Гандрусь Стрэмка

...

Заціхаюць песьні, замярзаюць словы,
І сьцюдзёны вецер над зямлёю дзьме.
І зімы халоднай чорныя аковы
Заціскаюць душу маладую мне.

Заціхаюць думкі, замярзаюць сэрцы,
Чыстую крынічку моцны лёд скаваў...
Можа, майму краю суджана памерці,
Бо дарогу Праўды сьнег Хлусьні схаваў?..

Веру я: час прыйдзе, і зямля адтае,
Выйдзе з-пад улады ледзяной цішы.
І прачнецца край мой — гучна засьпявае
Веснавыя песьні маладой душы.

Давыд Сьцізорык

ЧОРНАЯ ПТУШКА

У сьлякотным паветры
Плыве, нібы хмара,
Чорная Птушка
З жудасным тварам.

І сьпіць, як цень, Горкі крык
На далонях у Нацыі:
«Трэба прачнуцца!
Трэба змагацца!»

У сьлякотным паветры
На вецер сумны і шэры
Кладуцца Роспач і Смага
Аркушамі паперы.

Тацяна Ульянычава

НОЧ

Гром грыміць,
І маланка зіхціць,
Сэрца і душа
У кутку ляжыць.
Пройдзе ўсё —
І мы з даждджом
У цёплай лужыцы засьнём.

...

Цемра. Усе ўжо сьпяць.
Толькі зорачкі зіхцяць...
Загрымела і зазьзяла,
Маланка грымнула
І неба наўскасяк парвала.
Людзі ўсё жыцьцё ілгуць,
Гракі спаць мне не даюць.
«Гэта наша пакараньне?» —
Задаюць сабе пытаньне.
Доўга Бог нас усіх пужаў,
Але дождж страх разагнаў.

Юры Чарнякевіч

СЬМЕРЦЬ ГРАФАМАНА

Нянавісьць
да знаёмага алоўка,
Якім пішу нязбытныя малітвы
(Бо ведаю: папера не адмовіць
І зноў прайграе векавую бітву)
Вялікая.
Хоць кроў і застанецца
На аркушы бялюткім без сумненьня,
У вершы...
Памяць сэрцабіцьця ў вершы
Ледзь бачна мільганулага імгненьня.

Аліса Чаротка

ПЕРШАЯ КОНЬНІЦА

Мы — першая коньніца роднай зямлі,
Адважных ваякаў грамада.
Ярылы сьвятыя мячы ўзьнялі —
Мы — процi варожае здрады!

Імкнемся мы к сонцу ў віхурнасьць прыгод —
Кіпіць кроў юнацкая ў сэрцы:
Хай згіне за прышласьць Крывіцкі народ,
Ды годзе ўжо жыць у паняверцы!

Мы ветрам праймчымся, прасторам палёў,
Растопчам у пыл перашкоды,
Ускрэсім старыя паданьні дзядоў,
Сьцяг высака ўзьнімем свабоды.

Разбудзім ад сну векавога братоў:
Ці чуеце кліч, Крывічане?
Скідайце жа путы цяжкіх ланцугоў,
Наперад усе — да змаганьня!

З кайданаў някволі мячы адкуем,
Мячы гартаванае сталі,
Іх вольнай рукою увысь узьнясем,
На конях паймчымся ў далеч.

Гэй, коні бадзёрыя, імкнеце ж у даль
Дарогаю князя Ўсяслава!
Ужо Полацка слаўнага брамы відаць
У смузе белявай туманаў.

Ад Полацку к Менску паедзем хутчэй
К Нямізе. Там рынем у сечу.
Там ворагаў зломім, прагонім далей
І гулка зазвонім у веча:

Зьбірайся на сход, сакаліна сям'я,
На высьнены сход аб'яднаньня!
Збудуецца прышлая доля твая
Пад знакам адвагі й змаганьня!

І сьціплы калісьці Крывіцкі народ
У магутнасьці ўстане бязьмежнай,
І Зьніч сьвяты ўспыхне зь пяруноў грымот,
І будзе наш край незалежны.

А.Шадрын

...

Мілая, цудоўная — я цябе спаткаў,
Гэта, ўрэшце, спраўдзіліся мроі дзён маіх,
Па зямных бязьмежнасьцях — марна я шукаў
Позірку натхнёнага, што ў вачах тваіх.

Я знайшоў агеньчыкаў праменістасьць у іх,
Ветрыку пяшчотнага подых веснавы,
І ласкавасьць сонейка — ўсё ж у вачах тваіх,
І чароўнасьць кветачкі зграбнай між травы.

Мілая, адзіная — мне ня хопіць слоў,
Каб дакладна выказаць веліч пачуцьця,
Што зьнячэўку ўзьнікла з патаемных сноў,
Стаўшы ўраз бясконцасьцяй, музыкай жыцьця.

Мілая, чароўная — будзь заўжды са мной,
Стань маёю красачкай пасярод зімы,
Узьнясіся, любая, сэрцам і душой
У дзіўны сьвет, дзе ў Вечнасьці — разам будзем мы.

Алёна Шарэпа-Лапіцкая

...

Ой, выйду я, выйду на бераг марскі,
Як толькі у небе заіграе зарніца,

Дзе на узьбярэжжы іскрацца
Залатыя пяскі, —
Там на блакітныя хвалі
Стану маліцца.

І яшчэ папрашу, каб яны Нэптуна
Угаварылі мяне ўзяць Русалкай,

Я тады з мора глыбокага дна
Пэрлы вылаўлю і зраблюся Вэсталкай...

Сымон Шаўцоў

У АЛЬБОМ СЫНУ

Жадаю табе, сынку,
Доўга жыць.
Ніколі не тужыць,
Ніколі не хварэць,
Многа дзетак прыжыць,
Унукаў прыдбаць і жаніць.
Праўнукаў прычакаць,
На іх вясельлі гуляць,
Прапраўнукаў вітаць
І ўсім сакрэт сказаць:
– Сумленна трэба жыць,
Беларусь сваю любіць,
З народам дружна быць,
Працаваць сумленна трэба,
Каб мець удосталь хлеба,
Незалежным быць ні ад кога,
Толькі залежным ад Пана Бога.

ІВАН АНТАНОВІЧ — АБ ЦЫВІЛІЗАЦЫІ

Антонович И. После современности: Очерк цивилизации модернизма и постмодернизма.- Менск: Беларуская навука, 1997. - 446 с.

Неяк здарылася так, што прыкладна адначасна (з інтэрвалам у які месяц) на нашым кніжным рынку зьявіліся дзьве кніжкі, вельмі тэматычна блізкія, бо абедзьве прысьвечаныя лёсу эўрапейскай цывілізацыі. Першая — упершыню перакладзеная на замежную (на беларускую!) мову праца вядомага швэдзкага сацыёляга Ёрана Тэрнбарна «Эўропа сёньня і заўтра (Эўрапейская мадэрнасьць і далейшасьць: траекторыі эўрапейскіх грамадзтваў 1945-2000)». Другая — аўтара — у нас, прынамсі — значна лепш вядомага, цяперашняга міністра замежных справаў Івана Антановіча «После современности: Очерк цивилизации модернизма и постмодернизма». Так што можна лічыць, беларускаму чытачу пашэнціла: ён атрымаў магчымасць азнаёміцца зь дзьвюма незалежнымі поглядамі на цывілізацыю мадэрнізму і яе магчымую будучыню. Але ў вачах гэтага самага зацікаўленага чытача другая кніга магла б, напэўна, мець пэўныя перавагі — ня кожны дзень ён мае магчымасьць знаёміцца з тэарэтычнымі поглядамі буйнога палітыка і дыплямата, які, відавочна, ня толькі зьдзяйсьняе, але й багата ў чым вызначае зьнешнюю палітыку нашай дзяржавы. Таму засяродзім увагу на гэтай апошняй і паспрабуем высьветліць, ці спраўджвае яна спадзевы беларускага чытача і, наогул, ці яму яна адрасаваная?

Ужо на другой старонцы працы аўтар авансуе ўвагу нечаканай (у кантэксьце ўсёй працы) заявай: «Горько сознавать, но Восточная Европа, в недавнем прошлом представленная Советским Союзом, а ныне государствами, родившимися на его территории, из цивилизационной системы модернизма и постмодернизма выпала» (с. 4). На жаль, гэтае «горкае ўсьведамленьне» мела для аўтара толькі адно наступства — традыцыйнае падазронае і гіпэркрытычнае стаўленьне да ўсяго эўрапейскага. Прычым аўтар старанна і дыпляматычна хавае сваю зыходную пазыцыю, з гледзішча якой ён і падыходзіць да аналізу сучаснай цывілізацыі. Па прачытаньні ж становіцца ясна адно — ня з гледзішча незалежнай краіны Беларусі, якая шукала б сваіх шляхоў самавызначэньня ў сучасным сьвеце. Для нашага аўтара Беларусь як суб'ект сучаснай гісторыі па вялікім рахунку не існуе. Ва ўсёй кніжцы яна прыгадваецца ўсяго адзін раз у даволі факультатыўным кантэксьце, але ў вельмі паказальным шэрагу: Таілянд, Гандурас, Беларусь і Філіпіны (с. 275). На месцы Беларусі ў гэтым шэрагу магла б стаяць якая заўгодна краіна «трэцяга сьвету». Ды што там маленькая і нягеглая Беларусь, калі гаворка ў кнізе ідзе нават не пра лёс адной канкрэтнай цывілізацыі, а пра лёс усяго чалавецтва ў цэлым, пра што аўтар выказваецца недвухсэнсова («... наша задача — изучить социально-экономическое и историческое движение лидеров современного мира, определить контуры создаваемого ими будущего, предсказать судьбу человечества на основании основных направлений развития») і неаднаразова. Лёс гэты бачыцца І.Антановічу драматычным і небестурботным. Пасьля зьнікненьня біпалярнага сьвету асноўныя лініі канфрантацыяў будуць, на думку аўтара, праходзіць паміж разьвітымі краінамі Захаду і скіраванымі на мадэрнізацыю, але не заўсёды да яе гатовымі, краінамі «трэцяга сьвету», а таксама паміж багатай меншасьцю і беднай большасьцю насельніцтва зямнога клубу. Зразумела ў сувязі з гэтым, што здань сёньняшняй Беларусі ня можа не паўставаць па-за радкамі разгляданай працы, бо гэта адна з краінаў, дзе задэкляраваныя контраксідэнталізацыя і курс на пабудову «грамадзтва сацыяльнай справядлівасьці» — два кіты актуальнай сьвядомай дзяржаўнай палітыкі. Натуральна, гэткія праявы сувэрэннасьці можна было б вітаць, калі б не шматлікія іншыя здані, што сям-там зьяўляюцца ў розных месцах разгляданай кнігі.

Першая здань — здань ідэалёгіі. Хоць аўтар дэкляруе і маніцца рэалізаваць бесстаронны і ўзважаны (навуковы) аналіз сучаснага капіталістычнага грамадзтва («В данном исследовании не будет ни чрезмерных восторгов от этого типа цивилизации, ни острой и едкой критики»), пазьбегнуць транспанаваньня старых савецкіх ідэалягічных падыходаў, якія акцэнтавалі ўвагу на праблемах і нэгатыўных баках жыцьця разьвітых краінаў Захаду, яму яўна не ўдаецца. Думаецца, адна з прычынаў гэтага палягае ў тым, што ладная частка працы была напісаная яшчэ гадоў колькі таму і пры падрыхтоўцы да друку не была прыведзеная ў адпаведнасьць з рэаліямі сёньняшняга дня. Таму ў кнізе мы можам спаткаць формы прэзэнсу там, дзе чакаліся бы імпэрфэктныя формы: «... в советских социологических и философских исследованиях эпоха Возрождения р а с с м а т р и в а е т с я [разрадка мая. — С.С.] несколько зауженно...» (с. 51). Толькі месца старой галоўнай супярэчнасці эпохі паміж капіталізмам і сацыялізмам займае (з прычыны гістарычнай няздатнасьці эўрапейскага сацыялізму да дынамічнага разьвіцьця) супярэчнасьць паміж цывілізацыяй мадэрнізму і ўсім астатнім сьветам. Таму праглядаецца і яшчэ адна здань — здань марксізму. Аўтар, што праўда, ужо на першых старонках імкнецца пацьвердзіць свой адыход ад традыцыйнага для марксізму фармацыйнага падыходу на карысьць больш сучаснага і шырока прызнанага цывілізацыйнага падыходу. Спрэс у кнізе мы знойдзем шматлікія крытычныя пасажы, што да тэорыі Маркса і яго пасьлядоўнікаў. І тым ня менш, цывілізацыйны аналіз сучасных грамадзтваў пераважна праводзіцца ў фармацыйных тэрмінах: прадукцыйныя сілы, вытворчыя адносіны, клясавая структура грамадзтва, канфрантацыя бедных і багатых і г.д., акцэнтуючы, такім чынам, эканамічныя і палітычныя вымярэньні цывілізацыі. Мэтапалітычнае вымярэнне, рэлевантнае ў той або іншай меры цывілізацыйным падыходам, маргіналізуецца, і чытачу адно застаецца здагадвацца, якімі іншымі матывамі можа быць абумоўлены той або іншы пасаж у разгляданай працы. І, як вынік, — зусім не нечаканае ў кантэксьце ўсёй працы прызнаньне: «... Марксова теория прогресса, предполагавшая переход к социализму большинства высокоразвитых капиталистических стран, отнюдь не исчерпала себя. Главный вывод Маркса верный. Рано или поздно цивилизация модернизма воспроизведет социализм, но не как бесклассовое, а гуманное и справедливое общество. Социализм сегодня «рассеян» по разным странам в виде элементов социального страхования, социальной поддержки бедных, нетрудоспособных и безработных, в виде социальных законов, охраняющих права человека труда. И сегодня эксперимент реального социализма развивается в Китае, Вьетнаме, на Кубе и в других странах» (с. 172). Пад іншымі краінамі тут, трэба думаць, маецца на ўвазе і Беларусь. Аднак неабходна зацеміць, што сацыялізм — катэгорыя фармацыйная, калі, канечне, не разумець яго толькі як утопію, якая ўзрушае маргіналаў на рэвалюцыйнае пераўладкаваньне грамадзтва, як гэта здарылася ў позьняй Рымскай імпэрыі ў выніку асыміляцыі люмпэнскай масай утапічнай ідэі «царства боскага».

Наступная здань — здань Расеі. Са шматлікіх пасажаў у кнізе чытач разумее, што сымпатыі аўтара цалкам на баку апошняй. Яна, а не прадстаўляная ім на міжнароднай арэне Беларусь, зьяўляецца сапраўдным суб'ектам сусьветнай гісторыі. І тут аўтар часам зьмяняе сваёй устаноўцы на бесстароннасьць і ўзважанасьць, як, напрыклад, калі ён параўноўвае рабаўладальніцтва ў Амэрыцы з прыгонам у Расеі, натуральна, на карысьць апошняй (с. 138). І тым ня менш, Расея ўвесь час знаходзіцца нібы за кадрам, як той фон, на якім больш кантрасна, паводле задумы аўтара, адцяняюцца хібы цывілізацыі мадэрнізму і постмадэрнізму. Зьвяртае ўвагу, што ў кнізе Расея зьяўляецца толькі на сотых старонках і адразу як актыўны суб'ект эўрапейскай гісторыі, усе высілкі якога былі скіраваныя на ўсталяваньне сыстэмы стабільнасьці і ўзаемабясьпекі. У чытача можа ўзьнікнуць пытаньне: як гэтак здарылася, што на працягу сотні старонак гаворка ішла пра тое, як заходнеэўрапейскія краіны сваімі ўласнымі высілкамі закладвалі падваліны цывілізацыі мадэрнізму, і раптам, калі ўсё было ўжо гатова, у XIX ст., Расея апынаецца ў самай гушчыні эўрапейскіх і сусьветных падзеяў? Думаецца, гэткі прыём быў скарыстаны аўтарам наўмысна, каб пераканаць чытача ў тым, што да складваньня цывілізацыі мадэрнізму Расея і наогул Усходняя Эўропа непасрэднага дачыненьня ня мелі, разьвіваліся аўтэнтычна і вытварылі самастойны цывілізацыйны тып, які адразу заявіў сябе як рэальная альтэрнатыва атлянтычнаму мандыялізму, якой, што праўда, была нанесеная вялікая школа бальшавіцкім экспэрымэнтам.

А тады становіцца бачнай апошняя здань у гэтай кнізе — здань будучыні. Нягледзячы на абяцаньне аўтара прадказаць, прынамсі, бліжэйшы лёс чалавецтва, якраз будучыня сталася ахутанай туманам. У чым аўтару ўдаецца пераканаць чытача, гэта ў непазьбежнасьці канфрантацыі беднай большасьці і багатай меншасьці (якая, відавочна, прыходзіць на зьмену клясавай барацьбе ў клясычнай фармацыйнай парадыгме), якая пагражае самымі нечаканымі катаклізмамі, параўнальнымі хіба з пагрозай экалягічнай і энэргетычнай катастроф. Але з другога боку, аўтар шматкроць падкрэсьлівае, што іншага шляху, як шлях мадэрнізацыі і дэмакратызацыі, незаходнія грамадзтвы ня маюць. Няма альтэрнатывы, на думку аўтара, і працэсам глябалізацыі і мандыялізацыі сусьветнай супольнасьці, а значыць постмадэрнізм і ёсьць бліжэйшая пэрспэктыва для ўсяго чалавецтва. Вось толькі аўтар супраць таго, каб моцныя «крыўдзілі» слабых, а багатыя — бедных, і каб Новы сусьветны парадак усталёўваўся без удзелу гэтых апошніх. Так што сацыялістычны эгалітарызм распаўсюджваецца і на сфэру сусьветнай палітыкі. Пазыцыі, зь якіх сёньняшнія маргіналы маглі б на роўных уваходзіць у дыялёг з Захадам, пазначаюцца ў лепшым выпадку пункцірна. А абяцанае абмеркаваньне эвалюцыйна-касмацэнтрычнай альтэрнатывы антрапацэнтрызму сучаснай заходняй цывілізацыі таксама па сутнасьці застаецца па-за асадамі гэтай працы.

Разгляданая кніга спараджае цэлую гайму пытаньняў, падобных да тых, што былі мімаходзь закранутыя вышэй. Аўтар жа прапанаваў чытачу свайго роду тэзаўрус некаторых ключавых словаў, паводле якіх трэба інтэрпрэтаваць тое, што засталося па-за тэкстам. Як бачым, ня будучы адрасаваная непасрэдна беларускаму чытачу, кніга І.Антановіча, тым ня менш, закранае яго сутнасна і ўжо дзеля гэтага яна, безумоўна, вартая прачытаньня. Да таго ж, вылучаецца яна і сваім стылем, і цікавай фактурай, і, як я паспрабаваў паказаць, своеасаблівай унутранай інтрыгай.

Сяргей Санько

Led Zeppelin і Максім Багдановіч

Пад сёлетнім калядным дажджом прыходзяць у галаву ўсялякія дзіўныя думкі. Вось слухаў днямі славутую «Лесьвіцу ў неба» Led Zeppelin, пра бедную дзяўчынку, якая паднялася да Бога, а згадваў «Варожбу» Алеся Гаруна, «Засьцянковую аповесьць» пра сіротку панну Эмілю, у якой ад пошасьці памерлі бацькі, і якую ўзялі на гадаваньне паны.

Устане, паходзіць і сядзе ізноў,
Б'ець у галоўку гарачая кроў;
Нейкія ў сэрцы парваліся тамы,
Твар то збляднее, то зробіцца ў плямы...
Стане прад маткай сьвятой з Вострай Брамы,
Просіць: «Прачыстая, згінуць ня дай,
Гора адкінь, ад бяды захавай!»

Гэты верш датаваны 17-м годам, тым самым, калі была напісаная Багдановічава «Пагоня», дзе паэт таксама зьвяртаецца да Вострае Брамы, як да апошняга паратунку. І мне зноў прыходзяць у галаву дзіўныя думкі пра розныя гістарычныя і культурныя трансфармацыі. Я думаю, ці маглі б Led Zeppelin даць канцэрт у атворы Вострае Брамы? Як бы гэта ўсё выглядала? Уяўляю сабе гэта і ня бачу неадпаведнасьці. Led Zeppelin у беларускім кантэксьце выглядаюць нармалёва, прынамсі больш арганічна, чым шмат якія намінальна беларускія дзеячы культуры.

Я згадваю яшчэ школьны прыкол пра тое, што сваю «Эміграцыйную песьню» Led Zeppelin напісалі на словы Максіма Багдановіча, у якога таксама ёсьць «Эміграцкая песьня». Зрэшты, я й цяпер ня ведаю, можа быць, так яно й было. А яшчэ згадваецца, як мінулым летам шараю гадзінай на Карлавым мосьце ў Празе два дзясяткі студэнтаў, седзячы проста на бруку, сьпявалі хорам пад гітару песеньку «One» ірляндзкага гурта U2. Гады тры таму, слухаючы гэтую песьню, я пісаў у «Нашу Ніву» абразок пра нашых сучасных лясных братоў — змагароў з усімі антыбеларускімі рэжымамі, які называўся «Дзядзька Міхась». А да тых студэнтаў на Карлавым мосьце мы спускаліся з Градчанаў, ад праскага помніка Францішку Скарыну...

Гэтак дзіўныя згадкі пераблытваюцца ў галаве, утвараючы гарманічны і зусім асабісты культурны кантэкст XX стагодзьдзя. Усё гэта ўспрымаецца як блізкае — Вострая Брама, Алесь Гарун, «Лесьвіца ў неба», Максім Багдановіч, Led Zeppelin, «Эміграцыйная песьня», U2, Дзядзька Міхась, Ірляндыя, Скарына, Карлаў мост... Пад калядным дажджом...

Пад зімовым дажджом
Мокне прывід халоднага лета
Мо гэта
Зь берагоў выйшла чорная Лета
І легла
На нашыя мары крыжом

Кантэкст азмрочваецца, як толькі прыходзяць згадкі пра палітыку, пра хамства, якое царуе цяпер на Бацькаўшчыне. Праўда, Славамір Адамовіч здолеў напісаць пра гэта без эстэтычнага дысанансу:

Каляды, посная куцьця,
Ня піша пісем арганістка,
Вісіць над установай сьцяг
Усенароднага фашыста...

Паэт Адамовіч таксама ўпісваецца ў Багдановічаву Вострую Браму, дзе граюць жывую акустычную музыку Led Zeppelin і дзе прытулілася да сьцяны Гаруновa сіротка панна Эміля. Міма заклапочана прабягае Антанас Глейзьніс, колішні вайсковы фатограф, які дапамагаў нам выдаваць першыя нелегальныя газэты, а цяперашні будаўнік, які гадоў пяць таму перасьцілаў у рэдакцыі «Нашай Нівы» падлогу...

Мае дзіўныя думкі нібы сьнежны камок коцяцца праз сумёты памяці, выбіраючы адтуль усё новыя повязі і асацыяцыі. Гэтак паўстае цэлы жывы сьвет, які прагне расьці, пашырацца, прыцягваючы ў сябе новыя імёны, назвы і словы. Напрыклад, Інтэрнэт. Магчыма некалі мы створым у сусьветнай кампутарнай сетцы сваю старонку, дзе знойдзецца месца і Глейзьнісу, і Дзядзьку Міхасю, і Led Zeppelin, і Славаміру Адамовічу, і Ірляндыі з Карлавым мастом у Празе, і ўсяму, што ўпісваецца ў наш жывы культурны кантэкст. А назавем мы тую старонку, як вы ўжо здагадаліся, Вострая Брама...

Сяргей Паўлоўскі

Невядомая дата

Колькі я ні пытаўся ў сваіх знаёмых, пераважна людзей абазнаных у беларускай культуры, што для іх значыць дата «17 сьнежня», ніводзін не зразумеў — што я маю на ўвазе? Ну як жа! Дзень беларускага кіно! Некаторыя перапытвалі — а што, у нас такое ёсьць? Кажуць «ёсьць», і таму кіну нават 73 гады, радуйся я рэдкай магчымасьці бліснуць эрудыцыяй. Менавіта тады, у 26-м годзе кіраўніцтва савецкай Беларусі прыняло рашэньне здымаць сваё кіно.

Я зрабіў намаганьне ўзгадаць свае любімыя стужкі вытворчасьці «Беларусьфільма». Не набралася і дзясятка. «Залаты ключык», «Я родам зь дзяцінства», «Праз могілкі», «Людзі на балоце», «Чужая бацькаўшчына», «Дзікае паляваньне караля Стаха», «Ідзі і глядзі». Напэўна, усё. Прычым, цалкам беларускімі можна назваць хіба толькі стужку Рыбарава ды тураўскі фільм «Праз могілкі». Яго, дарэчы, ЮНЭСКА ўключыла ў сьпіс ста лепшых кінастужак усіх часоў ды народаў. Шчыра кажучы, няшмат за сем дзясяткаў гадоў. Але, аказваецца, і ў апошнія гады ў нас працягвалі здымаць сваё ігравое кіно. Гартаючы каталёг «Белорусские фильмы 94-96 годов», я ніяк не даваў сабе рады — калі ж я пабачу фільм «На чорных лядах», зьняты паводле апавяданьня Васіля Быкава ды прысьвечаны слуцкім паўстанцам, ці стужку «Птушкі бяз гнёздаў», падмуркам для якой стала «Споведзь» Ларысы Геніюш. Магчыма што й ніколі. Тое, што даводзілася апошнім часам бачыць у кінатэатрах пад маркай беларускай кінастудыі, не выклікала нічога акрамя жалю. Добра памятаю сваю крыўду ад таго, як можна сапсаваць дзіўную казку, ці то з-за беднасьці, а хутчэй з-за невалоданьня матэрыялам. Менавіта так я ацэньваю апошнюю працу Віктара Турава «Шляхціц Завальня». Я таксама паглядзеў, як можна зганьбіцца, будучы гаспадарамі, на ня самым прэтэнцыёзным фэстывалі «Лістапад», дзе самай бяздарнаю стужкай была «Бег ад сьмерці» вытворчасьці «Беларусьфільма».

Ці застанецца гэтая дата — 17 сьнежня, дарэчы, зацьверджаная як дзень кіно лепшым сябрам беларускіх кінематаграфістаў, у пантэоне нацыянальных датаў — адказаць цяжка. Асабліва пасьля яе сьвяткаваньня ў кінатэатры «Масква». Калі б я спазьніўся ці наогул ня ведаў — што яны тут сьвяткуюць, я б падумаў, што зноў ідзе нейкае чарговае сьвята ўраджаю. Але я чэсна адслухаў сьвяточныя прамовы зь енкам на «некалі вялікай кінематаграфічнай дзяржаве». Я мужна адседзеў на дэманстрацыі нацыянальнага калярыту народным ансамблем з Інстытуту культуры. У памяці нават засталася разынка беларускага гумару, прыпеўка «палюбіла рэжысёра, а ён вечарам ня змог, у яго відаць граната разарвалась паміж ног». Але выпрабаваньня кіном я ня вытрымаў. Давалі глупую камэдыю, сцэнар якой напісаў нейкі бізнэсмэн, які аплаціў яе здымкі, а сам, відома, зьняўся ў галоўнай ролі. Калісьці гэта называлася «Алё, мы шукаем таленты», цяпер таленты знаходзяцца разам з грашыма.

Калі небудзь, сказаў мой сябра, з кінатэатру «Масква» мы зробім нацыянальны кінацэнтар. Я падзяляю яго аптымізм, таму што лішні раз пераканаўся — адсутнасьць грошай — рэч нашмат менш пераадольная, чым адсутнасьць амбіцыяў. І занадта шмат на гэтай зямлі сюжэтаў і фактуры, каб не спакусіцца аднойчы зьняць сапраўднае вялікае кіно.

Зьміцер Бартосік

Жалезны Фэлікс

Нядаўна, едучы ў віленскім тралейбусе, я пачуў урывак размовы: «Як даехаць да рынку Дзяржынскага?» Жанчыны перапытваліся па-літоўску і па-расейску, пакуль ім не далі рады. Вось ужо дзесяць гадоў, як няма ў Вільні ні вуліцы Дзяржынскага, ні шыльдаў, ні помнікаў, ні былога музэя ягонага імя, але ніяк не прыжываецца ў сьведамасьці віленчукоў старажытная назва той вуліцы, вернутая наноў — Кальварыйская...

У Літве, між тым, культу Дзяржынскага не было ніколі. Хоць добры кавалак ягонае біяграфіі зьвязаны менавіта зь Літвою. Культ Дзяржынскага існаваў у БССР, у ягоных родных мясьцінах: ягонае імя і да сёньня носяць сотні вуліц, дзясяткі паселішчаў і калгасаў. Сотні бюстаў Дзяржынскага і дасёньня фармуюць наш краявід...

У 1915 годзе расейцы, адступаючы зь Вільні, разабралі і вывезьлі дадому помнік графу Мураўёву-вешальніку, работы скульптара Гразнова. А ўсяго 17 гадоў раней гэты помнік урачыста адкрывалі губэрнатары Вільні, Горадні, Віцебска, Магілёва і Коўна. Вывезьлі, бо выдатна ведалі, што тутэйшы люд з гэтым манумэнтам цырымоніцца ня будзе. Разам з Мураўёвым расейскія акупанты, ратуючы ад ганьбы, вывезьлі свае помнікі Кацярыне і Пушкіну. Помнікі камуністычным правадырам зь Вільні ніхто не вывозіў, яны аказаліся нікому не патрэбнымі. Нават у Маскве, дзе таго ж Дзяржынскага зьвярнулі адным махам.

Іншая справа ў Менску. Калі ў Вільні з імем Дзяржынскага асацыюецца рынак пры вуліцы Кальварыйскай, у Маскве славутая Лубянка, то ў Менску «дзяржынкаю» называюць утульны сквэрык насупраць КГБ, дзе моладзь у засені ліпаў зазвычай п'е піва. Ні нянавісьці, ні пашаны. Абыякавасьць... Аматары адвязных міралюбівых тусовак перамясьціліся сюды пасьля таго, як іх пацясьніла з Траецкага прадмесьця братва, што вывалілася з-за кратаў падчас гарбачоўскае амністыі.

Помнік-бюст «рыцара рэвалюцыі», каля якога смакуе піва, быў пастаўлены ў Менску ў 1947 годзе. Створаны Заірам Азгурам, ён быў другім у паваенным Менску, пасьля аднаўленага манумэнта Леніна, работы Мацьвея Манізэра. Толькі праз пару гадоў зьявіўся ў Менску і бюсьцік Купалы. Праўда, пасьля яго перанесьлі з праспэкта ў парк імя Горкага, а затым наогул завезьлі ў Вязынку. А Дзяржынскі стаіць! Вось ужо роўна паўстагодзьдзя гэтая галава сур'ёзна глядзіць у вокны самай сур'ёзнай установы Беларусі — КГБ. Паўстагодзьдзя жыхары і госьці Менску, мінаючы гэтае месца, беспамылкова здагадваюцца, хто і дасёньня галоўны ў беларускай гісторыі.

Упершыню бюст Дзяржынскага зьявіўся ў Менску літаральна праз пяць гадоў пасьля сьмерці «жалезнага Фэлікса», у Доме Ўраду. Аўтар — той самы Заір Азгур. А ў 1933 годзе зьявіўся і вялікі помнік на «радзіме героя», у Койданаве, перайменаваным у Дзяржынск, хоць сапраўдная радзіма Фэлікса была на той час яшчэ ў Польшчы. Ну а далей пайшло: у Дзяржынскім, Валожынскім і Стаўпецкім раёнах, бадай, няма ніводнага сельсавету, ніводнае школы, дзе не было б выяваў галоўнага бальшавіцкага ката з «чыстымі рукамі». Толькі па Менскай вобласьці ў «Зборы помнікаў» улічана 28 асноўных манумэнтаў Дзяржынскаму. Працуюць два музэі, пры якіх утрымліваюцца штатныя адзінкі. Сёньня гэтыя ўстановы, як і паўстагодзьдзя таму, ня ведаюць праблемаў з фінансаваньнем, у той час як многія іншыя музэі папросту згортваюцца.

Што адбудзецца ўрэшце рэшт са спадчынай «жалезнага Фэлікса» ў Беларусі? Ніхто не зьвязе гэтыя тоны бэтону, бронзы і жалеза ў Расею, як некалі зьвезьлі ягонага папярэдніка, бронзавага Мураўёва-вешальніка. У Польшчы ад такога суродзіча напагатоў даўно адхрысьціліся... Лепей за ўсё замкнуць нарэшце асацыяцыі і і заставіць гэтымі помнікамі двор КГБ, вакол слыннае «амэрыканкі». Бацька й ягонае дзецішча мусяць быць разам.

Сяргей Харэўскі

Вострая Брама

беларускі культурны кантэкст XX ст.

Новы супольны праект «Нашай Нівы» і беларускай рэдакцыі Радыё Свабода: рэпартажы, рэфлексіі, гутаркі — кожную нядзелю на зьмененых хвалях Свабоды. Кожную сераду — паўтор перадачы.

Адсутнасьць кантэксту культуры — гэта адсутнасьць глябальных арыенціраў нацыі. Яна нявечыць нашае жыцьцё і на вялікім і на малым узроўні. Беларусь нібыта сьцьвярджае сябе як незалежная дзяржава, але дзеля чаго гэта робіцца, дзеля чаго тая незалежнасьць — разумее ня кожны. Людзі не задумваюцца над тым, што сувэрэнітэт патрэбны для самабытнага існаваньня нацыі, бо менавіта ў самабытным існаваньні нацыя найлепшым чынам рэалізуе свой патэнцыял, уладкоўвае жыцьцё ў адпаведнасьці са сваімі прыроднымі рысамі характару. Калі народ існуе ў культурным кантэксьце, яму не прыходзяць у галаву розныя самаедзкія, дзікунскія ідэі, ён не азлоблены, а прагны да творчасьці і працы.

Бэстсэлеры Беларусі

Мастацкая літаратура:

1. Ганс Якаб Крыстофэль фон Грымэльсгаўзэн. Авантурнік Сімпліцысімус / Перакл. Васіль Сёмуха. — Менск: Мастацкая літаратура, 1997. — (Скарбы сусьветнай літаратуры) — 3.000 ас.
2. Максім Гарэцкі. Віленскія камунары: Раман-кроніка. Камароўская кроніка: Аповесьць. — Менск: Мастацкая літаратура, 1997. — (Школьная бібліятэка) — 12.500 ас.
3. Максім Багдановіч. Выбраныя творы. — Менск: Беларускі кнігазбор, 1996. — 6.000 ас.
4. Янка Купала. Поўны збор твораў: У 9 т. Т. 3: Вершы, пераклады 1911-1914. — Менск: Мастацкая літаратура, 1997. –6.000 ас.
5. Якуб Колас. Раніца ў нядзельку. Казкі жыцьця. — Менск: «Лазурак», 1997. — 10.500 ас.

Літаратура факту:

1. Беларуская энцыкляпэдыя: У 18 т. Т. 4: Варанецкі — Гальфстрым. — Менск: БелЭн, 1997. — 10.000 ас.
2. Энцыкляпэдыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 4: Кадэты — Ляшчэня. — Менск: БелЭн, 1997. — 10.000 ас.
3. Беларуская мова: сьцісла і даступна: Дапаможнік для старшаклясьнікаў і абітурыентаў / Ул.Будай, А.Калюта, А.Лаўрэненка, І.Шкраба. — Менск: Элайда, 1997. — 3.000 ас.
4. Гарт. З успамінаў пра Саюз Беларускіх Патрыётаў (Глыбокае, Паставы. 1945-1947). — Менск: Наша Ніва, 1997. (Архіў Найноўшае Гісторыі). — 1.000 ас.
5. Уладзімер Арлоў. Адкуль наш род. Апавяданьні па гісторыі Беларусі: Для малодшых школьнікаў. — Менск: ВЦ «Бацькаўшчына», 1996. — 5 000 ас.
6. Янка Запруднік. Беларусь на гістарычных скрыжаваньнях. — Менск: Беларускі Фонд Сораса — ВЦ «Бацькаўшчына», 1996. — 5.000 ас.
7. Сыны і пасынкі Беларусі. — Менск: Полымя, 1996. — 4.200 ас.
8. Тацяна Процька. Пакутнік за Веру і Бацькаўшчыну: Мітрапаліт Мельхісэдэк. — Менск: Тэхналёгія, 1996. — (Нашыя славутыя землякі).
9. Леанід Аляксееў. Гродна і помнікі Панямоньня. — Менск: Беларуская навука, 1996. — 1.400 ас.
10. Наша Ніва. Першая беларуская газэта з рысункамі / Выпуск 2: 1909 г. Факсымільнае выданьне. — Менск: Беларуская навука, 1996. — 1.000 ас.

1997 год: да гісторыі беларускай кнігі

Рэйтынг беларускіх кніг складаецца паводле інфармацыі найбуйнейшых менскіх кнігарняў, якія па-ранейшаму альбо недасканала зьбіраюць інфармацыю, альбо вельмі неахвотна ёй дзеляцца. Гэтая сытуацыя яшчэ раз ілюструе рынкавыя свабоды ў Беларусі. Пад час складаньня рэйтынгу мы таксама ўлічваем грамадзкае гучаньне той ці іншай кнігі, якое, безумоўна, уплывае на цікавасьць да выданьня.

Найменш мабільны сэгмэнт кніжнага рынку ў Беларусі — гэта мастацкая літаратура. Характэрная рыса тут — адсутнасьць у сьпісе бэстсэлераў кніг незалежных выдавецтваў. Хоць можна назваць некалькі такіх кніжных пазыцыяў, якія маглі б прэтэндаваць на ролю бэстсэлера ў мастацкай літаратуры. Але яны, як «Койданава» Адама Глёбуса, выдадзеныя зусім малымі накладамі. Цікавасьць беларускіх пакупнікоў шмат у чым вызначае школьная праграма. Хоць творы, рэпрэзэнтаваныя ў гэтым сьпісе — сапраўды клясычныя для беларускай літаратуры. Прарыў 97 году — «Авантурнік Сімпліцысімус» у перакладзе Васіля Сёмухі. Сымпатыю беларускіх крытыкаў і чытачоў адразу прыцягнула моўная адэкватнасьць перакладу ўлюбёнай эпосе беларусаў — барока. Старабеларуская лексыка XVI-XVII ст. ды набліжаны да баракальнага сынтаксіс стварылы адпаведную тканіну тэксту.

Літаратура факту карыстаецца ў Беларусі вялікім посьпехам і тут на ролю лідэраў могуць прэтэндаваць ужо 10 выданьняў. Але й гэты сэгмэнт кніжнага рынку збольшага прадказальны: на посьпех у Беларусі могуць разьлічваць энцыкляпэдыі й даведнікі, падручнікі беларускай мовы (асабліва калі гэта «сьцісла й даступна»), гістарычная літаратура з сыстэматызаваным выкладам матэрыялу. Традыцыйна беларуская пазыцыя кніжных бэстсэлераў — гэта факсыміле. «Наша Ніва» за 1909 год — прыклад гэтаму. Па-ранейшаму першыя пазыцыі ў сьпісе бэстсэлераў займаюць энцыкляпэдыі, але ў 1997 годзе стала заўважнаю новая тэндэнцыя — падзеньне цікавасьці да прадукцыі выдавецтва «Беларуская Энцыкляпэдыя» пасьля таго, як там цалкам зьмянілася кіраўніцтва. Чытачы па-свойму рэагуюць на новую палітыку выдавецтва зь яе ідэалягічным уціскам і цэнзураю — пачынаюць менш купляць прадукцыі гэтага выдавецтва. Пра тое, што апошнія тамы энцыкляпэдыяў карыстаюцца меншым посьпехам, чым папярэднія, Вам скажуць у любой кнігарні.

Сярод кніжак літаратуры факту заўважныя пазыцыі незалежных выдавецтваў — 4 кнігі зь 10 (пазыцыі 4, 5, 6, 8). Дзьве зь іх — «Адкуль наш род» Уладзімера Арлова ды «Беларусь на гістарычных скрыжаваньнях» Янкі Запрудніка прарываліся на рынак са скандаламі. Абедзве кнігі былі першапачаткова практычна забароненыя. І калі вакол кнігі Ўладзімера Арлова было створанае шырокае інфармацыйнае поле, дык з кнігі Янкі Запрудніка ўлады вымусілі выкінуць цэлы разьдзел. Абедзьве названыя кнігі выйшлі ў Выдавецкім Цэнтры «Бацькаўшчына».

Кніжка Тацяны Процькі працягвае прыгожую паводле сваёй задумы сэрыю «Нашыя славутыя землякі». Гэтая кніжная сэрыя паступова пераходзіць у незалежныя выдавецтвы, у гэтым выпадку —«Тэхналёгія». Кніга Тацяны Процькі распавядае пра праваслаўную царкву, якая не аддаецца дзяржаве. З гледзішча сёньняшніх падзеяў у Беларусі кніга выглядае амаль сэнсацыйнаю.

Выдавецтва «Наша Ніва» лічыць «Гарт» самаю важнаю сваёй кнігаю. Тое, як рукапіс прадзіраўся скрозь перашкоды, таксама ілюструе сёньняшнюю сытуацыю ў Беларусі. Але як толькі кніга зьявілася, яна адразу прыцягнула ўвагу грамадзкасьці ня толькі ў Беларусі. Укладальнік кнігі Герман Кірылаў атрымаў прэмію Пэн-Цэнтру. Па віленскай тэлевізіі на працягу кастрычніка-лістапада было паказана дзьве перадачы пра Саюз Беларускіх Патрыётаў. У Архіў Найноўшае Гісторыі прыйшлі лісты з маскоўскага «Мэмарыялу» з просьбаю даслаць «Гарт». Адначасова некаторыя менскія кнігарні адмаўляліся браць «Гарт» на рэалізацыю. Але кніга ўсё адно знайшла свайго зацікаўленага чытача.

Адзін з фактараў посьпеху кнігі — удалае аздабленьне. У выдавецтве «Полымя» кнігу «Сыны і пасынкі Беларусі» аформілі досыць эфэктна — на пярэдняй вокладцы зьмясьцілі выявы нацыянальных беларускіх сымбаляў, а на задняй — сымбалі БССР. Такім чынам вытраманы балянс і тэматычная адпаведнасьць. Але пакупніку на вочы найперш трапляе бел-чырвона-белы сьцяг.

Леанід Аляксееў з Масквы напісаў сваю кнігу «Гродна і помнікі Панямоньня» у папулярным жанры — падарожных нататак. Аўтар ня толькі прапанаваў цікавую фактуру, але не ўтрымаўся ад цёплых заўвагаў адносна Беларусі — яе «асаблівай гісторыі, асаблівага калярыту й асаблівых помнікаў мастацтва». Беларускі чытач рэагуе на такое з удзячнасьцю. Кніга прысьвечаная «Сьветлай памяці даасьледчыка беларускага мінулага і яго помнікаў, натхнёнага змагара за Новую Беларусь Міхася Аляксандравіча Ткачова».

Аналізуючы вынікі кніжнага году можна зазначыць некалькі праблемаў і тэндэнцыяў:

1. Вельмі востра адчуваецца патрэба абнаўленьня ў мастацкай літаратуры. Новыя аўтары так і не прарваліся на ўласна рынак.

2. 1997 год адзначаны небывалым пасьля 1990 году наступам рэакцыі на вольнае слова, многія выдавецтвы і выданьні падпалі пад рэпрэсіі й цэнзураваньне. Актыўна выкарыстоўваўся паза эканамічны прымус.

3. У дзяржаўных выдавецтвах, дзе новая цэнзура ўводзіцца найбольш апантана (як у выпадку БелЭн) зьніжаецца камэрцыйны посьпех выданьняў. Іншая рэч, што дзяржаўныя датацыі ў такіх выпадках пакрываюць усе выдаткі.

4. Нягледзячы на ціск, незалежныя выдавецтвы ўсё ж здолелі зазначыць сваё месца на кніжным рынку. Некаторыя выдавецтвы нават выпрацавалі новую стратэгію абароны, скарыстоўваючы прынцыпы публічнасьці й шырокага інфармаваньня грамадзтва пра патрабаваньні да іх ідэолягаў рэжыму.

1998 год абяцае новыя праблемы для недзяржаўных выдавецтваў. Аляксандар Лукашэнка напрыканцы 97-га ужо заявіў, што «кнігавыданьне й кнігагандаль павінна кантраляваць дзяржава... У гэтай сфэры непадзельна павінна панаваць дзяржава й праводзіць сваю лінію ў грамадзтве праз пісьменьнікаў, праз іх творы» («Звязда», 17 сьнежня 1997).

Але прэцэдэнт незалежнай кнігі ў Беларусі ўжо створаны. Такая кніга, магчыма, будзе зьнікаць з паліцаў дзяржаўных кнігарняў, але стане пашырацца з дапамогаю іншых грамадзкіх мэханізмаў. Ня ведаю, ці чакаюць нас новыя вялікія каталёгі самвыдату, але гісторыя незалежнай выдавецкай дзейнасьці ў Беларусі ўжо пішацца.

Алег Дзярновіч

Без прышэптваньня

БЕЛАРУСАЗНАЎСТВА. Навучальны дапаможнік. Пад рэдакцыяй Пятра Брыгадзіна. — Менск: Завігар, 1997

У кароткія часы «нацыянальнай адлігі» пачатку дзевяностых у навучальныя праграмы школаў і ВНУ пасьпелі ўвесьці курсы «беларусазнаўства» і «гісторыі беларускай культуры». Але за тыя тры-чатыры гады так і не зьявілася адпаведнага падручніка ці навучальнага дапаможніка. Шмат выданьняў пісалі пра асобныя аспэкты беларусаведы, праграмкі і брашуркі інстытуцкіх выкладчыкаў з розных бакоў «прарываліся» да вырашэньня праблемы, але канцэптуальнага падручніка (як дарэчы й па гісторыі Беларусі) стварыць не ўдалося. Прычына (асноўная, напэўна) — гэта брак генэральнай канцэпцыі таго, што такое Беларусь увогуле, канцэпцыі прымальнай і для навукоўцаў, і для беларускай дзяржавы, і для нацыянальнай эліты, і, дарэчы, досыць зразумелай так званаму «народу».

«Адліга» прамінула, і вось сасьпелыя нарэшце прадукты нацыянальнай культуралёгіі пачынаюць зьяўляцца на студэнцкіх сталах. У мінулым (1996) годзе «Наша Ніва» пісала пра «Гісторыю культуры Беларусі» Леаніда Лыча і Ўладзімера Навіцкага. У 97-м выйшла перавыданьне гэтай ня надта ўдалай кнігі, якая, на жаль, ня стала нашмат лепшаю. Я асабіста сваім студэнтам яе ня раю. Зусім нядаўна ў мае рукі трапіла «Беларусазнаўства» — збор «рознааўтарскіх» матэрыялаў пад рэдакцыя прафэсара Пятра Брыгадзіна. Прызнаюся, я з асьцярогаю разгарнуў і гэтую кнігу, хоць сьпіс аўтараў дастаткова прадстаўнічы — Леанід і Павал Лойкі, Анатоль Грыцкевіч, Язэп Юхо, Алесь Лозка ды іншыя сур'ёзныя навукоўцы.

«Беларусазнаўства» — не дапаможнік у клясычным сэнсе. Гэта сабраныя пад адной вокладкай «артыкулы-лекцыі», якія ў большасьці адпавядаюць асноўным тэмам курса, што даў назву кніжцы. У дадатак прыкладаюцца навучальныя праграмы па адпаведным прадмеце. Аўтары артыкулаў розныя паводле ўзросту, навуковай мэтадалёгіі, палітычных поглядаў, але ўся кніга ўспрымаецца досыць цэльна, бо яднае аўтараў адзіная пазыцыя — беларуская, выразна незалежніцкая. Сёньня, калі гасла маральнага кампрамісу чарговы раз лунае над шэрагамі «нацыянальнай інтэлігенцыі», такая, амаль пазбаўленая кампраміснага калябаранцкага прышэптваньня, кніга ўспрымаецца значна паважней, чым гэта магло быць некалькі гадоў таму.

Калі ўсё ж рабіць заўвагі, спынюся толькі на некаторых пунктах. У першым разьдзеле «Этнагенэз Беларусі на фоне гісторыі і геапалітыкі» (аўтар Леанід Лойка) не стае доказальнасьці ў развагах пра паходжаньне тэрміну «русь» ці іншых этнічных назоваў. (Дарэчы, істотны недахоп усяго дапаможніка — гэта адсутнасьць спасылак на крыніцы, бібліяграфіі, агульнай ці па тэмах, бо сьпісы літаратуры пры навучальных праграмах вельмі сьціплыя, а часам і недакладныя.) Варта было б пры размове пра балта-славянскія дачыненьні згадаць пра тэорыю этнічнага субстрату, пра пошукі Уладзімера Сядова. Вельмі патрэбныя тэмы — мэнтальнасьць і нацыянальны характар беларусаў (Эдуард Дубянецкі), але часам развагі аўтара набываюць маланавуковы характар, нагадваючы «размовы на тэму». Разуменьне беларусаў як супольнасьці, якая мае свае мэнтальныя асаблівасьці, заснаванае да таго ж амаль выключна на тэзе, што беларусы — аднародная сялянская маса. Сацыяльная стратыфікацыя, існаваньне на працягу стагодзьдзяў значнага слою шляхты, з сваімі рысамі сьветаўспрыманьня, тыпамі характару, этасам, розныя канфэсійныя ўплывы — практычна ня ўлічваюцца. «Беларуская дыяспара» — тэма, у прынцыпе выдатна асьветленая Тамарай Лойкай. Але — паўстае ў мяне пытаньне — ці слушна працягваць у дачыненьні да беларускіх палітычных эмігрантаў часоў Другой сусьветнай вайны савецкую традыцыю ўжываньня тэрміну «калябаранты», які мае — і мы гэта сёньня як ніколі адчуваем — выразную эмацыйную адмоўную афарбоўку. Можа тады пашырыць межы гэтага тэрміну на усіх, хто супрацоўнічае зь любым антыбеларускім рэжымам? У артыкуле «Прыгожае пісьменства» (аўтар Уладзімер Навумовіч), на жаль, цалкам не заўважаецца існаваньне такога фэномэну, як беларуская літаратура на польскай мове. Царкоўнаславянскія творы можна разглядаць як помнікі беларускага пісьменства, а польскамоўныя, створаныя беларусамі, на беларускай зямлі, з усімі рысамі беларускага мэнталітэту — чамусьці адкідаюцца. Мо таму, што яны створаныя шляхтай, альбо каталікамі?..

Пытаньні і заўвагі да «Беларусазнаўства» зразумелыя для кожнага падобнага «экспэрымэнтальнага» выданьня. І яны не памяншаюць значэньня гэтае невялікае кніжкі. Галоўнае — гэта тое, што ёй сапраўды можна й варта карыстацца.

Вацлаў Арэшка

Сцэны з жыцьця катаў



Аляксандар Лукашук. «За кіпучай чэкісцкай работай». — Менск: Наша Ніва, 1997

Гэты год, адзначаны ў Беларусі ня столькі адкрыцьцямі, колькі забаронамі й закрыцьцямі, на прыканцы сваім нібы сьпяшаецца ўвайсьці ў гісторыю важнымі культурнымі зьявамі. Два тыдні таму ў Лёндане на аўкцыёне былі набытыя невядомыя кнігі Скарыны. А сьледам адбылася яшчэ адна істотная для беларускага культурнага кантэксту падзея. У выдавецтве «Наша Ніва» ў архіўнай сэрыі набачыла сьвет кніга Аляксандра Лукашука «За кіпучай чэкісцкай работай». Важнасьць гэтае кнігі ў тым, што яна ствярае прэцэдэнт апазыцыі савецкім выкрывальніцкім кнігам сталінскае закваскі і распавядае пра канкрэтных забойцаў — супрацоўнікаў НКВД.

З дапамогай архіўных матэрыялаў аўтар распавядае пра людзей, якія працавалі ў НКВД Беларусі ў самыя крывавыя гады сталінскага тэрору, пра чэкістаў, якія ставілі рэкорды — хто болей сфабрыкуе расстрэльных справаў...

Начальнік Старобінскага НКВД Макар Гарбачэўскі за адзін толькі суботні дзень 18 верасьня 1937 году выпісаў ордэры на арышт сямідзесяці чалавек. Польскія шпіёны, удзельнікі антысавецкага супраціву — усе гэтыя «ворагі народа» напавер аказваліся звычайнымі сялянамі. Яны яшчэ спрабавалі выбрацца з Магілёўскай турмы і зь Сібірскіх лягераў, пісалі апэляцыі. Некаторых нават і вызвалялі. Але на шляху гэтых перапісак стаяў усё той жа Макар Гарбачэўскі, які на той час ужо перабраўся ў Менск і стаў намесьнікам Цанавы.

Гарбачэўскі — толькі адзін зь дзясяткаў энкавэдыстаў-курапатчыкаў, справы якіх аўтару ўдалося пабачыць у архівах за час кароткае адлігі ў пачатку 90-х. Нагадаю, што за часамі Лукашэнкі архівы КГБ зноў былі наглуха зачыненыя ад дасьледчыкаў.

Таксама нямала месца адвёў Аляксандар Лукашук цэнзурнаму ведамству, якое даводзіла да абсурду сваю барацьбу з іншадумствам. Забараняліся кнігі... Забаранялася мова...

Шукаючы кантэксту, у які трапляе кніга «За кіпучай чэкісцкай работай», я раптам згадаў колішнюю кнігу Яўгена Рама磨оўскага «Саўдзельнікі ў злачынствах». Там маюцца на ўвазе паслугачы гітлераўскіх акупантаў, беларускія нацыяналісты. Сярод антыгерояў, дарэчы, ёсьць Янка Філістовіч, які ў папярэдняй кнізе Лукашука паўстаў як герой. Новая кніга пра чэкістаў уступае ў апазыцыю да кнігі Рамаоўскага. З гэтага моманту пачынаецца двубой. Антыгероі Рамаоўскага становяцца героямі ў інтэрпрэтацыі беларускіх незалежных гісторыкаў. Антыгероі Лукашука дагэтуль ушаноўваюцца ў сваіх вэтэранскіх арганізацыях. Абедзьве кнігі напісаныя ў жанры выкрыцьця. Абедзьве спасылаюцца на факты. Гэтак кніга «За кіпучай чэкісцкай работай» разбурае аднамернасьць гісторыі і сьцьвярджае палярнае разуменьне нашай мінуўшчыны гісторыкамі савецкае школы і тымі, якія працуюць дзеля будучыні.

Разглядаючы колішняе амаль юрыдычнае паняцьце «вораг народа», мы мусім зьвяраць яго зь сёньняшнімі ўяўленьнямі і тэрмінамі. Калі мера злачынства «ворага народа» Філістовіча — чыста ідэалягічная — маўляў, нацыяналіст і антысаветчык — адмерла разам з бальшавіцкай ідэалёгіяй, то мера злачынства чэкіста Грабачэўскага — канкрэтныя забойствы невінаватых людзей, актуальная і сёньня. Яна называецца злачынствам супраць чалавечнасьці.

Крыт.

Унія: погляд з Усходу



Брестская уния 1569 г. и общественно-политическая борьба на Украине и в Белоруссии в конце XVI — начале XVII в. Часть I. Брестская уния 1569 г. Исторические причины события. — Москва: «Индрик», 1976. ISBN 5-85759-045-0

Гэтая невялікая, але ёмістая кніга анансаваная як «першае спэцыяльнае дасьледаваньне пытаньня ў расейскай гістарыяграфіі апошніх гадоў». З такім сьцьвярджэньнем можна было б і паспрачацца (цікава, якую кнігу аўтары лічаць перадапошняй?), але бясспрэчна, што гэтая праца — сур'ёзнае навуковае дасьледаваньне. Аўтары нарысаў (М.Дзьмітрыеў, Б.Флора, С.Якавенка) ахапілі вялікі матэрыял, закранулі шмат якія праблемы і на многія пытаньні здолелі даць пераканаўчыя адказы. Балазе пра царкоўную унію матэрыял назьбіраны багаты й няма недахопаў у яго самых розных інтэрпрэтацыях. Дарэчы, аўтары адкрыта паказваюць на тых, чыю лінію яны працягваюць — украінскіх гісторыкаў Арэста Лявіцкага і Міхала Грушэўскага. Такую адкрытасьць застаецца вітаць. На разважаньні наводзіць сьцьвярджэньне аўтараў, што магчымасьці для прафэсійнага навуковага вывучэньня уніі сталі зьяўляцца зь сярэдзіны XIX стагодзьдзя, бо ў расейскіх выданьнях пачынаючы з 40-50-х гадоў стагодзьдзя быў уведзены ў зварот цэлы комплекс дакумэнтальных матэрыялаў з архіву ўніяцкіх мітрапалітаў. Іншымі словамі, толькі пасьля скасаваньня ўніяцкай царквы ў Расейскай імпэрыі на Полацкім саборы 1839 г. узьнікла навуковая гісторыя уніі? І распрацоўвалі яе, трэба думаць, праваслаўныя гісторыкі? Пакінем гэта на сумленьні аўтараў.

Гісторыю заключэньня царкоўнай уніі ў Рэчы Паспалітай аўтары падалі на шырокім гістарычным фоне, на тле тых рэлігійных рухаў, якія ў XVI стагодзьдзі ахапілі ўсю Эўропу. Асьветленая Рэфармацыя, так званая Рэформа ўнутры самога каталіцтва, дзейнасьць праваслаўных брацтваў, узаемадачыненьні з усходнімі патрыярхамі, дзейнасьць езуітаў, адміністратыўны крызыс унутры праваслаўнай царквы Рэчы Паспалітай. Яго аўтары лічаць асноўнай прычынай заключэньня уніі. Сапраўды, у другой палове XVI стагодзьдзя кіраваньне праваслаўнай царквой сутыкнулася зь вельмі вялікімі цяжкасьцямі. Квітнелі парадкі самага звычайнага фэадалізму, калі мясцовы пан будаваў царкву (ці атрымліваў яе ў спадчыну), прызначаў папа і забіраў сабе ягоныя прыбыткі. А калі пан быў вялікі, як князь Канстанцін Астроскі, які валадарыў ледзь не на палове Ўкраіны? Сам ён лічыў сябе вялікім абаронцам праваслаўя, але якраз існаваньне падобных латыфундыяў у рэшце рэшт перашкаджалі праваслаўю. Япіскапы заставаліся зусім у баку ад кіраваньня царквой, і цалкам зразумелае іхняе жаданьне абаперціся на цэнтральную дзяржаўную ўладу, каб змагацца з тым свавольлівым «фэадальна-царкоўным» сэпаратызмам. Але паказваючы адміністрацыйны крызыс праваслаўя ў Рэчы Паспалітай, аўтары не прадэманстравалі застою ў іншых вобласьцях царкоўнага жыцьця. Мімаходзь прыгаданая думка М.Грушэўскага, што да сярэдзіны XVI стагодзьдзя ўкраінская культура была бясплённай, не атрымала ў кнізе разгляду, а безь яго аўтары надзвычай лёгка маглі сьцьвярджаць, што ў прычынах уніі не было аніякай цягі праваслаўных да заходнеэўрапейскай культуры. Дарэчы, не атрымала ў кнізе працягу і тэма пратэстантству ў праваслаўнай царкве, хоць, пэўна, аўтары й згодныя, што гэта была важная прычына уніі.

Адзін аспэкт «унійнай праблемы» займае асобае месца ў беларускіх і ўкраінскіх дасьледчыкаў, а менавіта ўзаемадачыненьні з Масквой. Гэтая праблема была сфармуляваная даўно, у некаторых гісторыкаў яна набыла такі выгляд: да заключэньня царкоўнай уніі прывяла боязь праваслаўных Рэчы Паспалітай апынуцца ў падначаленьні маскоўскіх патрыярхаў. Сапраўды, маскоўскі патрыярхат утвораны ў 1589 годзе, а ўкраінска-беларускія герархі пачалі весьці размовы-перамовы пра унію ў 1590 годзе. Ці няма тут прамой сувязі? Аўтары кнігі гэта рашуча адмаўляюць, нават абвяшчаюць гэта «ненавуковымі домысламі, якія ўзьніклі ў атмасфэры «халоднай вайны». А між тым у беларускай гістарыяграфіі дасюль навукоўцы намацваюць сувязі паміж гэтымі дзьвюма датамі. На некаторыя дэталі праблемы зьвяртаюць увагу і аўтары кнігі. Канстанцін Астроскі ў 1593 годзе прапаноўваў праваслаўным япіскапам адправіць пасольства ў Маскву, шукаючы падтрымкі ў барацьбе з каталікамі. Як вядома, япіскапы накіравалі пасольства ў зусім іншы бок — у Рым. Увогуле гэтая тэма яшчэ застаецца недасьледаванай і неасэнсаванай.

Мала ўвагі надалі маскоўскія аўтары і ролі канцлера ВКЛ Льва Сапегі ва ўсіх унійных падзеях. Першы варыянт уніі, распрацаваны праваслаўнымі япіскапамі, кароль Жыгімонт Ваза даручыў разгледзець асобам, якім, пэўна, давяраў. Гэта былі луцкі біскуп Б.Мацяёўскі, львоўскі арцыбіскуп Я.Салікоўскі і Л.Сапега. Зьяўленьне апошняга ў камісіі выглядае досыць нечаканым. Б.Флора паспрабаваў растлумачыць гэта тым, што ў той час (1595 г.) Сапега быў сярод магнатэрыі чалавекам новым, абавязаным сваім узвышэньнем каралю і цалкам паслухмяным. Відавочна, гэта ня так. Прыгадаем, што ў 1588 годзе Л.Сапега дамогся зацьвярджэньня новага Статуту, які значна адасобіў ВКЛ ад Польскага каралеўства. Тэма «Леў Сапега і унія» таксама чакае свайго беларускага дасьледчыка.

Сярод вартасьцяў кнігі чытач знойдзе выкарыстаньне найноўшага дакумэнтальнага матэрыялу і навуковых дасьледаваньняў, павагу да працы папярэднікаў, сьвежасьць думак і назіраньняў. Сярод хібаў заўважныя прыкрыя тэрміны, як «Ватыкан» (як палітычная зьява ён народжаны ў XX стагодзьдзі) і, што зусім нечакана, спатыкаем Францыска (Георгія) Скарыну. Застаецца разьвесьці рукамі і чакаць абяцанай другой часткі дасьледаваньня.

Валеры Пазьнякоў

НОВАЯ ГЕРАРХІЯ

Сто беларускіх кніг XX стагодзьдзя

Напярэдадні 1998 году мы падводзім чарговыя вынікі кніжнага рэйтынгу «НН». Нагадаю, што мэта праекту, які мы распачалі ўлетку 96-га і назвалі «Новай Герархіяй», — выявіць разам з нашымі чытачамі 100 найлепшых беларускіх кніг XX стагодзьдзя. Усе дасланыя вамі прапановы заносяцца ў зводны рэдакцыйны сьпіс. Сёньня ў гэтым сьпісе ўжо 620 назваў, шмат якія зь іх згадваюцца нашымі чытачамі па 10, 20 і болей разоў. Гэтак фармуецца рэйтынг, верхнюю частку якога мы пэрыядычна публікуем у «НН». Увесь праект разьлічаны да 2000 году. Вынікам яго стане электронная вэрсія — 100 кніг у Інтэрнэце і на кампакт-дыску. Няма сумневу, што яшчэ праз год-два такія сродкі інфармацыі будуць даступныя прынамсі кожнай бібліятэцы.

Вось некалькі цытатаў зь лістоў, якія прыйшлі да нас пасьля апошняй публікацыі рэйтынгу. Уладзіслаў Іваноў зь Менску піша: «Дужа зьдзіўляе тое, што ў рэйтынгу няма Галіны Булыкі. Няўжо чытачы забыліся пра яе? Каб было магчыма, дык я зрабіў бы яе лідэрам. Яе вершы паўны энэргіі, яны задужа містычныя. Здаецца, наша паэзія мае жаночы твар, бо яны (жанчыны? — Рэд.) пішуць неяк жахліва і прыемна адначасова».

Кніжак Галіны Булыкі сапраўды яшчэ не было ў нашым сьпісе. Але на тое і ўся гэтая задума з рэйтынгам, каб чытачы самі прапаноўвалі сваіх любімых паэтаў. Што да нас, то мы толькі зьбіраем інфармацыю, робім падлікі і гарантуем, што ніводная прапанова чытачоў не выпадае з гэтага сьпісу.

А Ўладзя Жаўняк з Мар'інай Горкі спахапіўся: «Ня ведаю, ці можна мне яшчэ раз прапанаваць сьпіс кніг, якія я не назваў у мінулы раз. Справа ў тым, што XX ст. яшчэ ня скончылася, выдаюцца новыя цікавыя кнігі, ды і на кніжных паліцах можна адшукаць тое, што яшчэ не прачытаў».

Вядома, можна. Бо стагодзьдзе сапраўды яшчэ доўжыцца і зьяўляюцца новыя творы. Праўда, з тых кніг, якія Ўладзю трапілі ў рукі, у нашым сьпісе не было толькі дзьвюх: паэтычнага зборніка В.Таўлая «Пілую вершам краты» і зборніка перакладаў Н.Гілевіча «Роднасьць».

Было б несправядліва не прывесьці тут і прыпіску, якую Ўладзя зрабіў да свайго ліста:

«Восень прынесла новыя знаёмствы. Ня так даўно я стаў сябрам літаб'яднаньня «Літаратар», створанага пры часопісе маладых літаратараў «Першацьвет». Мой новы сябра Янка Лайкаў абяцаў прыслаць у «Нашу Ніву» свае вершы, яму таксама падабаецца правапіс «зь мяккімі знакамі». Апошнім часам я стаў заўважаць, што «НН» больш папулярная сярод моладзі — школьнікаў, студэнтаў. Часта даводзіцца бачыць прывабных дзяўчын, якія трымаюць у руках маю любімую газэту, часта бачу значкі «Наша Ніва» на грудзях у юнакоў і дзяўчат. Прыемна, настрой адразу паляпшаецца ад пачуваньня, што ты не адзін, што ёсьць тыя, каму не абыякавая будучыня нашай літаратуры і краіны».

Сяргей Конан з Жодзіна: «Выбіраць з мноства аказалася вельмі няпростай справай. Я прадумваў розныя шляхі і спыніўся на двух. 1. Эмацыйны, тое што легла на душу лёгкім сьвятлом і дае асалоду ад успаміну пра гэтыя кнігатворы. Пачаць вырашыў, магчыма, зь незвычайнай кнігі. У галаву сьпісу я стаўлю зборнік беларускіх казак «Ня сілай, а розумам». 2. Шлях больш рацыянальны». У кнігах, адабраных паводле другога шляху, мы не знайшлі нічога, што б ня згадвалася раней.

Нашы чытачы часта пішуць пра цяжкасьці і крытэры адбору. Варта паўтарыць тое, што мы ўжо казалі ня раз: называйце СВАЕ кнігі, блізкія і патрэбныя асабіста вам. Няхай гэта будуць зусім суб'ектыўныя падыходы, зь якіх урэшце і складзецца сукупная Вялікая Аб'ектыўнасьць.

Напрыканцы 1997 году кніжны рэйтынг «НН» выглядае наступным чынам (кнігі, якія набралі 10 і болей галасоў. Колькасьць галасоў — у дужках):

Абдзіраловіч. Адвечным шляхам (11)
Адамовіч, Брыль, Калесьнік. Я з вогненнай вёскі (11)
Аляхновіч. У кіпцюрох ГПУ (17)
Арлоў. Таямніцы полацкай гісторыі (14)
Арсеньнева. Пад сінім небам (18)
Архітэктура Беларусі. Энцыкляпэдыя (10)
Багдановіч. Вянок (27)
Беларусь. Энцыкляпэдычны даведнік (12)
Быкаў. Знак бяды (21)
Быкаў. Сотнікаў (15)
Віцьбіч. Плыве з-пад сьвятое гары Нёман (15)
Гарун. Матчын дар (11)
Гарэцкі. Гісторыя беларускай літаратуры (13)
Гарэцкі. Дзьве душы (12)
Гарэцкі. Рунь (16)
Геніюш. Ад родных ніў (11)
Геніюш. Споведзь (24)
Дайнека. Сьлед ваўкалака (10)
Доўнар-Запольскі. Гісторыя Беларусі (11)
Ермаловіч. Па сьлядах аднаго міта (16)
Ермаловіч. Старажытная Беларусь (21)
Ігнатоўскі. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі (17)
Караткевіч. Дзікае паляваньне караля Стаха (22)
Караткевіч. Зямля пад белымі крыламі (13)
Караткевіч. Каласы пад сярпом тваім (19)
Караткевіч. Хрыстос прызямліўся ў Гародні (14)
Караткевіч. Чорны замак Альшанскі (18)
Кіпель. Беларусы ў ЗША (10)
Колас. На ростанях (15)
Колас. Новая Зямля (21)
Колас. Сымон-музыка (10)
Купала. Жалейка (16)
Купала. Спадчына (18)
Ластоўскі. Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі (11)
Ластоўскі. Кароткая гісторыя Беларусі (18)
Ластоўскі. Падручны расейска-крыўскі (беларускі) слоўнік (13)
Маўр. Палескія рабінзоны (14)
Мележ. Людзі на балоце (17)
Разанаў. Вастрыё стралы (11)
Сагановіч. Невядомая вайна (21)
Смоліч. Геаграфія Беларусі (20)
Сяманка. Армія Краёва на Беларусі (10)
Тарасаў. Памяць пра легенды (17)
Тарашкевіч. Беларуская граматыка для школаў (23)
Ткачоў. Замкі Беларусі (12)
Туронак. Беларусь пад нямецкай акупацыяй (17)
Цётка. Хрэст на свабоду (11)
Чаропка. Імя ў летапісе (14)
Энцыкляпэдыя гісторыі Беларусі І і ІІ т. (14)

Чакаем вашых допісаў.

Крыт.



Уладзімер Лобач

ТВАЯ КРАІНА

Яна нікуды не ўцячэ — твая краіна,
І як хапіла ўсім тваім дзядам,
Так хопіць і дачцэ, і сыну,
І ўпоўніцу нап'есься сам.

Да сутаргаў у розуме стамлёным
Ад перагною залатых ідэй,
Юнацкіх募 мараў і чужых праклёнаў.
Твая краіна — вечны калізэй.

А ты — яе нязьменны глядыятар.
Табе адзінай перамогай — сьмерць
З надзеяй, што вусаты пракуратар
Так і ня здолеў зразумець,

Што гэта ўсё ж ТВАЯ краіна,
І як хапіла ўсім тваім дзядам,
Так хопіць і дачцэ, і сыну
Зямлі і волі напалам.

Сяргей

СЛАВА

Сьвяточнае

Чарга ў падземную зеўру больш нагадвае паходную калёну. Яна нагэтулькі даўжэзная, што не параўнаць нават з маўзалейнай. Канчатку хваста не відно. Але гэта не грамадзкая прыбіральня. У сутарэньні публіка займае ўсе тры рухомыя лесьвіцы і старчма спускаецца ў самы дол, разгортвае транспаранты, сьцягі і рушыць пад духавы аркестар. Лёзунгі са старамоднай літарай яць заклікаюць: Уласьць — саўдэпам, фабрыкі — фабрыкантам, рабочым — работу, патроны — салдатам і матросам, зямлю — камбедам, камбікармы — крэсьцьянам, сьмерць памешчыкам і капіталістам, хлеб — галодным, убіўцам Аркадзіча — вышку.

У вагоне цягніка, перапоўненым целаахоўнікамі, гаворыць у мікрафон надзвычай паважны вусаты чалавек у пінжаку з двума шэрагамі гузікаў:

— Мы ціпер адны у Абэвэгэдэ строім мятро. Пачаму? — спросіце вы міне. І я атвечу пачаму. Патаму што таварыш Жалезны, настаяшчая фамілья Шалікашвілі, у цэлях безапаснасьці езьдзіў да сябе на дачу у мятро, каторае спэцальна пракапаў туды з саблюдзеньнем мер сакрэтнасьці і прэдастарожнасьці гераічаскі рабочы клас і лучшыя прэдставіцелі калхознага крэсьцьянства. У этат самы дзень, очэнь многа лет назад, када орды і полчышча стаялі на расстаяньні пушачнава выстрала, ён правёў пад зямлёй празьнічны парційнахазяйственны акціў, а патом узашоў на саркафаг і прыняў парад войск ілі наабарот. Сначала прыняў, а патом у мятры правёў сабраньне і паехаў на дачу, нязаметна для ўрага.

Калёна не затрымліваецца, удзельнікі, як заўжды здараецца на дэманстрацыях, чуюць толькі ўрыўкі прамовы, усё адно як прачытаўшы адзін выдзерты з кніжкі аркушык. Праз адное вуха заляцела, праз другое вылецела вонкі і зьнікла. Ніхто чамусьці не падбаў, каб кожны запомніў па слову з гаварыльні. Для гісторыі. Даклад потым будзе абавязкова размножаны, але ў стэрылізаваным выглядзе. Як страва бяз солі і пернасьцяў. Узьняўшыся на паверхню, дэманстранты скручваюць наглядную агітацыю, разгортваюць парасоны і сумнай чарадой працягваюць рух, ужо зусім несьвяточна, як ваеннапалонныя, паступова зьнікаючы у шэрым мроіве. Ёдкі восеньскі дождж ня мае літасьці. Цягнуцца гадзіны. Але дэманстрацыя не спыняецца.

— Мы капалі, капаем і будзем капаць, штоб карыдор праміком вывеў нас пад самы саркафаг, ежалі па воздуху не палучаецца з-за атрыцацельных мецеаусловій і вечна нялётнай пагоды. Увялічым пасажырапаток, як эці пад морам. Слава народу-труженіку! Палучанай зямлёй мы ў два шчота засыплем усе балоты і радыяцыю, як це закапалі мора і прэспакойна вырошчваюць сабе цюльпаны і картоплю. Зямля — наша багацтва! Людзі — нашы рэсурсы. Заводу «Ударнік» — ура!

Над галовамі вагаюцца, чырванеюць шрыфтам заклікі. Дзепутатаў, сабатажнікаў і энтузіястаў — за рашотку. Альтруістаў і пацыфістаў — пад ружжо. Пэнсіі — пэнсіянэрам! Вучэньне — сьвет, а невучэньне — цьма. Ураг ня дрэмле. Кніга — лучшы падарак. Жалезнава — назад у саркафаг. Экспрапрыяцыю — экспрапрыянтам. Бульбу — бульбашам. Пшонку — пшэкам. Кесару — кесарава. Сярпы — молатам! Чэсьць — па труду.

Аднойчы цывільная частка калёны сканчаецца і яе зьмяняе шэрая салдацкая плынь з 201-ай сухапутнай дывізіі імя туркестанскага рэўваенсавету, пераапранутая ў рабоча-сялянскія аддзелы з чырвонымі бантамі на грудзёх. Салдаты спускаюць у мэтро коней і разборныя тачанкі, бутафорскі браневічок. Днявальныя падбіраюць у мяхі конскія яблыкі. У санітарных двуколках мужна трымаюцца рэвалюцыйна настроеныя матросы з рукамі і нагамі ў гіпсе. Паўз цягнік з аратарам праплываюць чарадою макет гарматы з крэйсэра, электраплугі, серп і молат, барадаты бюст.

— Слава капээсэс. Пяцілетка качэства. Эканоміка даўжна быць эканомнай. Перагонім сэшэ-а ў праізводстве малака. Кожнаму па патрэбнасьці. Жывее ўсіх жывых мёртвыя. Сіводня он іграіт джаз, а заўтра родзіну прадасьць. Загніваюшчы імпэрыялізм. Рэвалюцыя прадаўжаецца. Шпіёнаў, дывэрсантаў і правакатараў — к сьценке! Антыкамуністаў і антысавеччыкаў усіх масьцей — к чорту! Лягер міру і сацыялізму. Усё прагрэсіўнае чалавечаства. Мая хата з краю. Першы блін комам. Кісельныя рэкі — малочныя берагі. Дарэнаму каню ў рот не смотрат! Трудзяшчымся — труд! Праступнікам — наручнікі! Прадажным газэтчыкам — намордвікі! Школьнікам — чарніла! Амонаўцам — хвала і чэсьць! Дзіцям — марожанае, бабам — цвіты! Жулью — учот і кантроль! Не плюй у калодзец, не рубі сук, сіла ёсьць ума ні нада, бязумству храбрых пяём мы песьні.

Часова гасьне сьвятло, пражэктары жоўта і палахліва абмацваюць скляпеньні. Гукавое аздабленьне: жудасныя сірэны, зласьвесны гуд бамбавікоў, глухія хлапкі гарматных стрэлаў, дэцыбэльны сьвіст бомбаў з імклівым павелічэньнем, выбухі. Радыёголас дыдактычна папярэджвае, заклікае, пагражае: родзіна маць завёць, ні шагу назад, панікёрам і распрастраніцелям слухаў, а такжэ правакатарам расстрэл на месьце. Усем немедлена запісацца у дабравольным парадку. Сьмерць урагу не за гарамі.

У шэрых кепках ідуць апалчэнцы. Лыжнікі у белых зімовых апратках. Партызаны, сярэднеазіяцкія стралкі, мангольская кавалерыя на дробных конях Пржэвальскага.

— Хрэн за рэдзьку не слашчэ, палка а двух канцах, прытча ва языцэх, прошчэ паранай рэпы, как два пальца абмачыць, с камунісьцічаскім прыветам, усякаму овашчу сваё ўрэмя, у цеснаце ды не ў абідзе, у ціхім омуце чэрці водзяцца, голад не цётка, у сям'і не без урода, ваўкоў баяцца ў лес не хадзіць, дарага лыжка к абеду, дуракам закон не пісан, меньшэ народу большэ кіслароду, у начале было слова. Я участвую ў хару, как гаварыцца, усе аруць і я ару. Быў бы хлеб а зубы сышчуцца — не ў свае сані не садзісь — не ўсё золата што блішчыць — нашла каса на камень — рускія прыдумалі раяль — не была пячалі так чэрці накачалі — што ў лоб што по лбу — чыя бы карова мычала — труба дзела — хвост пісталетам

Элізабэт Бадэнтэр

ШТО ТАКОЕ

З кнігі «XY. Пра мужчынскую сутнасьць»

Працяг. Пачатак у пазамінулым нумары.

— Каго раніцай вы бачыце ў люстры? — запыталася яна.

— Жанчыну, — адказала белая.

— Вось-вось, жанчыну, — падхапіла тая. — А я бачу нэгрыцянку. Я колер сваёй скуры бачу штодня, бо якраз у ім прычына маёй няроўнасьці ў гэтым грамадзтве. Вы на свой колер скуры не зважаеце, таму нашая роўнасьць ніколі ня будзе здавацца мне цалкам натуральнай.

Кімэл зразумеў пасьля гэтага, што раніцай, узіраючыся ў люстэрка, ён бачыць «чалавечую істоту, унівэрсальную абагульненую асобу». Тое, што ён раней не заўважаў, а менавіта наяўнасьць у гэтай істоты родавых і расавых прыкметаў, зрабілася выключна відавочным. «Сацыялягічнае тлумачэньне такога «асьляпленьня» хаваецца ў тым, — працягвае Кімэл, — што мы часта не заўважаем сваёй прывілеяванасьці».

Сёньня для большасьці з нас мужчына не зьяўляецца болей увасабленьнем Чалавека ўвогуле. Мужчына стаўся адной з іпастасяў чалавека, а мужчынскасьць — паняцьцем адносным, бо яе можна вызначыць толькі адносна жаноцкасьці. Англамоўныя дасьледчыкі настойліва праводзяць думку, што мужнасьці як паняцьця не існуе: «Мужчынскасьць і жаноцкасьць — паняцьці адносныя... Хоць «самец» і «самка» здольныя мець унівэрсальныя характарыстыкі, ніхто ня можа зразумець сацыяльную канструкцыю мужчынскасьці ці жаноцкасьці без суаднясеньня аднаго з другім», — сьцьвярджае той самы Кімэл. Паняцьце мужнасьці, як якасьці, уласьцівай мужчыну, успрымаецца не як нейкае абсалютнае, а як адноснае і разам суадноснае. Са зьмяненьнем сэнсу паняцьця жаноцкасьці (выкліканым, галоўным чынам, жаданьнем жанчыны пераасэнсаваць сваю сутнасьць), і мужчынскасьць таксама губляе глебу пад нагамі.

Гісторыя патрыярхальных грамадзтваў сьведчыць, што заўсёды якраз жанчыны пачынаюць перагляд падыходаў да гэтай праблемы. Гэта, зрэшты, лёгка тлумачыцца, калі згадаць прывілеяванасьць становішча мужчынаў у грамадзтвах такога кшталту. Аднак найбольш глыбокія крызысы мужнасьці зьвязаныя ня толькі з праблематыкай улады, важная роля ў іх разуменьні належыць таксама псыхалёгіі. Насуперак патрыярхальным уяўленьням, галоўным крытэрам чалавечага роду зьяўляюцца жанчыны, а не мужчыны, а мужчыны вызначаюць сваю сутнасьць толькі адносна іх. Прынамсі, так было толькі да апошняга часу. Але няхай мужчыны не турбуюцца: не ўпершыню ў гісторыі адбываецца крыза мужчынскасьці.

НЕБЯСЬПЕЧНАЯ МУЖНАСЬЦЬ

Мужчынскі гвалт — гэта не ўнівэрсальнае паняцьце. Ягонае значэньне адрозьніваецца ў розных грамадзтвах. Зразумела адно: там, дзе культ мужчынскасьці працягвае панаваць як, напрыклад, у ЗША, мужчынскі гвалт — сур'ёзная небясьпека. Напачатку 70-х гадоў Нацыянальная камісія ЗША па прычынах і прадухіленьні гвалту адзначала: «У нашай краіне адбываецца значна большая колькасьць забойстваў, згвалтаваньняў і крадзяжоў, чым у іншых сучасных стабільных і дэмакратычных краінах». У дакладзе камісіі таксама паведамлялася, што большасьць злачынстваў была ўчыненая мужчынамі ва ўзросьце ад 15 да 24 гадоў. «Доказ мужнасьці, — тлумачылася ў дакладзе, — вымагае ад мужчынаў дэманстратыўнай жорсткасьці, эксплюатацыі жанчынаў і агрэсіўнасьці рэакцыі».

За апошнія 20 гадоў сытуацыя значна пагоршылася, і разрыў паміж Амэрыкай і Эўропай пагатоў павялічыўся. Мы ўжо адзначалі рост мужчынскага гвалту ў дачыненьні да гомасэксуалістаў у ЗША. Галоўнымі ахвярамі насільля і пабояў, аднак, ёсьць жанчыны. Лічба згвалтаваньняў узрастае ў ЗША значна хутчэй, чым лічба іншых злачынстваў. ФБР лічыць, што пры захаваньні падобных тэндэнцыяў кожная чацьвертая жанчына аднойчы ў жыцьці будзе згвалтаваная. Калі дадаць да гэтага, што кожны год 1,8 мільёнаў мужоў зьбіваюць сваіх жанок, можна ўявіць сабе той сьвет насільля, у якім жывуць амэрыканкі, і іхны страх перад мужчынамі. Заўсёдная боязь згвалтаваньня, у якой няма нічога агульнага з фантазіямі нейкай істэрычкі, прымусіла адну жанчыну сказаць наступнае: «Гэта скажае сэнс паняцьця ноч... А на ноч прыпадае палова ўсяго часу». У 1971 годзе фэміністка С'юзан Грыфіт уразіла грамадзкую думку, заявіўшы: «Я так і не пазбавілася страху быць згвалтаванай». Яна лічыць галоўным віноўнікам гэтага патрыярхат, які разглядае гвалт над жанчынай як сымбалічны выраз мужчынскай перавагі. Больш радыкальна настроеныя С'юзан Браўнмілер і Андрэа Дуоркін сьцьвярджаюць, што схільнасьць да гвалту зьяўляецца неад'емнай часткай мужчынскай сэксуальнасьці, неабходнай для сьцьвярджэньня мужчынскай перавагі. Паколькі патрыярхат — дадзенасьць унівэрсальная, можа падацца, што ўсе мужчыны зьяўляюцца патэнцыяльнымі гвалтаўнікамі... Адзін зь іх нават прыйшоў да наступнай высновы: «Розьніца між гвалтаўніком у літаральным і юрыдычным сэнсе гэтага слова і іншымі мужчынамі крыецца ў тым, што большасьць з нас спыняецца на больш нізкай ступені прымусу і гвалту».

Антраполягі і псыхолягі зацята аспрэчваюць тэорыю пра «самца-гвалтаўніка». Ангельскі антраполяг і фэміністка Пэгі Рыўз Санды наглядна прадэманстравала, што схільнасьць да гвалту мяняецца ў залежнасьці ад грамадзтва. Напрыклад, на высьпе Суматра згвалтаваньні — зьява вельмі рэдкая, таму што там жанчыны карыстаюцца павагай і адыгрываюць важную ролю ў прыманьні калектыўных рашэньняў. У гэтым грамадзтве дачыненьні паміж поламі бліжэйшыя да роўнасьці. Тая ж самая карціна назіраецца ў індзейцаў з племені Арапэш у Амэрыцы, якіх дасьледавала Маргарэт Мід, у жыхароў высьпы Таіці, побыт якіх апісаў Робэрт Леві, і ў некаторых афрыканскіх плямёнаў, што жывуць з паляваньня і зьбіральніцтва. Ня трэба шукаць прыкладаў па ўсім сьвеце, дастаткова сказаць, што суадносіны колькасьці згвалтаваньняў у Англіі і ЗША складаюць 1:17, а ў Францыі і ЗША — 1:20.

Тэза, паводле якой згвалтаваньне вызначаецца як неад'емная частка мужчынскай сэксуальнасьці, ніколі не была давedзеная. Да таго ж, яна шкодзіць мужчынскаму полу ўвогуле. Псыхолягі, што змагаюцца з праблемай гвалтаўнікоў, схільныя лічыць, што згвалтаваньне — гэта паталёгія, а не праява нармальнай мужнасьці, праблема ўсяго чалавечага роду, а ня толькі мужчынаў. Згодна з дасьледаваньнямі Дэвіда Лісака, згвалтаваньне — гэта перш

Астравец

АКЦЯБРУ

апавяданьне

— дуба даць — брэд сівой кабылы — ва ўсю іванаўскую — мірны атам —браць за жабры — работа не воўк — мора па калена — з ваўкамі жыць — з бухты-барахты — дзяржы карман шырэ...

Ансамбаль песьні і пляскі рушыць, выконваючы сваю звычайную справу. Паходныя кухні пахнуць грэчневай кашай і ўкраінскім баршчом.

— Глаўнае дысцыпліна і парадак. Парадак і дысцыпліна. Парадак, парадак і ешчо раз парадак. І дысцыпліна тожэ. За апазданьне на работу к пазорнаму стаўпу. Я вам гавару нет злабадцеўнее вапроса. Як вучыў вождзь і вучыцель. Дысцыпліну і парадак паставім ва главу вугла. Паўтараю на парадке дня. Усё ўрэмя нада помніць. Нікагда не забываць. Днём і ноччу. Дысцыплініраваны значыць парадачны. Дысцыпліна эта глаўнае. Нет важней задачы чэм. Слушайце ўнімацельна парадак краевугольны камень дысцыпліны і ў абратным прадку. Ані ўкралі нашу пабеду.

Вязуць драўляную клетку, у якой раздражнёная мужчынская публіка, вандроўная рэвалюцыйная трупа ці агітбрыгада, выгукае ва ўсе бакі:

— Ачэрэдная групавая правакацыя!

— Спланіравана і аплачана з-за рубяжа!

— Нацыянал-экстрымісты, рафініраваная інцелігенцыя! Эта з іх учасьціем была развалена наша вялікая родзіна-маць-перамаць-Ёкэлэмэнэ!

— Усячэскі парочат наш абшчэственны і гасударственны строй, дыскрэдзіціруюць нашага горача любімага Усенароднаабранага! Пошласьць і парнаграфія!

Хорам:

— Мы, ніжэпадпісаўшыеся, кляймім пазорам перавёртышэй, правакатараў і прыспасабленцаў і прызываем усех чэсных граждан пасьледаваць нашаму прымеру.

Гучаць рэдкія, але апантаныя воплескі, клетка пляскае сама сабе і зьнікае.

— Раз на кані раз пад канём ад сумы і ад цюрмы ніхто з вас не застрахован качэства пераходзіць у калічэства і наабарот зьвярыны аскал імпэрыялізму саобшчнікі і пасобнікі есьлі ўраг не здаёцца яго ізьнічтажаюць хто не з намі той проціў нас лес рубяць шчэпкі ляцяць сацыялізм з чалавечаскім ліцом хто не работае той не ест што ў лоб што по лбу ні к селу ні к гораду ні слухам ні духам ні туды ні сюды ні ў красную армію гусары дзенег не беруц-с нечыва ўзяць кроме аналізаў сыт па горла сам бог вялеў бог яго знае слава богу бог любіць тройцу беражонава бог беражэ аднаму богу ізвесна опіюм для народу богаўгоднае завядзеньне эта па-божаску яй-богу бога за бараду ухапіць як у бога за пазухай бог цярпеў і нам вялеў бог ня роўна дзеліць здзелаў дзела гуляй сьмела цішэ едзеш дальшэ будзеш старасьць не радасьць салдат сьпіць служба ідзёць там харашо гдзе нас нет вутра вечара мудранее фядот ды ня тот фількіна грамата два сапага пара хлеб усяму галава не лыкам шыты цыплят па восені шчытаюць чужая душа пацёмкі што хачу то і варачу яблака ад яблака падае язык мой ураг мой павідла джэм палезна ўсем народ і парція ядзіны ўсё для народнага фронту ўдрызг і ўтрэск не трогай дзярмо трус не іграе ў хакей трэзвасьць норма жызьні. Як гаварыцца, не богі гаршчкі апякаюць.

— Благадару за ўніманьне. З празьнічкам. Зашчыта чэсьці і дастоінства — лашадзіная доза — вучыцца вучыцца і ешчо раз вучыцца — сапагі ўсьмятку — дзьве галавы харашо а адна лучшэ — у каго што баліць — як мёртваму прыпаркі — ты паможаш тут каню як хваробе кашаль — і мацер'яльныя блага пальюцца як ізрогаізабільля — граніцанакрэпкімзамку!

Калі апошні кірзавы бот пакідае эскалятар, цягнік са словаахвочым прамоўцам зьнікае у невядомым пакірунку, у суцяраньне з прыглушаным сьпевам «есьць у рэвалюцыі начала, нет у рэвалюцыі канца» спускаюцца рабочыя з рыдлёўкамі на плячы, каб капаць далей.

МУЖЧЫНА*

за ўсё вынік няўдалага вызначэньня мужчынскай тоеснасьці і залішняга падаўленьня жаночага пачатку, які мужчына ўспрымае як варожы сабе. Псыхалягічны партрэт гвалтаўніка адпавядае ня ўсім мужчынам. Наадварот, згвалтаваньне вымагае нянавісьці да іншага індывіда, тады як многія мужчыны прызнаюцца, што ня здольныя мець полавых зносінаў у надобных умовах. Такім чынам, мадэль надзвычай мужнага, дэфэмінізаванага мужчыны — гэта крыніца крызысу мужчынскай тоеснасьці (мужчына ўжывае падвойны гвалт: як у дачыненьні да іншых, так і да сябе самога).

Апошнія 20 гадоў існуе меркаваньне, што састарэлы ідэал мужчыны зьяўляецца ў пэўнай ступені фатальным для яго самога. Канадзкі псыхоляг Сідні Журар першы сфармуляваў гэтую гіпотэзу, якая зыходзіць вось з чаго: у 1900 годзе працягласьць жыцьця жанчынаў у ЗША была 48.3 гады, а мужчынаў — 46.3 гады. У 1975 годзе гэты паказчык склаў адпаведна 76.5 і 68.7 гадоў. У наш час разрыў паміж гэтымі лічбамі складае каля 8 гадоў для ўсіх заходніх краін. У сувязі з гэтым узьнікаюць два пытаньні: чаму існуе такая розьніца і чаму разрыў настолькі вырас у параўнаньні з пачаткам стагодзьдзя?

Біягенэтычная гіпотэза, прапанаваная Мантагам у 1953 годзе, тлумачыць нерадродавую, дзіцячую і дарослую мужчынскую сьмяротнасьць уразьлівасьцю Y-храмасомы, якая ўтрымлівае менш генэтычнай інфармацыі за жаночую X-храмасому. Але канстатацыя гэтага факту не дае адказу на другое пытаньне. Апроч таго, біялёгія не пацьвярджае гіпотэзы, што жаночыя клеткі, тканкі і арганізм жанчыны ў цэлым больш жыцьцяздольныя за мужчынскія. Пануючая ў наш час псыхасацыяльная гіпотэза выкрывае тыя выпрабаваньні, зь якімі сутыкаецца мужчына ў працэсе рэалізацыі сваёй ролі.

Журар сьцьвярджае, што першапачаткова мужчыны маюць тыя ж псыхалягічныя патрэбы, што і жанчыны (кахаць і быць каханым, выказваць эмоцыі і пачуцьці, быць актыўным і пасіўным), але мужчынскі ідэал не дае мужчыну магчымасьці задаволіць гэтыя «чалавечыя патрэбы». Іншыя дасьледчыкі настойваюць на існаваньні фізычных небясьпекаў, што падпільноўваюць «крутога» мужчыну: хлопчыкам прыходзіцца рызыкаваць, а гэта прыводзіць да няшчасных выпадкаў (напрыклад, у бэйсболе); яны паляць, п'юць і лётаюць на матацыклах і машынах (якія выступаюць як сымбаль мужнасьці). Іншыя сьцьвярджаюць сваю мужнасьць з дапамогай індывідуальнага ці калектыўнага гвалту. Акрамя таго, канкурэнцыя і стрэс у прафэсійнай дзейнасьці, бясконцая пагоня за дасканаласьцю робяць мужчыну яшчэ больш уразьлівым. Высілкі, якія патрабуюцца ад мужчыны, каб адпавядаць ідэалу, выклікаюць пачуцьцё неспакою, страх перад пагрозай прымушаюць стрымліваць эмоцыі і правакуюць патэнцыяльна небясьпечныя і разбуральныя паводзіны ў адказ. Калі прыняць да ўвагі ўнутранае адзінства мужчыны, уплыў псыхічнага дыскамфорту на фізычнае здароўе, і той факт, што мужчыны зь вялікімі высілкамі і значна радзей за жанчын зьвяртаюцца да доктара альбо псыхоляга, то прычыны скарачэньня працягласьці жыцьця мужчынаў становяцца больш відавочнымі. А калі да гэтага дадаць, што ў нашым грамадзтве жыцьцё мужчыны каштуе таньней за жыцьцё жанчыны (жанчыны і дзеці ўсюды маюць перавагі!), што падчас войнаў якраз мужчына робіцца гарматным мясам, што паказ гібелі мужчыны (у кіно і па тэлебачаньні) стаўся звыклай справай, гэткім штампам мужнасьці, то ёсьць усе падставы разглядаць традыцыйную мужнасьць як пагрозу жыцьцю мужчыны.

Пераклаў з французкай Зьміцер Дзьмітрук

ЛАТЫСКІЯ КАЗКІ

ТРЫ НЕМЦЫ Ў РАСЕІ

Аднойчы заехалі тры немцы ў Расею, але не разумелі ніводнага слова па-расейску. Здарылася ім ісьці праз адну вёску, дзе хлапчукі на дарозе гулялі. Бачачы чужых людзей, што ішлі міма, хлопцы сказалі: «Тры немца».

Немцы разгадалі значэньне гэтых словаў ды і ўзялі іх на ўвагу. Тады зайшлі яны на рынак, дзе часта чулі слова «нічэво» — і яго таксама запрыкмецілі. Прадаўцы, атрымаўшы ад пакупнікоў грошы, часьцяком гаварылі: «Совершэнно верно!», што падарожнікі гэтак запомнілі ж.

Ідучы далей, апынуліся яны ў вялікім лесе, дзе на ўзьлеску ляжаў нейкі зьбіты чалавек. Паколькі ў Нямеччыне гэткі выпадак — рэдкасьць вялікая, дык яны захацелі яго бліжэй агледзець. Адзін нават той дрын падняў, якім, як трэба думаць, той чалавек быў зьбіты. У той жа самы момант падыйшлі паліцэйскія, якія падумалі, што гэтыя самыя й ёсьць тыя зламысьнікі, дый спыталіся: «Хто гэтага чалавека зьбіў?»

Немцы падумалі, што ў іх пытаюцца, хто яны такія, і таму адказалі: «Тры немца».

Пачуўшы такое прызнаньне, паліцэйскія пыталіся далей: «Як вы насьмеліліся гэтага чалавека зьбіць на горкі яблык?»

Немцы падумалі, што ў іх пытаюцца, што яны тутака робяць, і адказвалі палкам спакойна: «Нічэво!»

Тут паліцэйскія сказалі: «За такое злоснае злачынства вы павінны зараз жа пайсьці ў турму».

Немцы, падумаўшы, што ім цяпер дазваляецца ісьці сабе далей, адказалі: «Совершэнно верно!»

ЖЫД У ЦЯРНОВЫМ КУСЬЦЕ

Хлопец пасьвіў скрай бальшака гаспадарскія гусі. Пасьвячы, знайшоў ён на зямлі такую сьвістульку, што як падзьмеш у яе, дык усе, хочаш - ня хочаш — мусяць скакаць. Міма ехаў нейкі жыд з ганчарным посудам на возе. Бачачы гусінага пастуха аднаго, жыд кажа: «Аддай мне адну гусь!»

Пастух кажа: «Гэта ж гаспадарскія гусі, як я магу даць?»

«Калі ты ня хочаш даць, дык я сам вазьму».

Сказаўшы гэтак, жыд злазіць з калёсаў і пачынае лавіць самую тлустую гусь. Гусь, уцякаючы, забегла ў нейкі цярновы куст. Як толькі жыд возьме гусь у рукі, так пастух пачынае дзьмуць у сваю сьвістульку. А жыд, хочаш - ня хочаш, мусіць скакаць. Церні разадралі яму вопратку дый сталі ўжо драпаць па скуры. У пастуха — літасьцівае сэрца, ён засунуў сьвістульку ў кішэню, і жыд зноў усеўся на сваім возе. Аж тут ён бярэцца крычаць ды гусінага пастуха мацюкаць. Чуючы гэта, хлопец зноў вымае сваю сьвістульку і пачынае дзьмуць. Жыд падымаецца на сваім возе дый давай танчыць і сам свой посуд таптаць. Тут ён аддае свой гаманец з грашыма пастуху і просіць, каб той больш не сьвісьцеў у сьвістульку сваю тую. Хлопец грашам рады і ня сьвішча болей.

Вось жыд зьяжджае прэч, але ж яму вельмі шкада сваіх грошай і разьбітага посуду. Ён зараз жа едзе ў суд ды скардзіцца на хлопца, што той у яго сілай грошы адняў і посуд пабіў. Хлопец адмаўляецца, але суд болей верыць жыду і прысуджвае хлопца павесіць. Тады хлопец просіць, каб яму дазволілі яшчэ апошні раз падзьмуць у сваю сьвістульку. Як толькі хлопец задзьме, так усе судзьдзі, варта і жыд мусяць скакаць. Жыд убачыў, што, сам будучы вінаватым, зноў трапіў у няшчасьце, ды прызнаўся, што схлусіў. Судзьдзі апраўдалі пастуха і аддалі яму жыдоўскія грошы, а хлусьліваму жыду прысудзілі лупцадрала.

МАСКАЛЬ НА НЯБЁСАХ І Ў ПЕКЛЕ

Маскаль у сьвеце перацярпеў усякіх цяжкасьцяў і перажаыў усякіх жахаў, таму ўжо ён нічога больш і не баіцца. Так, нейкі маскаль мусіў аднойчы зайсьці далёка-далёка ў чужую зямлю. Ішоў ён, ішоў, пакуль не заблукаў. Блукаючы, зайшоў ён урэшце ў такое месца, дзе зямля канчаецца, і няма далей куды йсьці. Маскаль быў вельмі стомлены і думаў тут жа пераначаваць. Забіў ён у нябёсы аднаго цьвіка, павесіў туды свой кажух і давай піпчыць сваю піпку. Калі забіваўся цьвік, узьняўся вялікі грукат, што аж на нябёсах пачулі ды паслалі двух анёлаў паглядзець, што там здарылася. Прыходзяць анёлы дый бачаць: ляжыць сабе нейкі маскаль на голай зямлі з каменем пад галавой. Стала анёлам шкада маскаля. Разбудзілі яны яго і завялі на неба. Ледзь маскаль убачыў хараство нябеснае, дык тут жа сон прапаў і спаць адразу расхацелася. Каб дух узьвесяліць, хацеў ён трошкі затытуніць, аж, на шчасьце, забыўся сваю піпку. Тут маскаль і просіць у анёлаў: «Ці нельга крыху тытуню здабыць, каб затытуніць?»

«Не, гэтага нельга! — адказваюць анёлы. — Тытунь — нячыстая зёлка, і на нябёсах тытунь ня паляць».

«Як нельга, дык нельга, — мяркуе маскаль. — А самагон ці ёсьцека?»

«Самагону таксама нямаш, бо яго чорт прыдумаў».

Зажурыўся маскаль і давай прыслухоўвацца, ці не чуваць дзе якую песьню вясёлую, каб сьпявалі. Але такой нідзе ня чутна. Не падабаецца ўжо маскалю з анёламі вадзіцца, і ён гаруе сам сабе: «Сьвятыя на небе, як бачу, ня кураць, ня п'юць і песень вясёлых не сьпяваюць гэтаксама, але ж жывы чалавек ня можа жыць як намаляваны сьвяты».

Сыходзіць маскаль дый давай шукаць такое месца, дзе можна разгуляцца. Ішоў ён да тых пор, пакуль не зваліўся зь нябёсаў і ад высокага падзеньня не застаўся ляжаць на зямлі пластам. Маскаль пытаецца: «Ці няма тут якой шкляначкі самагону?»

«Цэлых дзьве пляшкі,» — чуе ён голас.

Выпіўшы адну шкляначку, маскаль ізноў пытаецца: «А ці няма тутака й тытуню таксама?»

«Таксама ёсьць!» — адказвае той, хто падышоў, і зараз жа прыносіць тытуню.

Запаліўшы, чуе маскаль, як і песьню вясёлую засьпявалі. Ён пытаецца ў свайго таварыша: «Дзе гэта я?»

«У пекле,» — яму адказваюць.

«Што гэта за пекла, — кажа маскаль, — дзе можна піць, курыць і песень вясёлых паслухаць?»

Так маскаль і застаецца ў пекле і зусім ня хоча вяртацца болей на нябёсы.

Пераклаў з латыскай Андрэй Гуцаў

СТО ТВОРАЎ МАСТАЦТВА XX СТАГОДЗЬДЗЯ

ЛЯВОН ВІТАН-ДУБЕЙКАЎСКІ. КАСЬЦЁЛ ПЯТРА І ПАЎЛА

Мсьціслаўшчына сярод іншых краёў Беларусі займае выключнае месца, дзякуючы сваім сынам. Сярод даўжэзнага сьпісу тутэйшых славутасьцяў ёсьць і імя Лявона Вітан-Дубейкаўскага. Бадай, за ўсю нашую гісторыю XX стагодзьдзя гэта адзіны дойлід, які застаўся цалкам несавецкім, але цалкам беларускім. Гэта адзіны дойлід, які абгрунтаваў беларускасьць свайго творчага мэтаду...

... Ён нарадзіўся ў фальварку Дубейкава, у клясычнай шляхецкай сям'і гербу «Вітан» («Відун»), якая вяла свой старажытны радавод ад літоўскіх князёў. У сям'і, як і мусіла быць, валодалі польскай і расейскай мовамі. Як і мусіла быць, матчынай мовай была беларуская. Па сканчэньні Мсьціслаўскае школы, бацькі, ня хочучы згубіць сына ў Расеі, адправілі яго на вучобу ў Варшаву. Для іх гэта было прадметам асаблівага гонару. Варшаўская Школа будаўнічых рамёстваў (Szkoła rzemiosł budowlanych) стала першым вакном у шырокі сьвет і першым крокам у архітэктуру...

... Дзе б пазьней ні зьяўляўся Вітан-Дубейкаўскі, сьвет дойлідаў адкрываў яму ўсё новыя і новыя магчымасьці. З Варшавы ён перабраўся бліжэй да родных мясьцінаў, у Смаленск, дзе адразу адкрыў сваё прыватнае бюро. Як лёгка яму, зусім маладому будаўніку (25 гадоў) дастаюцца замовы! Сярод галоўных ягоных твораў тае пары: цэрквы ў Манастыршчыне і Ярцаве, скарбніца ў Вязьме. У 1894 годзе ён перамагае ў конкурсе на будаўніцтва мураванага касьцёла ў Смаленску. Вялікі дзьвюхвежавы касьцёл таксама таямнічым чынам быў пабудаваны ў рэкордныя тэрміны — за два гады. На гэты ж час прыпадае «рэстаўрацыйны» пэрыяд у творчасьці маладога дойліда. З 1895 да 1901 году ён праводзіць рэстаўрацыю касьцёлаў у Крычаве, Смалянах (разам з Даўкшам), Воршы, Сьвіслачы (каля Асіповічаў) і, вядома, у родным Мсьціславе. У 1901 годзе Дубейкаўскі будуе ў Смаленску фабрыку жалеза-бэтонных вырабаў. Някепскі плён для 32-х гадоў...

... Адчуваючы брак адукацыі, у 1902-м Дубейкаўскі едзе ў Пецярбург, дзе працягвае вучобу ў Інстытуце цывільных інжынэраў, які сканчае ў 1903 годзе з дыплёмам інжынэра-архітэктара. Пасьля ізноў вяртаецца ў Смаленск, ва ўласнае бюро. Вольны муляр... На гэтым ён ня можа спыніцца. Ён прагне эўрапейскіх даляглядаў. Ён прагне Парыжа. Тры гады вучобы ў парыскай Спэцыяльнай Архітэктурнай Школе (Ecole Special d'Achitekture), дзе ён атрымаў дыплём архітэктара-мастака, канчаткова сфармавалі яго мадэрністам. Як Вітан-Дубейкаўскі жыў у Парыжы, чым натхняўся, пра што марыў — застаецца таямніцаю...

... Жыцьцёвыя шляхі гэтага чалавека былі пакручастыя. Часам, угледаючыся ў ягоную біяграфію, можа здацца, што ён хутчэй нейкі канспіратар, разьведчык, чым саліды архітэктар-практык з грунтоўнаю адукацыяй.

Набліжалася сусьветная вайна... У 1910 годзе Дубейкаўскі ў Варшаве, дзе працуе ў вядомай фірме Лільпопа й Янкоўскага і выкладае ў Тэхнічна-прамысловай школе інжынэра Пятроўскага. Пасьля закладае ўласнае бюро і становіцца сябрам «Koła architektów w Warszawie». У 1915 годзе ён у Арле, пасьля ў Менску, у 1916-м у Петраградзе, ізноў у Менску, Арле, і нарэшце, у 1918-м — у Варшаве, дзе ачольвае Беларускі Нацыянальны Камітэт. Пры тым, паўсюль, дзе б ён ня быў, ён праектуе і будуе заводы, дамы, сядзібы. Ніякіх праблемаў ні зь перамяшчэньнем, ні з грашыма...

... Крыніцы свае беларускае сьведамасьці ён называў сам: маці, якая ніколі не цуралася роднае мовы і кніжачка Багушэвіча, якую паказаў яму мсьціслаўскі ксёндз. Яшчэ напрыканцы мінулага стагодзьдзя, працуючы ў Смаленску, Дубейкаўскі пачаў зьбіраць беларускі фальклёр. Пісаў па-беларуску вершы, апавяданьні, ліставаўся зь беларускімі газэтамі...

(1869/1867?), в. Дубейкава Мсьціслаўскага павету — 1940, Вільня) архітэктар, інжынэр, пэдагог, паэт, фальклярыст. Скончыў школу будаўнічых рамёстваў у Варшаве. З 1897 — прадпрымальнік-будаўнік у Смаленску. У 1903 атрымаў званьне інжэнэра-будаўніка ў Пецярбургу. У 1907-09 вучыўся ў Парыжы і атрымаў дыплём архітэктара-мастака. З 1910 да 1915 жыў у Варшаве. З 1922 —выкладчык мулярскае школы ў Вільні (1925-29 — дырэктар). Пахаваны на віленскіх могілках Росы.

У кастрычніку 1916 году Дубейкаўскі зьявіўся ў Петраградзе. Трэба меркаваць, што гэты візыт быў зьвязаны зь беларускім рухам, бо апроч фінансавых апэрацыяў і грамадзкай дзейнасьці, ніякіх сьведчаньняў аб іншых работах няма. Аднак, праз колькі тыдняў яго знайшоў ксёндз Будзька (малавядомы й цікавы пэрсанаж) і замовіў яму праект драўлянага касьцёлу ў беларускім стылі... Гэты праект прызначаўся для вёскі Янатруда ў Полацкім павеце. У студзені 1917 году праект быў зацьверджаны Міністэрствам і ўжо ўлетку меліся распачацца будаўнічыя работы...

Лютаўская рэвалюцыя скасавала ўсе пляны. Праект застаўся незрэалізаваным. Як напісаў пазьней сам Вітан-Дубейкаўскі: «Спусьця нейкага часу дачуўся, што і ксёндз Будзька ад рэвалюцыі, у цяжкіх абставінах, растаўся з гэтым сьветам. Гэтыя сумныя падзеі, а так-жа недаконачаная сымфонія архітэктурнай паэзіі, абнялі мяне цяжкім сумам»...

Што ж уяўляў сабою той, першы ў гісторыі праект беларускага стылю? У сваёй кнізе «Эвалюцыя і рэформа дзераўлянага будаўніцтва» Дубейкаўскі гэткім чынам апісвае працу над гэтым праектам: «Заданьне было, хоць і прыемнае, але даволі цяжкое, бо-ж у літаратурэ — ані тэхнічнай, ані архітэктанічнай аб беларускім стылю не было ніякага ўспаміну. Але, як трэба — то трэба! Застаўшыся безь літэратурнай падмогі, глыбока ўдумаўся ў заданьне, у ідэю нашага стылю, і запраектаваў касьцёл. Праўда, не зусім тут мая заслуга — галоўна памаглі думы-думы з духа Нашага Народу». Можа трохі наіўна, але трапна. Гэтая кніга, першая нацыянальная спроба стварыць тэорыю беларускага дойлідзтва, была разьлічаная на шырокае кола чытачоў.

Паводле праекту, касьцёл у Янатрудзе мусіў уяўляць сабою просты ў пляне, кампактны будынак, зь вялікім прасторным нэфам і вялікай шмат'яруснай вежаю-званіцай над харамі. З боку галоўнага ўваходу мусіла быць прасторная галерэя на чатырох тонкіх калёнах, крытая вялікім гонтавым шатром. Шацёр галерэі плаўна абдымаў вежу, пераходзячы ў суцэльны дах над усёй бажніцаю, краі якога мякка выгіналіся на доўгіх кроквах. Чатырох'ярусная вежа спалучала ў сабе рысы ўсіх традыцыйных прыёмаў, у яе вобразе не было нічога спэцыфічна каталіцкага, рымскага, далёкага. Гэтая бажніца з роўным правам магла б служыць прататыпам і для каталікоў і для праваслаўных і для пратэстантаў. Вельмі выразны, дынамічны абрыс, сканцэнтраваная сымэтрычная кампазыцыя, адсутнасьць штучнага дэкору — гэтак мысьліць мог чалавек ужо XX стагодзьдзя. І дрэва... Прынцыпова дрэва. Ясная канструкцыя зрубу, непрыхаваная ні тынкоўкаю ні шалёўкаю, стварала сваю самастойную эстэтычную каштоўнасьць. І ў гэтым Дубейкаўскі бачыў адметнасьць беларускага кшталту, аддаючы перавагу спрадвечнаму, любімаму і звычнаму тутэйшаму матэрыялу. Ён піша: «І гэткі першабытны спосаб рубкі дзераўлянага зрубу цэніцца ў нас, на Беларусі — з прадвеку. Як і цяперыка бачым — увесь наш край: сёлы, мястэчкі, гарады разам зь Вільняю аб гэтым ясна сьведчаць...»

Падчас праектаваньня касьцёлу ў Янатрудзе, Дубейкаўскаму давялося шукаць уласную, найноўшую сыстэму драўлянага зрубу дзеля максымальнага выяўленьня якасьцяў дрэва, як паўнавартаснага эстэтычна матэрыялу, які не патрабуе дадаткаў. Найбольшай праблемаю было прадухіліць растрэсківаньне дрэва і зрабіць цеплаізаляцыю памешканьня. Раней, як і тысячу гадоў таму (і да сёньня), шчыліны паміж бёрнамі зрубу груба забіваліся імхом, альбо кастраю. Зь цягам часу дрэва рассыхалася і мела непрывабны выгляд. Гэтую хібу драўлянае канструкцыі хавалі пад шалёўкаю ці тынкоўкаю, хаваючы тым самым пачатковы выгляд і матэрыялу, і канструкцыі. Аднак гэтыя прыёмы недасканалыя, бо спрыяюць толькі хутчэйшаму трухленьню дрэва. Дзе ж выйсьце? Дубейкаўскі пісаў: «... прыняўся натужна, каб сканструяваць нешта адпаведнейшае, і ўзяўся шкіцаваць — клясьці на паперу ўсялякія магчымасьці, і ў рэзультаце дайшоў к памыснай разьвязцэ...» Сутнасьць мэтаду, вынайдзенага Дубейкаўскім, была ў адмысловай сыстэме пазоў па бярвеньнях і способу зарубкі вугла, канцы якога абпільваліся зь ліцам сьцяны, утвараючы суцэльны, эканамічны аб'ём. Адольф Клімовіч у «Матэрыялах да біяграфіі дзеячоў беларускай культуры і нацыянальнага руху» адцеміў: «... собскую тэхніку будаваньня з дрэва выясьніў Дубейкаўскі ў падручніку будаваньня...» Новая сыстэма была ўхваленая ў 1923 годзе Таварыствам архітэктараў у Вільні. Але гэта была пакуль тэорыя...

У 1924 годзе Лявон Вітан-Дубейкаўскі праектуе касьцёл для мястэчка Дрысьвяты, што на Браслаўшчыне. Але да рэалізацыі праекту мінае яшчэ колькі гадоў. Тымчасам ён будуе царкву старавераў у Відзах, факультэт мастацтва Віленскага ўнівэрсытэту (сёньня Акадэмія мастацтваў), лясьніцтва ў Шумску, падлясьніцтва ў Кене, шэраг прыватных дамоў, уласную сядзібу ў Вільні, на Пагорнай. Увесь час не перапыняе выкладчыцкую працу. Яшчэ ў 1919 годзе ён выкладаў на беларускіх настаўніцкіх курсах у Горадні і ў Вільні. А ў 1925 — стварае й кіруе Школай будаўлянага рамяства ў Вільні.

У 1927 годзе Дубейкаўскі нарэшце прыступіў да будаўніцтва касьцёлу ў беларускім стылі... На велізарным пагорку старажытнага замчышча, які паўвыспаю далёка заходзіць у шырокае Дрысьвяцкае возера, стары касьцёл быў пастаўлены яшчэ ў XV ст., але шматкроць гарэў. На тым самым месцы распачалася новая будова. Праз два гады высокія вежы касьцёлу ўзьнесьліся па-над дрысьвяцкімі разлогамі. Пазьней дойлід напіша: «... бярэ ахвота пахваліцца монумэнтальнай будовай — дзераўляным, трох-навовым з высокай вежай касьцёлам, пабудованым — тымі-ж 16-18 летнімі вучэньнікамі, у два летніх сэзоны — у 1927-ым і 1929-ым гадох у Дрысьвятах, у павеце Браслаўскім..., ... сьцены агэблёваны нагладка, у злучвах, між вянцоў не відаць ані мшэньня, ані шчэлак, столь — на закладку, а на кантах бэлек цягнецца разьба шнурочкам... і ўсе паасобныя фрагмэнты выпаўнены па-мастацку, а ў агульнасьці даюць сымпатычную сынтэзу...» Асобна Дубейкаўскі спыняецца на вонкавым вобразе касьцёла: «... прапорцыі асобных часьцінаў, якія ствараюць монумэнтальную форму, прыпамінаючы наш беларускі стыль».

Галоўны фасад касьцёлу Пятра і Паўла вельмі блізкі да праекту касьцёла ў Янатрудзе, але галоўная вежа нашмат вышэйшая і страмчэйшая. Да яе кампазыцыйна прывязаная моцна разьвітая вежа-сыгнатура над сяродкрыжжам, расшыфроўваючы кананічныя дачыненьні паміж асобамі Сьвятых апосталаў — Пятра і Паўла.

Гэтая нідзе дагэтуль ня бачаная будыніна і сёньня мае дагледжаны выгляд. Тое, што не ўдалося зрабіць палякам або расейцам, зрабіў беларускі дойлід. Гэта не этнаграфічная, а найноўшая нацыянальная архітэктура: чыстае дрэва і чысты бэтон.

Адсутнасьць дэкору і чужародных матэрыялаў стварылі нязвыклае, арганічнае адчуваньне зьнітаванасьці будынка з натуральным атачэньнем. Прасторныя шатры на пекных тонкіх калёнах, моцна вынесеныя за сьцены, утваралі своеасаблівыя клуатры, адкрытыя ў прастору. Мысьленьне катэгорыямі арганічнае архітэктуры было для Вітана-Дубейкаўскага вынікам эвалюцыі ўсяго дойлідзтва і ён вельмі дакладна гэта адчуў. Дойлідзтва і прырода мусяць сплятацца ў суцэльны гуманістычны асяродак. Ці ня першым сьведчаньнем беларускай экалягічнай думкі гучаць ягоныя словы: «... лес страшэнна эксплёатуецца і вывозіцца ў нашы гарады і за граніцу — лесу ўсё малей і ён ужо не спраўляецца з патрэбамі чалавецтва расьці...» На жаль і гэтая думка выбітнага дойліда і патрыёта патанула ў каламуці XX стагодзьдзя.

Дубейкаўскі двума крокамі вывеў беларускую архітэктуру ў будучыню, паставіў яе ў эўрапейскі кантэкст. Найноўшыя тэхналёгіі й рупнасьць пра нацыянальную адметнасьць — гэткі шлях быў нашай альтэрнатываю. Завод жалезабэтонных вырабаў у Смаленску — першы крок беларускае архітэктуры ў XX стагодзьдзе. Касьцёл Пятра і Паўла ў Дрысьвятах — першы крок архітэктуры ў Беларушчыне. І пакуль апошні...

Сяргей Харэўскі

У папярэдніх нумарах прадстаўленыя творы:

1. Фэрдынанд Рушчыц. Зямля
2. Мсьціслаў Дабужынскі. Віцебск, лесьвіца
3. Марк Шагал. Прамэнад
4. Ільля Рэпін. Беларус
5. Марк Антокальскі. Помнік Кацярыне
6. Вітальд Бялыніцкі-Біруля. Блакітная капліца
7. Хаім Суцін. Паж
8. Казімер Малевіч. Чорны квадрат
9. Язэп Драздовіч. Пагоня Ярылы
10. Валянцін Волкаў. Менск, 2 ліпеня 1943 году
11. Манумэнт Перамогі
12. Помнік Леніну ў Менску
13. Пётра Сергіевіч. Шляхам жыцьця
14. Аляксей Глебаў. Францішак Скарына
15. Міхал Філіповіч. Бітва на Нямізе

"Наша Ніва"
незалежная газэта
НАША НІВА
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
рэдактар ... Сяргей Дубавец
выдавец ... Рэдакцыя газэты "Наша Ніва"
заснавальнік ... Павал Жук
адказны сакратар ... Алег Дэярновіч
мастацкі рэдактар ... Сяргей Харэўскі
аддзел інфармацыі ... Андрэй Лапцёнак, Віктар Корзун
дызайн і вёрстка ... Лявон Раманчык
набор ... Аляксандра Макавік
стыль і карэктура ... Паўлюк Канавальчык
пры ўдзеле ... Сяргея Шупы

АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ
220123 Менск, а/с 71
Тэл./факс 213-43-52
E-mail: edit@niva.minsk.by
http://rampage.ml.org/users/~nasa_niva

Наклад 2650. 8 палос фармат А2 нумар падпісаны ў друк 23:37, 28/12/1997. Друкарня выдавецтва "Беларускі Дом друку". Менск, праспэкт Францішка Скарыны, 79. Замова № 7623. Кошт свабодны.

Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4-га ліпеня 1996 г., выдадзенае Дзяржаўным камітэтам друку Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, пр. газэты "Известия", д. 8, кв. 173.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12